беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 35 (73)
2 сьнежня
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

ТЭЛЕПРАГРАМА

Глядзіце, хто прыйшоў!



Час дысыдэнтаў

На мінулым тыдні пад Варшавай праходзіла канфэрэнцыя былых дысыдэнтаў з усіх краінаў посткамуністычнай Эўропы.

Былыя дысыдэнты ўспаміналі свае колішнія акцыі, а таксама турмы і лягеры, бо мала хто зь іх не **«сядзеў». Спасярод прадстаўнікоў Польшчы, Расеі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Чэхіі, Вугоршчыны, Румыніі, Баўгарыі,** бадай, толькі беларускія «дысыдэнты» не пачуваліся тут «былымі».

Імя дыктатара Лукашэнкі гучала ў кожным выступленьні як пагроза новае эўрапейскае бяды, новых рэпрэсіяў супраць правоў чалавека. Як ня дзіўна, але менавіта да беларускае дэлегацыі найбольш пасавала назва сустрэчы — «Час дысыдэнтаў», бо ўсе астатнія сёньня хутчэй вэтэраны барацьбы за правы чалавека.

Пра міжнародную сустрэчу «Час дысыдэнтаў» чытайце на старонцы 3.
На тую ж тэму — артыкул Ігара Кузьняцова «З гісторыі савецкага дысыдэнту» — на старонцы 13.

Акцыя

«Аддайце нашы галасы!»

7 сьнежня на Плошчы Незалежнасьці а 12 гадзіне адбудзецца мітынг з удзелам дэпутатаў. Гэтае мерапрыемства будзе прысьвечанае абмеркаваньню правядзеньня і вынікаў рэфэрэндуму, які прайшоў 24 лістапада. Арганізатары спадзяюцца на ўдзел усіх, каму неабыякавы лёс краіны.

Пошта

«Веру і спадзяюся...»

«Генэральнаму пракурору Рэспублікі Беларусі

Лічу сваім грамадзянскім абавязкам падаць свой голас у абарону паэта Славаміра Адамовіча. Трымаць за кратамі чалавека толькі за тое, што яму Бог даў талент — дзікунства...

... Веру і спадзяюся, што Вы зробіце патрэбныя захады і паэт Славамір Адамовіч неадкладна будзе выпушчаны на свабоду...

Судзілоўская Л.І., Гомель».

«... Зьвяртаецца да Вас маці трох непаўналетніх дзяцей. У маім сэрцы пасяліўся даўгавечны жах за зямлю, дзе растуць мае дзеці... Старэйшы сын мой таксама спрабуе пісаць вершы, апавяданьні, вядзе дзёньнік... За гэта ж ужо 9 месяцаў за кратамі ўтрымліваецца паэт Славамір Адамовіч...

Ці вядома пану Пракурору такое паняцьце як Бог?...

Ганна Сьцепулёнак, Койданава».

Гэта толькі некалькі радкоў, выпадкова ўзятых зь лістоў, якія прыходзяць сёньня ў рэдакцыю з розных кутоў **Беларусі і зьвернутыя да Генэральнага Пракурора В.Капітана.**

Тымчасам пасьля першага паседжаньня Віцебскі суд прыняў да ўвагі просьбу адваката С.Адамовіча сп. Паганяйлы і адтэрмінаваў слуханьні да 16 снежня. За гэты час мы можам зрабіць яшчэ шмат.

С.Х.



Пэрфоманс

Сьмерць піянэра

Артур Клінаў, аўтар добра вядомага твору «За чаем», які летась быў выпушчаны адмысловай віншавальнай паштоўкай пад Новы Год, парадаваў менскую публіку чарговай «Сьмерцю піянэра». Гэтай выставе ў галерэі «6-я лінія» папярэднічаў пэрфоманс «Збор сродкаў на карысьць беларускіх палітычных зьняволеных», прэм'еру якога **мастак паказваў з 25 жніўня ў Пецярбурзе на Фэстывалі экспазыцыйнага мастацтва. У Менску** падчас апошніх маніфэстацыяў акцыя Клінава атрымала шырокае прызнаньне публікі: купляючы адну цукерку, людзі ахвяравалі грошы ў фонд палітвязьняў. Гэтак было сабрана паўтара мільёна **рублёў, якія Клінаў перадаў «Бумбам-літу»** для Славаміра Адамовіча. У Расеі такога посьпеху не было... Як кажуць: на аматара.

Пра апошнюю выставу Клінава чытайце на стар. 16.



На здымку: Пэрфоманс Артура Клінава ў Пецярбурзе. Верасень, 1996 г.

Пошта

Зьдзек над храмам

19 кастрычніка ў мястэчку Заслаўе часткова зьнішчаны агнём помнік XVI ст. — будынак Заслаўскага Рэфармацкага Збору (сёньня яго займае Расейская Праваслаўная царква). Цалкам выгарэла вежа і прыгожы дах з чырвонай дахоўкі.

Друк стракацеў паведамленьнямі пра пажар, прычынай якога стаўся падпал, учынены нейкай сэктай «сатаністаў». Аднак пры ўсіх містыфікацыях гэтай гісторыі, факты кажуць пра іншае.

Працяг на старонцы 16.

Міжнародны камэнтар

Гітлер ня прыйдзе

Ні легітымізаваных масавых забойстваў, ні перасьледу меншасьцяў, ні ўзаконенага цкаваньня за палітычныя погляды ў першыя гады кіраваньня фашыстаў у Італіі не было. Захавалася фармальная дэмакратыя, фармальная свабода слова. Вялася шалёная атака на сыстэму шматпартыйнай дэмакратыі, у якой сапраўды было шмат хібаў. Рэжым разграміў прафсаюзы.

Мусаліні вылучаўся сваім талентам прамоўцы, уменьнем рызыкаваць, рашучасьцю ў прыняцьці рашэньняў, добрым веданьнем народнай псыхалёгіі. Ён набыў сапраўды ўсенародную папулярнасьць: малады, незвычайны, сучасны, энэргічны. Мусаліні шмат езьдзіў па краіне, выступаў на мітынгах, удзельнічаў у спартовых парадах, мяшаўся ў кожную драбніцу і разгарнуў беспрэцэдэнтную на той час сыстэму прапаганды праз самы папулярны ў тую эпоху сродак камунікацыі — кіно.

Пара Мусаліні найлепш адлюстраваная ў фільмах Фэліні: цяпер тыя гады ўспрымаюцца хутчэй як камічныя, чым трагічныя, хоць ужо тады крывава душыліся выступленьні рабочых, некаторыя дзеячы апазыцыі зазналі вязьніцаў і выгнаньня, а афіцыйная агітацыя грунтавалася на ўзбуджэньні нянавісьці да замежных і ўнутраных ворагаў. Роднасьць сёньняшняга беларускага і тагачаснага італьянскага рэжымаў — і ў экзатычнасьці лёзунгаў і эксцэнтрычнасьці манераў лідараў.

Працяг на старонцы 4.

У краіне ідзе дождж...



Менск заўжды быў маім горадам. Тут было не заўсёды прыемна, але заўжды ўтульна. Але часы зьмяняюцца. Пасьля 24 лістапада Менск для мяне згубіў утульнасьць. Адчуваньне такое, быццам ноччу соўгаесься па пачакальні чужога вакзалу. Холад, бруд, вільгаць, прамоклыя ногі і няма дзе прытуліцца.

24 лістапада перагарнулася старонка беларускай гісторыі. Старонка, на якой так ці інакш, але прысутнічала законнасьць. Сёньня, разам з парлямэнтам 13 скліканьня, яна сышла ў нябыт.

На гэтай старонцы былі свае героі і антыгероі, і амаль біблейскія матывы: казань, барацьба, спакуса, здрада, пакаяньне (запозьненае). 68 парлямэнтараў-спартанцаў, што не адклікалі свае подпісы за імпічмэнт, — загінулі, але не здаліся, баронячы законнасьць у краіне.

Што да наступнай старонкі нашай гісторыі, то краіна пачынае яе ў стане ніжэй ватэрлініі законнасьці, і народ мусіць заплаціць за гэта па ўласных рахунках. Краіны Эўропы абвясьцілі прыём палітычных уцекачоў зь Беларусі. У Польшчы з гэтага скарысталіся ўжо дзевяць чалавек...

Ці магло стацца інакш? Напэўна, магло, але што цяпер пра гэта разважаць. Лукашэнка перамог, сытуацыя праясьнілася, пазбавіўшы некаторых суб'ектаў нашае палітыкі пэўных ілюзіяў.

«Дзядзька Шарэцкі, мы з табой», — пісалі студэнты на транспарантах. Але ці трэба былі дзядзьку Шарэцкаму гэтыя студэнты? «Калі нам цяжка, то да каго нам зьвяртацца? Вядома, да сваіх братоў», — прамаўляў дзядзька Шарэцкі, пазіраючы на сваіх расейскіх братоў Строева і Селязьнёва. Але ці трэба быў ён і ўся яго барацьба за законнасьць расейскім братам? Яны вырашалі тут СВАЕ праблемы і вырашылі іх, забраўшы ракеты і пакінуўшы кіраваць Лукашэнку.

Той стан, у якім апынулася апазыцыя, можна параўнаць зь цяжкім накдаўнам, калі не з накаўтам. Ці падымецца? Міжволі праводзіш гістарычныя паралелі. Ня выйшаўшы на абарону законнага парлямэнту, не падтрымаўшы яго, народ фактычна даў дабро на ўсе парушэньні пад час рэфэрэндуму і ўрэшце на яго фальсыфікацыю, пра што крычма крычаў парлямэнт і паведамлялі нешматлікія назіральнікі. Насельніцтва здало парлямэнт, як некалі сяляне здавалі касінераў Каліноўскага. Спадзевы апазыцыі — лібэралаў, эс-дэкаў і, нават камуністаў, — на Расею расталі як дым.

Што да рэжыму, то ён упіваецца перамогай. Лукашэнка выдатна пачаў сваю рэклямную кампанію «дранг нах остэн». Верагодна, вясною Беларусь чакае чарговы рэфэрэндум аб канфэдэрацыі з Расеяй. Сустрэчны рэфэрэндум арганізуюць расейскія таварышы з дзярждумы, і тут у Лукашэнкі настае сапраўды зорны час. Ёсьць, вядома, і небясьпека — у Расеі з супернікамі не цырымоняцца, бо там улада — надта вялікія грошы, але зь іншага боку, калі працэс пойдзе, то там будзе каму забясьпечыць і прыстойную ахову, аналітыку, грошы. А рэклямная кампанія ўжо пачалася.

Новая старонка расейскай гісторыі — калі яна будзе такой —матэрыялізавалася пакуль толькі ў Беларусі. Старонка, якая нагадвае чорны квадрат Малевіча.

24 лістапада, у дзень рэфэрэндуму, на нашу краіну абрынулася мярзотнае надвор'е — холад, дождж, сьлякота. Прыгадаўся Маркес, «Сто гадоў самоты»:

-... У Маконда ішоў дождж. Ён ішоў чатыры гады, адзінаццаць месяцаў і два дні...

Колькі ён будзе ісьці ў Беларусі?..

Алег Дашкевіч

Што для Расеі Беларусь?



Сёньня, калі ў беларускай палітыцы проста і ўскосна дамінуюць расейскія дзяржаўныя інтарэсы, зьмест гэтых інтарэсаў па-ранейшаму губляецца ў запавесе інтэграцыйнага туману. Што ж прываблівае Расею да яднаньня зь Беларусяй?

Першае, што прыходзіць у галаву, — гэта нібыта пэрспэктыўныя звышпрыбыткі расейскіх манаполіяў. Але скуль тым прыбыткам узяцца?

Усё, што мела нейкую цікавасьць, — ужо даўно ў руках расейскіх кампаніяў. Тое, што засталося, — безьліч нерэнтабэльных заводаў і фабрыкаў зь іх неканкурэнтаздольнай прадукцыяй. Расеі гэта і дарма ня трэба. Са сваімі ня ведаюць што рабіць.

А.Лукашэнка хваліўся, што ўдзельная вага тавараздвароту Беларусі з краінамі Захаду вырасла ў 1996 годзе ў параўнаньні з 1995-м прыкладна на 10 працэнтных пунктаў. Калі ж узяць абсалютныя лічбы, гэты «эканамічны цуд» тлумачыцца так: скараціўся тавараз варот з «галоўным эканамічным партнэрам» —Расеяй, у той час як тавараз варот зь іншымі краінамі значна не расьце. Прычына? Нашто Расеі беларускія трактары, грузавікі, тэлевізары і іншая прадукцыя, якой так хваліцца прэзыдэнт, калі яна выпускае аналягічную, часам больш якасную і танную? Атрымліваецца — няма чым плаціць за расейскія энэргарэсурсы: тавары Расеі не патрэбныя, а грошай у нас няма... Гэтак расьце наша запазычанасьць Расеі ў геамэтрычнай прагрэсіі. А расейскі бок ня ў стане кожны раз «прайграваць у тэніс» шматмільярдныя пазыкі.

Губэрнатар Ніжагародзкай вобласьці Барыс Нямцоў у сваім інтэрвію газэце «Известия» (29.11.96) сказаў: «... Дружба з Лукашэнкам Расеі абыходзіцца вельмі дорага. Спытайце ў начальніка нашай мытнай службы Круглова, у колькі нам абыходзіцца праца беларускіх мытнікаў? Як яны захоўваюць і абараняюць расейскія межы ад кантрабанды? Ціха задайце яму пытаньне пра тое, колькі губляюць расейскі бюджэт і расейскія прадпрыемствы ад кантрабанднага ўвозу тавараў, пачынаючы з гарэлкі і цыгарэтаў і сканчаючы аўтамабілямі? Спытайце ў «Газпраму», колькі Беларусь вінная яму мільёнаў даляраў? Пацікаўцеся зьнешнегандлёвым балянсам Расеі і Беларусі і ўбачыце, што нам Беларусь абыходзіцца ў гіганцкія грошы...» А калі «малодшы брат» канчаткова сядзе «старэйшаму» на галаву (заінтэгруецца ў канец)?.. Гэта пагражае апошняму сур'ёзнымі эканамічнымі праблемамі, асабліва ў сфэры фінансавай палітыкі. Прыйдзецца забыцца пра ўжо блізкую было стабілізацыю крэдытна-грашовай сыстэмы. Значыць, зусім ня звышпрыбыткі вабяць расейскіх «інтэгратараў».

З гледзішча палітычнага, Расея таксама наўрад ці атрымае карысьць. Міла-відная маска «дэмакратычнага» Крамля не пасуе да Лукашэнкавага «бачаньня прэзыдэнцкай рэспублікі і ролі ў ёй прэзыдэнта». Ды й як жа далей заляцацца да міжнароднай грамадзкасьці, маючы такога непрадказальнага сябра. Таму Крэмаль сьпяшаецца сказаць сваё «фі» на чарговы вычвар Галоўнага Інтэгратара і... інтэгруецца далей.

Беларусь сапраўды зьяўляецца каштоўным лапікам зямлі для расейскіх дзядзек зь лямпасамі. Сам таварышч прэзыдэнт паабяцаў, што верне расейскія ядзерныя ракеты ў Беларусь, калі «ў гэтым узьнікне патрэба». Сапраўды, глянуўшы на мапу, можна давесьці стратэгічную вартасьць Беларусі: адсюль і Прыбалтыку папужаць зручна, і Ўкраіне кулаком памахаць блізка (і тая, і другая аказваюцца амаль у аблозе). Лепшай заслоны ад NATO не прыдумаеш. Але стратэгічныя інтарэсы — не прычына, а сьледзтва нейкай іншай прычыны, што вымушае расейцаў выкідаць на вецер велізарныя грошы.

Гэтая першапрычына — настрой сярэднестатыстычнага расейца, які прызвычаіўся жыць у вялікай краіне, славутае «за дзяржаву крыўдна». Страшна яшчэ і тое, што ён прызвычаены жыць дрэнна. Кожны «просты» расеец заўсёды паскардзіцца і на рост цэнаў на прадукты, і на кватэру, у якой цячэ дах, і на маленькую зарплату. Калі ж спытаць, што ён выбірае: дабрабыт ці аднаўленьне саюзу (ці імпэрыі, як каму), ён абярэ апошняе.

Менавіта гэтае, збольшага ірацыянальнае жаданьне вызначае расейскую палітыку ў блізкім замежжы. Менавіта на гэтае жаданьне арыентуюцца амаль усе расейскія палітыкі, каб мець большую папулярнасьць сярод «народу». І на менавіта гэтае жаданьне большасьці простых расейцаў разьлічвае Лукашэнка, рыхтуючы свой «паход на Рым».

Гэтая рыса «шырокай расейскай душы» выяўляецца адвеку. Шчыра кажучы, і ў часы Імпэрыі, і пры Савецкім Саюзе Расея нашмат больш аддавала (у сэнсе матэрыяльным), чым забірала. Таму і была заўсёды лапатнай. Ёй бы радавацца цяпер, што дармаедаў паменшала... Шкада, што расейцы ня хочуць жыць прыгожа. Яны б ніколі ня думалі пра саюзы, імпэрыі, ці інтэграцыі.

Паўлюк Канавальчык

Канец сэзону пераваротаў?



Апошні рабочы тыдзень лістапада прывёў да свайго больш-менш лягічнага канца ланцуг падзеяў, дзякуючы якім Беларусь апынулася пад пільнаю ўвагай сусьветнай грамадзкасьці. Пад час дождыку ў чацьвер, калі горад жыў у вонкава звычайным рытме, адбыўся ўрэшце разгон парлямэнту. Насуперак чаканьням, што вынікалі для многіх назіральнікаў з гістарычных аналёгіяў, не было ні стрэлаў, ні ахвяраў, ні танкаў, ні нават мітынгаў альбо кардонаў са шчытамі. Перад ленінскай постацьцю пад даждждом моклі двое міліцыянтаў, яшчэ трое іхных калегаў вышэйшага рангу без тлумачэньняў не пускалі нікога ў будынак.

Дзесь паўсотні апальных цяпер парлямэнтароў былі прапушчаныя ў будынак выключна для атрыманьня разьліку з працоўнага месца і ачышчэньня памяшканьняў ад сваіх асабістых рэчаў. Каторага разу ўжо за апошнія два тыдні чуліся словы пра дзяржаўны пераварот...

Работнікі аховы будынку парлямэнту паведамілі пазьней, што ў беларускім «Белым доме» будзе праведзены рамонт, для якога даўно закупленыя матэрыялы і новае абсталяваньне. Дарэчы, перш як прыняць у сераду закон аб прыпыненьні дзейнасьці «апазыцыйнай часткі» ВС, перабежчыкі да прэзыдэнта на сваім чарговым паседжаньні на Карла Маркса якраз узьнімалі пытаньне тэрміновага рамонту.

Калі перад 24-м колькасьць па-прэзыдэнцку настроеных дэпутатаў была вядомая дакладна, то пасьля трыюмфальнага шэсьця «пераможцаў» вакол памянёнай колькасьці пачаліся гульні «ўгадай лічбу». Паводле ацэнак з розных крыніцаў, перабежчыкаў «ад Незалежнасьці да Маркса» было ад 80-90 да 116-120 чалавек. Аляксандар Лукашэнка, які ажно двойчы наведваўся ў пазамінулую пятніцу ў Авальную залю, мінулага аўторка прысутнічаў на паседжаньнях і ў будынку былога ЦК камсамолу. Пакуль у Канстытуцыйным Судзе ледзь не ва ўмовах падпольля ішла закрытая нарада на тэму «Быць ці ня быць разгляду справы пра імпічмэнт?», пераможцы хуценька прынялі на гэты выпадак цэлы закон. Праз гадзіну-другую першы акт новай заканатворчасьці спрычыніўся да таго, што й прадказваў упэўнена ў панядзелак «празарлівец» А.Лукашэнка. Справа пра імпічмэнт загінула. Сьпіс подпісаў за яе разгляд схуднеў, і суд прадставіў фармулёўку пра адсутнасьць падставаў для працэсу.

Цягам двух дзён перад «аксамітным разгонам» ВС з абодвух бакоў расколатага на дзьве часткі парлямэнту былі дзьве спробы ўзьяднаньня. Аўторкавым ранкам з прапановай далучыцца да прыхільнікаў новай Канстытуцыі Авальную залю наведаў Іван Пашкевіч, ультыматыўны тон якога змусіў віцэ-сьпікера Генадзя Карпенку акуратна зьняць былога калегу з трыбуны і выправіць у дарогу. У другой палове дня ў сераду пасьля закрытай нарады Прэзыдыюму з ініцыятывай абмеркаваньня сытуацыі поўным складам дэпутацкага корпусу ў будынку Вярхоўнага Савету выступіў Сямён Домаш. Але «перабежчыкі» не схацелі яго слухаць і паднялі на сьмех. Закон пра спыненьне дзейнасьці «старога добрага ВС» быў ужо ў стадыі абмеркаваньня...

Усе тыя, хто не прыняў умоваў новага жыцьця ў імя захаваньня крэсла, стварылі разам з прадстаўнікамі непарлямэнцкіх партыяў і грамадзкіх рухаў Кангрэс у абарону дэмакратыі і зрабілі спробу акрэсьліць плян далейшых супольных дзеяньняў. Аднак узьніклае на самым пачатку ўстаноўчага паседжаньня пачуцьцё нетрываласьці згуртаваньня толькі памацнілася ў наступныя гадзіны і дні. Адным, бачыце, недаспадобы нацыянальны сьцяг, другія празьмерна асьцерагаюцца таго, што палітыка з кабінэтаў страчанай улады можа перакінуцца на вуліцы нашых гарадоў. Здаецца, усё ж да паасобных агульных пунктаў гледжаньня ўдзельнікі Кангрэсу прыйшлі, ня здолеўшы, праўда, прыняць канкрэтнага пляну неадкладных дзеяньняў. Старшынём быў абраны Сямён Шарэцкі, пасьлядоўны барацьбіт з фашызмам і прыхільнік «інтэграцыі» з Расеяй.

Але сытуацыя ў Расеі і Беларусі, калі адна ператвараецца ў монстра, гатовага праглынуць другую, што сядзіць у яе на шыі, сьведчыць: «разам шукаць к шчасьцю дарог» будзе немагчыма. Хіба толькі для прэзыдэнта, які напачатку вясны ўжо абяцае новы рэфэрэндум...

Два першыя рэфэрэндумы прайшлі паводле сюжэту «ўсё ў імя чалавека, і мы ведаем гэтага чалавека». Пры трэцім беларускія інтарэсы будуць забытыя ўвогуле. Інтарэсы ж Расеі могуць прадыктаваць патрэбу зьняць Лукашэнку гэтак жа ціха, як той «зьняў» парлямэнт. І паставіць на ягонае месца іншую пешку прасавецкіх альбо праімпэрскіх маскоўскіх колаў. Толькі разумнейшую і без дыктатарскіх замашак.

Тацяна Сьнітко

Супрацьстаяньне



Добра стаяць на плошчы летам, напрыклад, у жніўні. Іначай адчуваеш сябе на плошчы ў лістападзе, пад нуднай імжою: табе кепска, бо халодна. На небе ў такое надвор'е не відаць аніводнае зоркі.

Цяпер, калі мы ведаем, чым усё скончылася, можна ўспомніць, з чаго «ўсё» гэта пачыналася. Невялічкі мітынг перад Цэнтарвыбаркамам пераросу акцыю пратэсту непарлямэнцкай, вулічнай апазыцыі — людзей, якія ўсё ж такі наплявалі на нейкі выдуманы ўладай «асобы статус» плошчы Незалежнасьці. Бо ў іх — свая незалежнасьць, са сваім «асобым статусам» у кожнага. Тым, хто стаяў на плошчы круглыя суткі, страчваць ужо не было чаго. Няма чаго траціць, апрача жыцьця, якое нельга назваць жыцьцём і якое ў гэтай краіне каштуе занадта танна. А ім рупіла атрымаць, апрача жыцьця, яшчэ й свабоду.

Уначы на Незалежнасьці, стоячы пад Вярхоўным Саветам, мы марылі, што спынім дыктатуру. Думалі, якімі спосабамі гэта можна зьдзейсьніць, і шчыра сьмяяліся, калі нехта прапаноўваў прыйсьці праз паўгода зь мітынгам да Валадаркі і скандаваць: «Свабоду палітвязьню Лукашэнку!» У тыя ночы гэта здавалася больш чым праўдападобным.

Вядома, усіх «начных пікетоўцаў» з плошчы маглі ціха скруціць у адзін «варанок» і вывезьці ў Курапаты. Мала хто не разумеў гэтага. Разумелі, але стаялі. Мы з удзячнасьцю ўспрымалі гарачую гарбату, якую падносілі нам у тэрмасах, воплескамі сустракалі кожны новы сьцяг. Гучэлі песьні, і рваліся струны на чыёйсьці гітары, калі мы ўсе разам сьпявалі «Радзіму» «ДДТ». У той час мы былі адзін аднаму як браты. Можа, менавіта таму з плошчы нікога не забралі.

Мы зрабілі для «народных абраньнікаў» усё, што маглі. Мы далі ім магчымасьць спакойна працаваць. У іх была ўпэўненасьць у тым, што іх ня «вынесуць» з Авальнай залі, як некалі апазыцыю БНФ. Начная плошча мела свае вочы, вушы й голас, каб у выпадку «вынасу» ўбачыць і паклікаць на дапамогу. Бо нават з прапановаю Лявона Баршчэўскага сысьці з плошчы да раніцы людзі не пагадзіліся. Ніхто не разыходзіўся.

Бліжэй да раніцы падыходзіць «новая зьмена», і можна сысьці ў рэдакцыю, якая ў гэтай сытуацыі працуе круглыя суткі. Там кожную гадзіну тэлефануюць у ВС і БНФ, каб трымаць навіны пад кантролем. Там, у рэдакцыі, ёсьць кава і цыгарэты, там зь 5-ай гадзіны раніцы будзе працаваць НТВ, і ты зь сябрамі зноўку даведаесься, што ноч мінулася спакойна. І можна паўяўляць —які транс ахапіў Лукашэнку, калі ён даведаўся пра адстаўку Чыгіра.

Мы далі дэпутатам карт-блянш. Ня наша віна ў тым, што дэпутаты яго ня выкарысталі. Мы сьвядома ішлі на амон 17-га, мы сьвядома стаялі на плошчы ўсе суткі. Мы мелі мужнасьць рабіць тое, што маглі і прагнулі рабіць. Дэпутаты ня выкарысталі той стопрацэнтова выйгрышнай сытуацыі, якую зрабілі ім мы.

Рэвалюцыі заўсёды зьдзяйсьняюцца меншыняй. Астатняя шэрая маса падтрымлівае пераможцу. Але «слугі народу» не пажадалі абараніць сябе і сваю свабоду. І тут мы зрабіць нічога ня можам. Нікога нельга вызваліць насуперак яго волі. Слуга ў душы заўсёды застаецца слугой ва ўчынках, нават калі гэта «слуга народу». Цёплае месца ў ВС заўсёды даражэйшае камусьці за ягоную (а тым больш чужую) свабоду.

Таму гэта ня наша параза. Гэта іхняе фіяска. Прайгралі тыя, што здалі наш выйгрыш. Мы будзем далей чыніць тое, што чынілі, толькі ў крыху іншых умовах. Вядома, умовы будуць цяжэйшымі. Але нават калі разгоняць усе прафсаюзы, мы будзем зьбірацца на кухнях. Нават калі зачыняць усе газэты, мы будзем публікавацца самвыдатам. Досьвед у нас ёсьць.

Але што ж будуць рабіць там, «на другім беразе»?

Сяргей Пульша

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Тацяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.


Незавершанасьць гісторыі

Пад Варшаваю адбылася канфэрэнцыя па гісторыі апазыцыі ў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропе

Увесь мінулы тыдзень у ідылічным мястэчку Падкове Лесьнэй пад Варшаваю адбывалася канфэрэнцыя «ЧАС ДЫСЫДЭНТАЎ — спатканьне ўдзельнікаў і дасьледчыкаў апазыцыйных рухаў савецкага блёку ў Эўропе». Ролю арганізатараў спатканьня ўзялі на сябе ўжо вядомы нашым чытачам Цэнтар KARTA і Kolo Podkowy — Цэнтар культуры ў самой Падкове. Зь беларускага боку ўдзел у сустрэчы бралі Сяргей Дубавец (ад «Нашай Нівы») і Алег Дзярновіч (ад Архіву Найноўшае Гісторыі).

Беларускі кантэкст

Апошнія тыдні Польшча жыве ў атмасфэры насычанасьці інфармацыяй і хваляваньнямі з нагоды беларускіх падзеяў. Рэпартажы зь Менску зьяўляюцца на першых палосах найбуйнейшых газэтаў, паведамленьні зь Беларусі - абавязковыя ў тэле- і радыёнавінах. Каля беларускага пасольства рэгулярна адбываюцца пікеты пратэсту супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. Заўважаная новая тэндэнцыя – палітычныя партыі Польшчы, усьведамляючы важнасьць беларускай праблематыкі, імкнуцца самастойна зазначыць сваю пазыцыю адносна гэтай тэмы, праводзяць кожная свае акцыі, часам не запрашаючы на тыя ж пікеты іншыя партыі.



«Кола Падковы» – асяродак, дзе адбывалася канфэрэнцыя. Уся Падкова Лесьна нагадвае парк.



Пра Беларусь гаворыць Аляксандар Гінзбург

Сёньня ў Польшчы пачалі зьяўляцца ня толькі навіны зь Беларусі, але й спробы аналітыкі. Самы сьвежы прыклад – эсэ прафэсара Ягелонскага ўнівэрсытэту Ўладзімера Паўлючыка «Рускія шляхі» ў апошняй «Polityсу». Менавіта рускія, бо гутарка ідзе пра параўнаньне ўкраінскага ды беларускага нацыянальнага этасу. Лёзунг артыкула – Беларусь ня мае традыцыяў і герояў, якіх Украіна мае празьмерна. Паводле думкі аўтара, ідэя ўкраінскай нацыі нарадзілася ў XIX ст. з духовасьці й гістарычнага досьведу ўкраінскага праваслаўнага сялянства й казацтва. Ідэя ж беларускай нацыі нарадзілася тым самым часам з духовага й гістарычнага досьведу «польска-беларускай крэсовай шляхты й зьяўляецца ў дачыненьні да народа зьнешнім фэнамэнам».



Выступае Пятрушка Шуштрава – намесьнік міністра унутраных справаў у першым дэмакратычным урадзе Чэхіі, адзін з аўтараў чэскага закона аб люстрацыі.

Гэта цікавыя тэзысы для пачатку дыскусіі. Між тым, варта заўважыць, што гэтая новая польская інтэлектуальная традыцыя зусім ня ўлічвае сёньняшнія рэаліі урбаністычнае Беларусі й існаваньне ўжо ўласна беларускай нацыянальнай традыцыі.

А тым часам усё больш і больш беларусаў просяць палітычнага прытулку ў Польшчы. На мінулым тыдні такіх стала ўжо дзевяць чалавек. Папрасілі прытулку, у тым ліку, Андрэй Рамашэўскі, які падпаў пад рэпрэсіі за ўдзел у Менскай вясьне, і студэнт зь Берасьця Ян Чурыловіч, які вучыцца ў Варшаве. Ян Чурыловіч разам з намежным назіральнікам з Украіны 24 лістапада наведвалі выбарчыя ўчасткі ў Берасьці, склаўшы каля 30 пратаколаў пра парушэньні працэдуры галасаваньня. На адным з участкаў назіральнікі былі схопленыя і зьбітыя міліцыяй, супраць іх узбудзілі судовую справу.

«Наш маральны абавязак – даць прытулак уцекачам зь Беларусі», – заявіў прэзыдэнт А.Квасьнеўскі. Бюро справаў міграцыі і ўчекачоў польскага МЗС паведаміла, што будзе ўважліва разглядаць заявы беларусаў і патрабаваць ад заяўлянтаў доказаў праўдзівасьці падставаў для статуса ўцекача.

Рэзалюцыя

Беларускай тэматыкай быў цалкам прасякнуты першы дзень канфэрэнцыі – кожны выступоўца так ці інакш зьвяртаўся да беларускіх праблемаў. Аляксандар Гінзбург, які ў 1961 годзе заснаваў часопіс «Синтаксис», з 1967-га зь перапынкамі знаходзіўся ў лягерах, а ў 1979 г. быў абменены на савецкіх шпіёнаў і з 1979 году жыве ў Парыжы ды працуе ў газэце «Русская мысль», у сваім выступу шмат увагі надаў беларускай сытуацыі. Слынны расейскі дысыдэнт гаварыў пра дэмакратыю як пра сыстэму раўнавагаў у грамадзтве, а зусім не пра ўладу большасьці, пра тое, што А.Лукашэнка фармальна зьяўляецца дэмакратычна абраным лідарам, але ён ня мае нават элемэнтарных уяўленьняў пра такі панятак як правы чалавека.

Вельмі актыўнымі ў дыскусіях пра Беларусь былі лідары «Салідарнасьці» 80-х гадоў. А калі дэпутат польскага Сэйму Багдан Барусэвіч заявіў, што ўдзельнікі ня змогуць разьехацца, не прыняўшы рэзалюцыю ў абарону дэмакратыі ў Беларусі, заля проста выбухнула аплядысмэнтамі – гэта быў адзіны выпадак на працягу працы чатырох дзён эмацыйна досыць стрыманай канфэрэнцыі. Дыскусіі па рэзалюцыі працягваліся і на наступны дзень. Беларуская дэлегацыя прапанавала крыху адысьці ад агульнапалітычнага гучаньня дакумэнта й сканцэнтраваць увагу на неабходнасьці абароны правоў чалавека й свабоды слова ў Беларусі. Яшчэ празь дзень дэкларацыя была цалкам апублікаваная ў самым масавым польскім пэрыёдыку – «Gazecie Wyborczej». Вось тэкст дэкларацыі:



Чарга да падпісаньня рэзалюцыі канфэрэнцыі ў справе Беларусі.

У АБАРОНУ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА
І ДЭМАКРАТЫІ Ў БЕЛАРУСІ

У Беларусі парушаюцца правы чалавека, свабода слова й сходаў. Ужо восем месяцаў у затачэньні знаходзіцца паэт і журналіст Славамір Адамовіч, арыштаваны за свае вершы. У затачэньні таксама знаходзяцца сем грамадзянаў Украіны, затрыманых у Менску пад час веснавых грамадзкіх акцыяў пратэсту супраць палітыкі прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі. Працягваюцца чарговыя судовыя працэсы супраць апазыцыянэраў. Ліквідаваныя ды ліквідуюцца незалежныя мэдыі: Радыё 101,2 FM, газэты «Выбар» і «Пагоня».

Вынікі рэфэрэндуму 24 лістапада, праведзенага з парушэньнем беларускага заканадаўства, ва ўмовах аднабаковага прэсынгу кантраляваных уладамі сродкаў масавае інфармацыі, мы прызнаем за фіктыўныя. Органы кантролю за працэдураю галасаваньня былі зьліквідаваныя. Пад час галасаваньня адбываліся парушэньні. Беларусі пагражае пераход ад стану абмежаваньня дэмакратыі да стану дыктатуры.

Удзельнікі канфэрэнцыі дысыдэнтаў, якая адбываецца 26-29 лістапада ў Падкове Лесьнэй пад Варшаваю, выказваюць сваю рашучую падтрымку прадстаўнікам беларускіх дэмакратычных арганізацыяў і грамадзкасьці, якія ня згодныя з усталяваньнем у краіне дыктатуры.

Мы зьвяртаемся да нашых урадаў і парлямэнтаў з просьбаю паўплываць на ўлады Беларусі й выказаць пратэст супраць зьнішчэньня асноваў дэмакратыі й парушэньня правоў чалавека ў гэтай краіне.

Удзельнікі канфэрэнцыі «Час дысыдэнтаў», Падкова Лесьна, 27 лістапада 1996 г.

Сярэдняя Эўропа ёсьць!

У гэтым пераконвае рэакцыя грамадзянаў нашага рэгіёну. Першым, хто адразу ж падыйшоў да нас і спытаў пра Беларусь і пра нашу газэту (ці не зачыненая яна?), быў славацкі эсэіст і выдавец Мілан Шымэчка. У верасьні ён прыяжджаў у Менск на канфэрэнцыю па Сярэдняй Эўропе і ўяўляе беларускія палітычныя рэаліі, ведае, што працягвае фармавацца незалежнае беларускае грамадзтва.

Здараліся і такія сюжэты, калі, напрыклад, на сьняданку да нашага століка падсаджваецца румынскі дысыдэнт Ромулюс Русан і пачынае ўсхвалявана распавядаць пра бачаную ім у тэлебачаньні цырымонію падпісаньня так званай Канстытуцыі 1996 г. Румынскага праваабаронцу абурыў цынізм уладаў.

Крыху нечаканай для беларуса можа стаць вялікая ўвага да беларускай сытуацыі ў вугорцаў. Гэтая ўвага нараджаецца з пачуцьця салідарнасьці. Вугорцы, якія перажылі 1956 год, асабліва чуйна рэагуюць на прагу іншых народаў да самавызначэньня. У Падкове Лесьнэй жыве былы пасол Вугоршчыны ў Польшчы й Беларусі Акаш Энгельмаер. Пасьля прыходу да



«Сейбіт і касец»
Да канфэрэнцыі было прымеркаванае адкрыцьце выставы апазыцыйнага мастацтва 80-х гадоў. Сёньня ў Польшчы ўжо так не малююць, гэта ўжо гісторыя мастацтва.

ўлады ў Вугоршчыне посткамуністаў ён быў звольнены з дыпляматычнай службы. Сёньня сп. Энгельмаер можа распавесьці шмат цікавага пра тое, як былі забляваныя ў Беларусі ягоныя шматлікія культурныя ініцыятывы, а таксама ня зьдзейсьніўся буйны трактарны кантракт.

Мне, як самаму маладому ўдзельніку канфэрэнцыі й не дысыдэнту, было крыху няёмка з-за такой вялікай увагі слынных дысыдэнтаў і прэсы да беларусаў і да нас асабіста.

Мы прыехалі ў Падкову Лесьну ня скардзіцца. Мы прыехалі, каб зазначыць існаваньне незалежнага беларускага грамадзтва, каб заявіць пра нашыя інтарэсы й прапановы, увайсьці ў супольныя праекты. Але адчуваньне салідарнасьці давала нам пачуцьцё разнастайнасьці жыцьця і ўсьведамленьне незавершанасьці гісторыі.

Алег Дзярновіч

(Заканчэньне будзе)



Каб зрабіць свой канцэрт, у Падкову з Прагі прыехаў Сяржук Сокалаў-Воюш. Тут ён быў ня толькі з гітарай, але і зь відэакамэрай.

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

Гітлер ня прыйдзе

Працяг са старонкі 1.

Тады таксама браліся за перапісваньне падручнікаў: папулісцка-аўтарытарны рэжым прагнуў новых інтэрпрэтацыяў гісторыі, глебы для сваёй будучай таталітарнай мэтамарфозы.

Пэўныя рысы ўласьцівыя ўсім рэжымам, што імкнуцца да таталітарнасьці: падтрыманьне культу сілы, надмерная ўвага спорту, прыхільнасьць да ўсенародных плебісцытаў як сродку нагнятаньня грамадзкага псыхозу.

Мусаліні быў таксама першым кіраўніком Італіі, які ўрэгуляваў дачыненьні з царквой. Дыктатары граюць на нібыта дзяржаўніцкіх пачуцьцях царкоўнікаў. У гэткія гады адбываецца росквіт царквы як інстытуту дзяржавы і яе заняпад як грамадзкага інстытуту і самакаштоўнай зьявы.

Савекая гістарыяграфія зблытала паняткі фашызму і нацызму ў імя даступных схемаў: «Ён быў за рускіх, а яна за фашыстаў». Італьянскі фашызм у першае дзесяцігодзьдзе свайго трыюмфу быў значна менш жорсткі, чым будучы гітлерызм. Мусаліні быў правобразам, прадвесьнікам Гітлера, прыкладам нямецкаму фюрэру, аднак беспартыйная італьянская дзяржава не спараджала гэткіх жахаў, якія спрычыніў Трэці Райх. На тое існавалі і важкія сацыяльныя прычыны, і рэч тут не ў самой ідэалёгіі фашызму і ня толькі ў нацыянальных якасьцях бонвіванаў-італьянцаў, якія ні разу за апошнія стагодзьдзі не дабіваліся ваенных перамог уласнымі сіламі (калі, вядома, не лічыць вайны з Альбаніяй).

Фашызм быў не такі жорсткі, але гістарычна і сацыяльна вельмі страшны і небясьпечны. Мусаліні даў прыклад, і зьявіліся Салазар у Партугаліі, генэрал Прыма-і-Рывэра ў Гішпаніі, адмірал Хорці ў Вугоршчыне, самакаранаваны кароль Зогу ў Альбаніі і іншыя рэжымы «навядзеньня парадку» і «прамой народнай дэмакратыі, адпаведнай нацыянальнаму характару».

Лукашэнка здаецца зусім лагодным дыктатарам, пакуль чакае зьяўленьня новага Гітлера. Але зьявіся гэты самы новы правадыр — а нарадзіцца ён можа перш за ўсё ў Расеі — і наш дробны каляніяльны аўтарытарызм пойдзе смутным шляхам, якім ішоў Мусаліні ажно да смутнага канца самога фюрэра. Пікантнасьць сытуацыі ў тым, што сам Лукашэнка ня траціць надзеі задаволіць патрэбу ў правадыры, калі яна раптам узьнікне ў суседнім народзе.

Менавіта і толькі прафашысцкія партыі — Славянскі сабор і лібэрал-дэмакраты — падтрымліваюць прэзыдэнта цяпер. Сябры якраз гэтых партыяў сядзелі ў студыі тэлебачаньня пад час наўпроставага этэру з удзелам прэзыдэнта. Сядзелі, выпрастаўшы сьпіны і сувора склаўшы рукі на каленях, як і пасуе партайгеносэ.

Лукашэнка прыйшоў на пасаду на падтрымцы вайсковых адстаўнікоў, што не знаходзілі сабе месца ў новым ладзе, а таксама дзякуючы напалоханым пераменамі, пагрозьлівымі для іхняга панаваньня, так званым «кіраўнікам сярэдняга зьвяна», фактычна, той самай савецкай сярэдняй і дробнай буржуазіі, калі карыстацца сацыялістычнай тэрміналёгіяй. Вядома, не без дапамогі бедных і загнаных, прычараваных дэмагагічнай фразэалёгіяй.

Тое самае было і ў Італіі. Адстаўнікі першай сусьветнай ды напалоханыя выступленьнямі працоўных сярэднія ўласьнікі паверылі, што Мусаліні здатны скруціць супастатаў у бараноў рог, а тымчасам у паходы на Рым ужо ішлі за ім голыя і босыя.

Ня могуць не зьвяртаць на сябе ўвагу некаторыя зусім дробныя дэталі накшталт прызнаньня Лукашэнкі, што «ягоныя хобі — гэта спорт і машыны, і ён любіць сесьці ў машыну і сам езьдзіць па вуліцах горада». Такое ўражаньне, што зьмест і стыль гэтых пасажаў сьпісаны з маніфэсту футурыстаў, аўтарам якога быў перадфашыст Марынэці.

Увогуле, паводле густаў і паводзінаў пэўных нашых дзеячоў можна вывучаць асаблівасьці постканіяльнай і пераходнай да урбаністычнай культуры.

Безумоўна, Лукашэнку і Мусаліні шмат што адрозьнівае. Зьмянілася эпоха. Ніхто ў Эўропе ня выказаў жаданьня пераняць прыёмы ці рыторыку беларускага лідара. Сумнеўнымі ўяўляюцца пэрспэктывы пабудовы карпаратыўнае беспартыйнае дзяржавы пры канцы XX ст. Поўны парадоксаў сам фэномэн мэсіянскага расейска-савецкага нацыяналізму, зь якога чэрпае беларускі дыктатар. Розная гістарычная мінуўшчына і розны культурны дынамізм падзяляюць тагачаснае Міжземнамор'е і посткаляніяльную прастору былой савецкай імпэрыі.

Але непрыемна ўжо тое, што нехта зноў чакае зьяўленьня патрэбы ў Гітлеру. Непрыемна, што нехта зноў выкарыстоўвае досьвед бессаромнай агітацыі, угрунтаванай на дасягненьнях псыхалёгіі і камунікацыяў. Але шанцаў паўтарыць гісторыю, хоць бы ў выглядзе фарсу, у іх, бадай, няма.

Але, можа, калі б не прыйшоў Гітлер, Мусаліні памяталі б як найнароднейшага кіраўніка, што асушыў італьянскае Палесьсе — Палезыну, перабудаваў і добраўпарадкаваў Рым і Нэапаль, праклаў па ўсёй Італіі аўтадарогі, паставіў мост ад Мэстрэ да Вэнэцыі, як натхняльніка велічных безгустоўнасьцяў тыпу алтара Бацькаўшчыны на плошчы Вэнэцыі ў Рыме? Не, бо было ўжо да Гітлера забойства апазыцыянэра-сацыяліста Матэоці, тупы фашысцкі тэрор — хто ня памятае «XX стагодзьдзя» Бэрталючы: дэвальвацыя праўды і хлусьні ў імя... Так, нельга зарабіць пашаны, робячы ўсё у імя славалюбства. Гістарычныя паралелі — рэч адвольная. Заганы канкрэтнага чалавека, аднак, нікуды не зьнікаюць.

Андрэй Дынько

Патэнцыял балтыйскага рэгіёну

Калі Літва, Латвія і Эстонія падалі заяўкі на далучэньне да NATO і ЭС, гэта спарадзіла гучныя расейскія пярэчаньні, а рэакцыяй астатняй Эўропы была абыякавасьць. Доктар Альгірдас Канаўка з Цэнтру стратэгічнага разьвіцьця ў Вільні прапануе зірнуць на праблему з пазыцыяў геастратэгічнага падыходу:

У расейскіх спэцслужбаў і палітычных лідараў няма ніякіх падставаў сур'ёзна лічыць, што Захад хоча заваяваць альбо абрабаваць Расею. Захад меў мноства магчымасьцяў скарыстаць для экспансіі мінулыя пэрыяды крызысаў у СССР: сьмерць Сталіна, пуч 1991 г., праблемы Ельцына, — і Захад гэтага не зрабіў. Відаць, расейцы разглядаюць пашырэньне NATO на Ўсход як размываньне традыцыйнага стратэгічнага становішча сваёй краіны, што дае ёй падставы рыхтавацца да агрэсіўных дзеяньняў супраць Эўропы. Пашырэньне NATO на Ўсход магло б умацаваць пазыцыі Захаду ў ягоным процістаяньні агрэсіі з Усходу.

Без краінаў Балтыі ў Расеі зьнікае наяўнасьць пункту адштурхоўваньня, свайго роду трампліна для агрэсіўнага ўварваньня ў Эўропу. З другога боку, у выпадку, калі вайна зробіцца непазьбежнай, стратэгічнай перавагай для Захаду будзе зьяўленьне магчымасьці вядзеньня баявых дзеяньняў як мага далей на ўсходзе.

Ёсьць яшчэ адна прычына, зь якой краіны Балтыі важныя для Захаду: у сьвеце існуе блізу 190 розных краінаў, і толькі недзе 117 зь іх можна назваць цалкам дэмакратычнымі. У інтарэсах Захаду, каб такіх дэмакратычных краінаў было як мага болей, з той простай прычыны, што дэмакратыя спрыяе гандлю, палітычнаму супрацоўніцтву і культурнаму абмену. Што, у сваю чаргу, зьмяншае магчымасьць узьнікненьня вайны.

Што можа здарыцца, калі балтыйскі рэгіён будзе пакінуты па-за рамкамі NATO і будзе зноў акупаваны Расеяй? Па-першае, адсюль пацякуць патокі ўцекачоў, балтыйскае насельніцтва зробіцца непадкантрольным, што можа прывесьці да паўтарэньня ў цэнтры Эўропы балканскай ці чачэнскай трагедыяў. А псыхалягічным вынікам узьдзеяньня такіх драматычных падзеяў на насельніцтва астатняй часткі Эўропы можа быць звычайная паніка.

Расейскія радары і стратэгічныя наземныя і разьмешчаныя на бамбардавальніках ракеты цяпер практычна адведзеныя на 500 км на ўсход. У выпадку паўторнай акупацыі прыбалтыйскіх краінаў гэтыя расейскія сілы будуць зноў перадысьлякаваныя на захад, робячы Заходнюю Эўропу яшчэ больш прыступнай.

Адзіныя вайскова-марскія базы Расеі на Балтыйскім моры разьмешчаныя паблізу Калінінграду і Санкт-Пецярбургу. Усе яны прыступныя перад блякадай і паветранымі ўдарамі Захаду. У выпадку паўторнай акупацыі балтыйскіх краінаў Расеяй яе балтыйскія порты робяцца базамі для атакаў расейскага флёту на краіны, што выходзяць да Балтыйскага мора.

Вакол прыбалтыйскіх краінаў разьмешчаная вялікая колькасьць расейскіх наземных вайсковых сілаў, здольных акупаваць іх усяго за тыдзень, а то й хутчэй. Прыбалтыйскія краіны могуць проціпаставіць Расеі агулам усяго тры дывізіі. Пасьля паўторнай акупацыі краінаў Балтыі трэба чакаць працяглага пэрыяду партызанскай вайны і грамадзкага непадпарадкаваньня, што сур'ёзна адаб'ецца на стабільнасьці ў Эўропе.

Геаграфічнае становішча прыбалтыйскіх краінаў зь іхнім гандлёвым патэнцыялам робіць іх падобнымі да краінаў Бэнілюксу: ключавыя пазыцыі для гандлю з Расеяй, Беларусяй, Украінай і Далёкім Усходам. Апошні ўсё ў большай ступені становіцца рынкам для збыту эўрапейскіх тавараў. Гэты вялізны рынак ужо цяпер стымулюе рост попыту на транспартныя сыстэмы (чыгунку, наземныя дарогі, паветраны транспарт), што праз краіны Балтыі і Расею пралягаюць з Эўропы на Далёкі Ўсход.

Пры вызначэньні інтарэсаў дэмакратычных краінаў трэба браць пад увагу і маральны бок. Менавіта маральнае вымярэньне спрычынілася ў часе другой сусьветнай вайны да супольнага змаганьня супраць краінаў Восі. Менавіта маральнае вымярэньне прывяло да падзеньня Савецкага Саюзу. Пасьля сямі дзясяткаў гадоў расейскі народ страціў мільёны жыцьцяў і многае са сваёй нацыянальнай душы. У эпахальным вяртаньні расейцаў назад мы мусім праявіць да іх спачуваньне і сымпатыю.

Былы прэм'ер-міністар Швэцыі Карл Більт сказаў, што межы шчырасьці Расеі на яе шляху да свабоды і дэмакратыі пакажуць яе адносіны да прыбалтаў. Тое ж слушна і ў дачыненьні ня толькі да Расеі, але й да Захаду. Калі Захад забудзецца на прынцыпы дэмакратыі і пагоніцца толькі за сваімі вузкімі эгаістычнымі інтарэсамі, тады ён страціць свой raison d'etre.

The Baltic Times

Падрыхтваў Уладзімер Барановіч

УСХОДНІ ТЫМОР

Супраціў як адзіная форма існаваньня

Нобэлеўская прэмія міру за 1996 год была прысуджаная двум актывістам нацыянальнага і грамадзянскага руху ва Ўсходнім Тыморы — Карласу Бэла і Хасэ Рамасу Орці. Узнагарода засьведчыла: сьвет урэшце зьвярнуў увагу на лёс маленькага народу «маўбэрэ» (саманазва ўсходніх тыморцаў), над якім учыняецца генацыд.

Востраў Тымор быў захоплены партугальцамі ў 1586 г. Пазьней заходняя яго частка была далучаная галяндцамі да сваёй калёніі Нідэрляндзкая Індыя. Партугальцы валадарылі на Тыморы амаль 400 гадоў, з кароткім перапынкам у 1940-х, калі востраў кантралявалі японцы. Пад час партугальскай «рэвалюцыі гвазьдзікоў» у 1973-м на прыклад мэтраполіі ва Ўсходнім Тыморы пачаўся працэс дэмакратызацыі і дэкалянізацыі. Адбыўся выбух нацыянальнай самасьвядомасьці тыморцаў, зьявілася нацыянальная літаратура, тэатар. Узьніклі ўласныя палітычныя арганізацыі, асноўныя зь якіх — Тыморскі Дэмакратычны Саюз (DUT) і Рэвалюцыйны Фронт Незалежнасьці Тымора (FRATELIN).

Але суседняя Інданэзія, дзе ў 1965 г. усталяваўся крывавы рэжым генэрала Сухарта, ахвярамі якога стала больш за мільён чалавек, прагнула валадарыць ва ўсім інданэзійскім архіпэлягу. З пункту гледжаньня Джакарты, Тымор правінен належыць Інданэзіі. Інданэзійскія спэцслужбы пачалі псыхалягічную вайну за «ўзьяднаньне». У заходняй частцы Тымору, падкантрольнай Інданэзіі, была створаная радыёстанцыя «Куранга» з прапагандысцкімі праграмамі за «інтэграцыю». У самім Тыморы пачала дзейнічаць праінданэзійская партыя «Ападэці», якая шчодра фінансавалася Джакартай.

Выбары 1975 году засьведчылі моц незалежнікаў ва Ўсходнім Тыморы. Большасьць месцаў у парлямэнце набралі DUT і FRATELIN, якія выступілі адзіным блёкам. Тады інданэзійскія спэцслужбы пачалі разьдзімаць антыкамуністычную гістэрыю, абвінавачваючы DUT у супрацоўніцтве з марксістамі з FRATELIN, і даволі ўдала: у жніўні 1975 году DUT арганізаваў пуч. У выніку сутыкненьняў загінула каля 2.000 чалавек, але пуч праваліўся. Лідары DUT зьбеглі ў Інданэзію, дзе пачалі прапагандаваць курс «на ўзьяднаньне».

Зь верасьня 1975 г. у памежных раёнах інданэзійскія войскі пачалі баявыя дзеяньні. Шырокамаштабная агрэсія стала пытаньнем бліжэйшага часу: авіяцыя Інданэзіі ўжо бамбіла гарады, а флёт абстрэльваў узьбярэжжа Тымора. Захад абыякава назіраў за акцыямі Джакарты, нават тады, калі ў кастрычніку падчас атакі на горад Баліба інданэзійцы забілі двух заходніх рэпартэраў. Прычынай маўклівай згоды стала тое, што Інданэзія была самым буйным спажыўцом зброі ў рэгіёне. Дарэчы, гісторыя са зброяй цягнецца і да сёньня. Напрыканцы лістапада 1994 году канцэрн «Россвооружение» пачаў перамовы пра продаж Інданэзіі партыі вынішчальнікаў МИГ-29. Зразумела, што пытаньне аб правах чалавека ў Інданэзіі не існуе для расейскага МЗС...

28 лістапада 1976 г. лідары FRATELIN абвесьцілі незалежнасьць Усходняга Тымора. Гэта быў выклік Інданэзіі — да пачатку ўварваньня засталося некалькі дзён (заходнія пасольствы эвакуявалі сваіх грамадзянаў). 7 сьнежня Інданэзійскія войскі высадзіліся ў Дылі — сталіцы Тымора — з мора і паветра. Сілы FRATELIN загадзя адыйшлі ў горы. У краіне пачалася партызанская вайна.

Зь першага дня акупацыі інданэзійцы распачалі тэрор супраць насельніцтва. Лічыцца, што лічба палеглых набліжаецца да 300.000 чалавек, блізу трэці насельніцтва.

Да канца 1978 г. інданэзійскія войскі паціху сьціскалі кальцо вакол партызанскіх базаў. 31 сьнежня патрапіў у засаду і загінуў лідар FRATELIN Нікалаў Лобата. Сілы паўстанцаў былі разрозьненыя. Насельніцтва партызанскіх раёнаў перамясьцілі ў «стратэгічныя вёскі» (чытай, канцлягеры), дзе тыморцаў прымушалі вучыць інданэзійскую мову, вызнаваць іслам (большасьць тыморцаў — каталікі), паважаць сымбалі новага парадку — інданэзійскі сьцяг і герб. Было забаронена выкладаньне нацыянальнай мовы, гістрыі краіны. У сьпіс злачынстваў патрапілі нават народныя песьні і танцы.

Сухарта сьвяткаваў перамогу. Але да сярэдзіны 1979 году партызанскія атрады наладзілі сувязь паміж сабой. У канцы 1980 г. быў атакаваны тэлецэнтар у Дылі. Пачаўся новы этап супраціву.

На працягу 1980-88 г. партызаны аднавілі свае пазыцыі. Для барацьбы зь імі інданэзійцы вымушаныя былі ствараць спэцыяльныя батальёны з «праверaных» мясцовых жыхароў, але гэта ўсё роўна не дапамагала.

У 1988 г. у глыбокім падпольлі была створаная Нацыянальная Рада Маўбэрскага Супраціву, якая аб'яднала ўсе нацыянальна-вызваленчыя сілы ва Ўсходнім Тыморы. У 1990 г. лідар паўстанцаў Кшанана прапанаваў Сухарта перамовы пад эгідай ААН. Дзеля таго, каб заявіць пра гэта на ўвесь Сьвет, паўстанцы правялі ў партызанскую зону аўстралійскага журналіста Робэрта Нома (гэта першы журналіст, які дабраўся да паўстанцаў за ўвесь час вайны): «Мы кажам супраціўляцца — значыць перамагчы! — сказаў Кшанана. — Але мы ня кажам пра ваенную перамогу. Мы патрабуем правядзеньня пад міжнародным кантролем рэфэрэндуму аб незалежнасьці».

29 кастрычніка 1991 г. інданэзійскія вайскоўцы напалі на каталіцкі касьцёл у Дылі і забілі 22-гадовага студэнта С.Гомэса, які хаваўся там. Паводле мясцовай традыцыі, на сёмы дзень пасьля пахаваньня ўскладаюць кветкі на магілу. Так атрымалася, што ў гэтыя дні ў Дылі прысутнічалі прадстаўнік ААН і заходнія журналісты. Было спадзяваньне, што іхняя прысутнасьць стрымае ўлады ад гвалту. Тыморцы выйшлі на жалобную дэманстрацыю. У раёне могілак Санта-Круз інданэзійскія салдаты занялі абарону. Амэрыканскія журналісты Э.Гудмэн і А.Дойры, каб не дапусьціць расправы, усталі паміж дэманстрантамі і салдатамі. Але салдаты ўсё адно распачалі бойню. У гэты дзень загінула больш за 200 чалавек. У канцы лістапада 1991 г. у Дылі быў арыштаваны Кшанана, якога Джакарцкі суд асудзіў да 20 гадоў зьняволеньня.

Нягледзячы на арышт правадыра, супраціў працягваецца. 13 лістапада 1994 г., калі ў горадзе Багор (в. Ява) пачалася сустрэча кіраўнікоў краінаў Ціхаакіянскага басэйну, у Дылі выбухнулі масавыя беспарадкі. Дэманстранты грамілі інданэзійскія крамы і ўрадавыя ўстановы. Чацьвёра дэманстрантаў былі забітыя паліцыяй. Апошнія зьвесткі з Тымора зьвязаныя з хваляй антыўрадавых маніфэстацыяў, якая пракацілася па ўсёй Інданэзіі ўлетку 1996 г.

Наўрад ці можна казаць пра магчымасьць ваеннай перамогі маленькага народу Ўсходняга Тымору над шматмільённай Інданэзіяй. Хутчэй размова ідзе пра тое, што адзінай імавернай формай існаваньня нацыі ва ўмовах акупацыі ёсьць супраціў. У іншым выпадку нацыя зьнікае.

Лёлік Ушкін


№ 35/96
2 - 8 сьнежня

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 паласаў патрэбнае інфармацыі

Інфарматар НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION



Вы марыце пра арыгінальны ўтульны інтэр'ер. Як здзейсьніць задуманае? Зьвярнуцца ў камэрцыйную будаўнічую фірму? Канешне, можна паспрабаваць, але прыдзецца выкласьці капейку. Але ёсьць памочнікі, на якіх можна эканоміць! ЖРЭА, ЖЭСы могуць Вам дапамагчы. На 7 стар. мы друкуем каардынаты пунктаў прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы ў г. Менску. Тэлефануйце ім!

"Калі Вы ўжо маеце кампутар з CD-ROM-ам ці цьвёрда вырашылі набыць яго, трэба клапаціцца й аб набыцьці неабходнага для Вашых справаў CD-ROM-нага прадукта.

Найбольш патрэбнымі і зручнымі практычна для любога карыстальніка, незалежна ад прафэсіі ці прыхільнасьцяў, будуць электронныя энцыкляпэдыі агульнага характару — аналягі "вялікіх" ці "малых" энцыкляпэдыяў і энцыкляпэдычных слоўнікаў."

Матэрыял В.Арэшкі

Кірыла, Мятод ды іншыя.

чытайце на стар. 7





Continental TS 760-2



Goodyear UG 4



Kleber Krisalp



Michelin XM + S – Alpin

Калі Вы ўзімку жадаеце пачувацца ў аўтамабіле надзейна, то не забудзьцеся набыць шыны зь зімовым малюнкам пратэктара. Пры выбары шынаў Вам дапамогуць вынікі тэставаньня, праведзенага нямецкай выпрабавальнай арганізацыяй Штыфтунг Варэнтэст

Тэставалася 27 узораў аўтапакрывак зь зімовым малюнкам пратэктара 175/70R13.

СТАР. 6

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Буду рада знаёмству з самастойным мужчынам да 40 год дзеля сур'ёзных адносінаў. Натальля, 29/166/56, в/а, абаяльны, энэргічны чалавек. 223310, м.Маладэчна, Вальнца 4-17

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква будзе ўдзячна тым, хто прадаставіць ёй памяшканьне ў Менску для правядзеньня набажэнстваў. Тэлефон 37-13-86

КУПОН Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча ____

Адрэса, тэлефон ____

Тэкст: ____

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с. 71 НАША НІВА

The Publishers Weekly Bestsellers
Сьпіс бэстсэлераў на 29.11.96

На гэтым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кнігі. Аўтар	Выдавецтва	Колькасьць тыдняў у сьпісе
1	1	The Deep End of the Ocean Жаклін Мітчард	Viking	11
2	2	"M" is for Malice Сью Грэфтан	Henry Holt	3
3	4	The Tailor of Panama Джон Ле Карэ	Knopf	5
4	3	The Laws of Our Fathers Скот Тараў	Farrar, Straus & Giroux	8
5	6	The Third Twin Кэн Фолет	Crown	11
6	7	My Gal Sunday Мэры Хігінс Кларк	Simon & Schuster	3
7	5	Desperation Стывэн Кінг	Viking	5
8	8	Executive Orders Том Клэнсі	Putnam	15
9	-	Silent Honor Даніэла Стыл	Delaconte	2
10	10	The Notebook Нікалас Спаркс	Warner	6

20 ЛЕПШЫХ ВІДЭАКЛІПАЎ *"MTV"* НА 29 ЛІСТАПАДА 1996 ГОДА

"+" - кліп палепшыў пазыцыю ў сьпісе ў параўнаньні зь мінулым тыднем
"-" - кліп пагоршыў сваю пазыцыю
"*" - навінка
"=" - бязь зьменаў пазыцыі

Пазыцыя	Выканаўца	Назоў кліпа
* 20	Babyface	This is For The Lover In You
+ 19	Red Hot Chili Peppers	Love Rollercoaster
- 18	Hootie And The Blowfish	Sad Caper
+ 17	Soundgarden	Blow Up The Outside World
- 16	The Fugees	No Woman No Cry
+ 15	Celine Dion	It'All Coming Back To Me Now
+ 14	2Pac	I Ain't Mad At Cha'
- 13	Metallica	Hero Of The Day
+ 12	Madonna	You Must Love Me
= 11	R.E.M.	Bittersweet Me
+ 10	311	All Mixed Up
- 9	Counting Crows	Angels Of The Silences
- 8	Sheryl Crow	If It Makes You Happy+
+ 7	Marilyn Manson	The Beautiful People
+ 6	Bush	Swallowed
+ 5	Sublime	What I Got
= 4	Dr. Dre	Been There, Done That
- 3	Blackstreet featuring Dr.Dre	No Diggity
+2	Bones thugs-n-harmony	Days Of Our Lives
+ 1	No Doubt	Don't Speak

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту 63125
НАША НІВА
Колькасьць камплектаў ____

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА на газэту 63125
НАША НІВА

ПВ | месца | Літэр

Кошт: падпіскі ____ руб.; пераадрас. ____ руб. Колькасьць камплектаў ____

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

2.12 - 8.12 1996 інфарматар N35

ЗІМОВЫЯ АЎТАПАКРЫЎКІ

Калі Вы ўзімку жадаеце пачувацца ў аўтамабіле надзейна, то не забудзьцеся набыць шыны зь зімовым малюнкам пратэктара. Пры выбары шынаў Вам дапамогуць вынікі тэставаньня, праведзенага нямецкай выпрабавальнай арганізацыяй Штыфтунг Варэнтэст

Тэставалася 27 узораў аўтапакрывак зь зімовым малюнкам пратэктара 175/70R13.

Сярод пратэставаных новых шынаў адносна танныя мадэлі — Barum Polar, Hankook Snow і Marshal Powergrip, а таксама Pneumant P61 з Фюрстэнвальдэ, а самыя дарагія — усесэзонныя пратэктары Toyo 800 і Goodyear Vector 2.

Але галоўным крытэрам пры набыцьці павінен быць, канешне, ня кошт...

На выпрабаваньнях дваццаці зноў вырабленым пяці якасна абноўленым шынам зь зімовым малюнкам пратэктара спадарожнічалі дзьве ўсесэзонныя мадэлі. Гэтыя групы пазначаныя ў табліцах, прычым для кожнага вырабу ўказаная і катэгорыя хуткасьці руху: Q для 180 км/гадз і T для 190 км/гадз.

Паводле традыцыі выпрабаваньні праводзіліся на сухіх і мокрых дарогах; ацэньваліся камфорт, супраціў качэньню шыны і знос. Выпрабоўваліся зімовыя шыны і на засьнежаным перавале з ухіламі ад 9 да 12%, і на лядовым стадыёне.

Раней мадэлі M+S (знак хуткасьці скарачэньня, які ўказвае, што шыны прызначаныя для руху па брудных і засьнежаных дарогах) можна было пазнаць па глыбака разьдзеленым малюнку пратэктара. Сёньня галоўная асаблівасьць шынаў зь зімовым малюнкам — у іншай якасьці гумы, выробленай з марозатрывалай сумесі, а таксама ў вялікай паверхні профілю і ў тонкім прафіляваньні так званых дыскаў. Гума зімовых шынаў мякчэйшая за гуму летніх пнэўматычных шынаў, і застаецца такой нават у моцны мароз. Шчылінападобныя прарэзы пратэктара пакрыўкі прызначаныя для таго, каб паляпшаць цягавае намаганьне і эфэкт тармажэньня.

18 заездаў атрымалі паводле тэсту якаснай ацэнкі "добра", 7 — "задавальняюча" і толькі 2 вырабы ня вытрымалі выпрабаваньня з-за недастатковага счапленьня з мокрай дарогай ці з-за таго, што шыны праявілі сябе кепска на высокіх хуткасьцях.

Коржная мадэль разам з моцнымі бакамі прадэманстравала і кволыя. Каб зрабіць правільны выбар, неабходна добра вывучыць табліцы і зьвярнуць увагу на дадатковыя парады.

З 18 "добрых" вырабаў асабліва вылучыліся 8 мадэляў. Ва ўмовах прамозгласьці і сьнегу яны дасягнулі лепшых адзнак, а на іншых участках выпрабаваньняў паказалі сябе як задавальняючыя. Найменьні і малюнкі пратэктара пакрыўкі чатырох зь іх Вы знойдзеце на фота на наступнай старонцы.

У цэлым выпрабаваньні пацьвердзілі, што шыны зь зімовым малюнкам пратэктара, асабліва на рыхлым сьнезе, у бруд, а таксама часткова на лёдзе, павышаюць надзейнасьць руху. Акрамя таго, яны зьмяншаюць рызыку акваплянаваньня, гэта значыць калі дарога знаходзіцца пад вадой, то аўтамабіль не "плыве", а рухаецца, не губляючы сувязь з паверхняй дарогі.

СУХАЯ ДАРОГА

Сярод 17 "добрых" лепшымі былі шыны Dunlop SP (зімовы спорт). Другое месца падзялілі Bridgestone WT 11, Continental TS 760 і Goodyear Vector 2. З 10 "задавальняючых" мадэляў найбольш нізкія паказчыкі ў шынаў Barum Polar, Schwarz Respa і Vergoelst Securo (дзьве апошнія мадэлі зьяўляюцца аднаўленымі шынамі).

МОКРАЯ ДАРОГА

Адрозьненьні аказаліся большымі, чым здавалася на першы погляд. У авангардзе "добрых" вырабаў можна паставіць мадэль Continental TS 760, адразу ж за ёй — Bridgestone WT 11, Goodyear UG 4, Pneumant P 61 і ўсесэзонныя шыны Goodyear Vector 2. Найгоршае ўражаньне засталося ад мадэлі Hankook Snow з ацэнкай "зь недахопамі": на курсе "кіравальнасьць" і пры перасоўваньні па коле яна вельмі лёгка ўваходзіла ў занос. Астатнія шыны прайшлі па коле больш-менш нармальна, некаторыя зь іх ледзь не дасягнулі бліжэйшай лепшай характарыстыкі (гл. "дадатковыя парады").

СЬНЕГ

Лепшай ацэнкі заслужылі шыны Michelin XM + S, Firestone FW 900 і Fulda Krisrall. Практычна ўсе іншыя мадэлі па выпрабаваньнях на тармажэньне ў сьнезе, а таксама па такіх парамэтрах, як разгон і кіравальнасьць, атрымалі ацэнку "добра". Толькі Pneumant 61 прыйшлі да фінішу ўсяго толькі з ацэнкай "задавальняюча".

ЛЁД

Як і чакалася, аніводная з мадэляў шынаў ня справілася з "танцам" на гладкім лёдзе — большасьць мадэляў атрымала ацэнку "задавальняюча". І ўсё ж такі выпрабоўнікі станоўча адзначылі мадэлі Fulda Kristall 4, крыху адрозьніліся ад сярэдняга ўзроўню мадэлі Viking Stop 3000, Bridgestone WT 11 і Michelin XM+S Alpin. Самай горшай ацэнкі заслужылі Vergoelst Securo.

СУПРАЦІЎ КАЧЭНЬНЮ ШЫНЫ

Большасьць вырабаў у гэтым выпрабаваньні заслужылі ацэнкі "добра", прычым Toyo 800 і Continental TS 760 былі вядучымі. Пры язьдзе на Toyo быў замераны расход паліва, які даў значэньне амаль на 11% меншае, чым на шынах з самым вялікім супраціўам качэньню — Vergoelst Srcuro. Як бачым, і якасьць шынаў уплывае на страты паліва, ня гледзячы на тое, што патэнцыял эканамічнасьці, як і раней, залежыць ад "нагі на газе" кіроўцы.

КАМФОРТ

Так, зімовыя шыны надзейныя, але, ня ў прыклад шынам зь летнім малюнкам, ня вельмі камфортныя. Па частцы падрэсорваньня і шуму качэньня зімовыя шыны пакідаюць жадаць лепшага. Пры выпрабаваньні аніводная мадэль не заслужылі ацэнкі вышэй за "задавальняюча". Някепска паказалі сябе шыны Gislaved Eurofrost і Continental TS 760, крыху горш — Marshal Powergrip, а шыны Viking Stop 3000 стаяць на мяжы з ацэнкай "зь недахопамі". Пры іх выкарыстоўваньні кіроўцу замінае ня толькі зьнешні, але і ўнутраны шум.

ЗНОС

Больш працяглы тэрмін службы абяцаюць Dunlop SP Winter Sport, Gislaved Eurofrost, Kleber Krisalp, Semperit Top Grip і Uniroyal M+S Plus 3. На другім канцы шкалы — мадэль Gummimayer Winterkralle. Гэтыя аднаўленыя шыны ўжо прыблізна пасьля 30000 км прабегу дасягнулі на вядучай восі мінімальна дапушчальнай вышыні малюнка пратэктара 1,6 мм. Найбольш трывалыя да сьціраньня вытрымлівалі амаль удвая даўжэй. На выпрабаваньнях выкарыстоўваліся пяць аўтамабіляў дарожнай аховы кампактнага аўтамабілю (Golf, Escort, Kadett/Astra і Passat).

ХУТКАСНАЯ ЯЗДА

Усе шыны, за выключэньнем Pneumat 61, прайшлі выпрабаваньне на барабане. Пры хуткасных выпрабаваньнях ADAC адзін кантрольны экзэмпляр разьвітаўся з 4 мадэлямі Grad Sturz, у другога пры выпрабаваньні па ДІН 78051 на хуткасьці 180 км/гадз разбурыліся грунтазачэпы пратэктара.

Як паведаміў вытворца, гэтыя шыны хутка будуць замененыя новай мадэльлю Pneumat P 71, якая падцягваецца да хуткаснай катэгорыі T (190 км/гадз). Будуць задаволеныя абодва патрабаваньні праграмы выпрабаваньняў: тэст паводле стандарту і больш жорсткія ўмовы выпрабаваньняў.

Тэст:

25 шынаў зь зімовым малюнкам пратэктара (зь іх 5 аднаўленых), а таксама 2 усесэзонныя мадэлі — памер 175/70 R 13.

Ацэнка

На сухім пакрыцьці: 10%, на мокрым: 30%, на сьнезе: 20%, на лёдзе: 5%, камфорт: 10%, супраціў качэньню: 10%, знос: 15%.

Зьніжэньне ацэнкі

Пры недастатковым счапленьні на мокрым пакрыцьці агульная ацэнка якасьці не магла быць вышэй, чым "зь недахопамі". Калі б не было хуткаснага тэсту, ацэнка па якасьці засталася б таксама "зь недахопамі".

Сухая дарога

Язда па высокахуткаснай дарозе з суб'ектыўнай ацэнкай.

Мокрая дарога

Кіравальнасьць аўтамабіля: 2200-мэтровая дарога, даўно мокрая ад дажджу — ацэнка прахалоджаньня і суб'ектыўная ацэнка.

Тармазы: на асфальце і бэтоне. Тармажэньне з блякаваньнем колаў на хуткасьці 60 і 90 км/гадз.

Акваплянаваньне на прамой:

заезд у вадзяны басэйн глыбінёй 7 і 11 мм з заўсёднай хуткасьцю і паскарэньнем на адзначаным месцы.

Акваплянаваньне на паваротах: рух па 200-мэтровай колавай траекторыі з участкам, мокрым ад доўгага дажджу, глыбіня воднага пакрову 4 мм.

Уезд з хуткасьцю ад 70 па 100 км/гадз з заўсёдным вуглом кіравальных колаў.

Бакавы ўвод (колы): рух па колавай траекторыі з асфальтавым пакрыцьцем, мокрым ад доўгага дажджу, з магчыма большай хуткасьцю.

Сьнег

Тармазы: тармажэньне з блякаваньнем колаў па шчыльнаўкатаным сьнезе з хуткасьцю 30 на хуткасьць 20 км/гадз.

Рух зь месца (цягавае намаганьне): вызначэньне сілы цягі ў залежнасьці ад сьлізгаценьня.

Рэгулёўная язда: цягавае намаганьне і бакавы ўвод (колы) на пад'ёме паміж 9 і 12%.

Лед

Тармажэньне: праводзілася таксама з пачатковай хуткасьцю 25 км/гадз, аналягічна выпрабаваньням на сьнезе.

Старт (цягавае намаганьне): аналягічна выпрабаваньням на сьнезе.

Бакавы ўвод (колы): колавы рух (дыямэтар 18 м).

Супраціў качэньню

Вызначэньне стратаў паліва (пры выпрабаваньнях на паліўную эканамічнасьць) на хуткасьцях 60, 100 і 130 км/гадз. Усталяваны рух — з прыборам для вымярэньня стратаў паліва.

Зносатрываласьць

Выпрабаваньне на аўтамабілях дарожнай аховы ADAC на адлегласьці ад 25000 км. Замер вышыні малюнка пратэктара па 24 кропках шыны.

Новыя шыны

	Bridgestone WT 11	Continental TS 760	Dunlop SP Winter	Firestone FW 900	Fulda Kristall 4	Gislaved Eurosport	Goodyear UG 4	Kleber Krisalp	Michelin XM-S 130
Катэгорыя хуткасьці (Q = 160 км/гадз, T = 190 км/гадз)	Q	Q	Q	Q	Q	T	Q	T	Q
Ацэнка якасьці паводле тэсту	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра
Дадатковыя парады. Тэндэнцыя да:	на сьнезе — выдатна, на зносатрываласьць — добра	на сьнезе і супраціву качэньня — выдатна, на зносатрываласьць — добра	на сухой дарозе — доообра, на зносатрываласьць — выдатна	на сьнезе — добра	на мокрай дарозе, сьнезе, лёдзе і зносатрываласьці — добра	на мокрай дарозе — добра, па сьнезе і зносатрываласьці — выдатна	на сьнезе — выдатна	на сухой дарозе — задавальняюча, на сьнезе і зносатрываласьці — выдатна	— добра, на мокрай- задавальняюча
Сухая дарога 10%	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальняюча
Бакавая ўстойлівасьць:									
на паваротах	+	+	+	+	−	·	+	−	0
пры пераходзе на рэжым тармажэньня	+	+	−	+	+	−	+	−	па сухой дарозе
пры зьмене паласы руху	+	+	−	+	+	+	−	0	0
Мокрая дарога 30% добра	добра	добра	задавальн	задавальн	задавальн	добра	добра	добра	добра
"Паслухмянасьць" у кіраваньні	0	+	0	-	0	0	0	0	0
Тармажэньне	++	+	+	+	0	+	+	−	+
Паводзіны пры акваплянаваньні па прамой	+	+	++	+	−	−	++	−−	+
Тое самае на паваротах	+	+	++	+	+	0	++	−−	0
Бартавы ўвод кола (колавы рух)	0	+	0	-	0	0	0	0	0
Сьнег 20%	добра	добра	добра	выдатна	выдатна	добра	добра	добра	выдатна
Тармажэньне	+	+	+	+−	++	+	+	+	+−
Старт (цягавае паскарэньне)	+	+	++	++	−+	−+	+	−	+−
Дакладнасьць руху	+	+	+	+	+	−	+	−−	++
Лёд 5%	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн
Тармажэньне	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Старт (цягавае намаганьне)	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Бакавы ўвод кола	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Камфорт 10%	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн
Падрэсорваньне	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Зьнешнія шумы	-	0	-	-	-	0	-	-	-
Унутраныя шумы	0	+	0	0	0	+	0	0	0
Супраціў качэньню 10%	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы
Зносатрываласьць 15%	задавальн	задавальн	добра	добра	задавальн	добра	добра	добра	добра

Новыя шыны

	Nokia NRW	Semperit TG-SLG	Toyo 910	Uniroyal M+S Plus 3	Viking Stop 3000	Vredstein Snowstar	Barum Polar	Marshal Powergrip	Pirelli Winter 160	Hankook Snow	Pneumant P 61
Катэгорыя хуткасьці (Q = 160 км/гадз, T = 190 км/гадз)	T	T	T	Q	Q	S	Q	T	S	Q	S
Ацэнка якасьці паводле тэсту	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальн	задавальн	задавальн	зь недахопамі	зь недахопамі
Дадатковыя парады. Тэндэнцыя да:	на сухой дарозе — задавальн. на сьнезе — выдатна	на сухой дарозе — задаваль., на сьнезе іі іЗносатрываласьці — выдатна	на мокрай дарозе — задаваль. на зносатр. — добра	на зносатрываласьць — выдатна	на сьнезе — выдатна на педзе — добра	на сьнезе — добра, на зносатрываласьці — добра	увогуле добра (асабліва на мокрай дарозе)	увогуле — добра, на камфорт — незадавальняюча	увогуле — добра (на супраціў качэньня і па тэсту на зносатрываласьць)	па сьнезе — выдатна	зь недахопамі на зносатрыв. — добра, на лёдзе — незадавальняюча
Сухая дарога 10%	добра	добра	добра	добра	задавальн	добра	задавальн	задавальн	добра	задавальн	добра
Бакавая ўстойлівасьць:											
на паваротах	+	+	+	+	0	+	0	0	+	0	+
пры пераходзе на рэжым тармажэньня	+	-	+	+	0	+	0	0	+	0	+
пры зьмене паласы руху	+	+	+	+	0	+	0	0	+	0	+
Мокрая дарога 30%	задавальн	добра	добра	добра	добра	добра	задавальн	задавальн	задавальн	зь недахопамі	добра
"Паслухмянасьць" у кіраваньні	0	0	0	+	0	0	0	-	-	-	−
Тармажэньне	0	+	+	+	−	+	+	+	0	+	+
Паводзіны пры акваплянаваньні па прамой	+	+	++	+	+	+	+	0	+	−	+
Тое самае на паваротах	0	+	+	+	+	+	+	0	+	-	+
Бартавы ўвод кола (колавы рух)	-	-	-	0	0	0	-	-	-	—	0
Сьнег 20%	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальн
Тармажэньне	+	++	+	−	+	−	+	+	−	+	0
Старт (цягавае паскарэньне)	++	+	++	−	++	−+	+	+	−	+	0
Дакладнасьць руху	+	+	+	+	−	+	+	+	+	+	0
Лёд 5%	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн
Тармажэньне	0	0	0	0	0	0	0	0	-	0	-
Старт (цягавае намаганьне)	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Бакавы ўвод кола	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0	0
Камфорт 10%	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	з недахопамі	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн	задавальн
Падрэсорваньне	0	0	0	0	0	0	00	0	0	0	0
Зьнешнія шумы	0	0	-	-	-	-	-	-	0	0	-
Унутраныя шумы	0	0	0	0	-	0	0	0	+	0	0
Супраціў качэньню 10%	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	кволы	задавальн	кволы	задавальн	кволы	кволы
Зносатрываласьць 15%	добра	добра	задавальн	добра	добра	задавальн	добра	задавальн	задавальн	добра	зь недахоп.

Умоўныя абазначэньні: ++ выдатна, + добра, o задавальняюча, - зь недахопамі, — зь вялікімі недахопамі

НАШАЯ ПАРАДА

Пры руху па сьнезе найбольш цікавымі былі шыны: Firestone FW 900, Fulda Kristall 4 і Michelin XM+S 130 ("вельмі добра"). Але толькі Michelin паказалі разам з гэтым і "добрае" счапленьне на мокрым пакрыцьці. Абедзьве іншыя мадэлі заслужылі толькі ацэнкі "задавальняюча".

На мокрых ад доўгага дажджу дарогах і ў выпрабаваньнях на акваплянаваньне лепшых вынікаў дамагліся: Continental TS 760, Bridgestone WT 11, а таксама Goodyear UG 4 і Vector 2. На сьнезе яны таксама заслужылі ацэнку "добра".

Усесэзонныя шыны Toyo 800 і Vector 2 у сьнезе дамагліся ня самых лепшых посьпехаў, але па іншых зімовых дысцыплінах спаборнічалі някепска.

З аднаўленых шынаў самай лепшай аказалася мадэль Ihle Rigdon 750. Астанія дасягнулі толькі адзнакі "задавальняюча".

Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы

Назва арганізацыі	Адрас	Нумар тэлефону	Час працы
	Заводзкі раён		
ЖРЭА	Бехцерава, 5	243-32-61	9.00-18.00
ЖЭС N			
18	Партызанскі пр., 36	245-32-83	
21	Народная, 33	245-15-78	
28	Ташкенцкая, 16/4	241-45-84	
32	Галадзеда, 39/2	241-13-48	
39	Галадзеда, 7	241-39-11	
40	Народная, 8	245-02-42	
56	Ангарская, 18/1	243-35-57	
74	Герасіменкі, 1	246-87-61	
75	Ташкенцкі праезд, 6/1	240-96-89	
87	Алтайская, 64/1	243-74-16	
91	Герасіменкі, 26	243-76-23	
95	Ілімская, 29	242-92-67	
	Ленінскі раён		
ЖРЭА	Палявая, 24	221-58-04	8.45-18.00
ЖЭС N			
2	Рыбалкі, 3а	229-08-03	8.45-21.00
4	Энгельса, 32а	227-52-30	
9	Барадзінская, 17/2	221-40-01	
41	пр. Ракасоўскага, 113	248-96-93	
45	Пляханава, 97/2	238-42-24	
51	Пляханава, 42	247-26-80	
58	пр. Ракасоўскага, 132	247-42-40	
64	Пляханава, 73	248-96-93	
67	Сьвярдлова, 19	221-21-61	
76	Пляханава, 42	247-26-80	
80	Пляханава, 68/4	247-31-89	
82	пр. Ракасоўскага, 48	248-37-30	
ПРБУ	Надзеждзінская, 58	221-17-00	8.30-17.30
	Маскоўскі раён		
ЖРЭА	Гурскага, 26	271-79-80	
ЖЭС N			
11	Грушаўская, 131	25-44-96	8.00-21.00
14	2-і зав. Р.Люксэмбург, 4/2	220-25-53	
15	Караля, 47	220-24-82	
31	Волаха, 53а	256-48-11	
70	пр. газ. "Правда", 20	272-51-08	
73	пр. газ. "Правда", 40	271-68-61	
84	пр. газ. "Известия", 18	272-68-93	
90	Алібегава, 27	271-31-00	
98	Яseніна, 6/2	271-35-19	
99	пр. газ. "Известия", 61	271-79-80	
ПРБУ	Гурскага, 26	52-88-09	8.30-17.45

Назва арганізацыі	Адрас	Нумар тэлефону	Час працы
	Кастрычніцкі раён		
ЖЭС N			
24	Каржанеўскага, 8/2	278-53-31	8.00-21.00
55	Каржанеўскага, 25,	278-15-19	
50	Ляўкова, 8/2	225-33-57	
63	Кіжаватава, 66	278-67-26	
69	Асаналіева, 26	278-03-12	
79, 92	Чкалава, 12,	225-85-61	
ПРБУ	Магілёўская, 2/2	229-53-22	9.00-18.00
	Партызанскі раён		
ЖРЭА	Шчарбакова, 34	236-55-37	9.00-18.00
ЖЭС N			
3	Іванаўская, 38	236-55-37	8.00-21.00
12	пр. Скарыны, 38	233-17-09	
23	Уральская, 9	230-85-13	
26	Партызанскі пр., 20	249-82-06	
44	Даўгабродзкая, 10	230-24-08	
ПРБУ	зав. Казлова, 8	244-25-50	9.00-18.00
	Першамайскі раён		
ЖРЭА	Славінскага, 45	263-17-55	9.00-18.00
ЖЭС N			
6	К.Чорнага, 7	232-23-43	
19	Кедышкі, 12	263-45-46	
22	Сядых, 24а	265-52-29	
29	Славінскага, 45	264-85-89	
33	Наўгародзкая, 7	266-04-03	
35	Каліноўскага, 55	265-12-33	
36	Каліноўскага, 56	264-00-13	
52	пр. Скарыны, 133	264-70-57	
61	Цікоцкага, 34, корп. 2	263-75-51	
71	Чарнышэўскага, 4	231-73-30	
96	Нікіфарава, 12	260-80-59	
ПРБУ	Валгаградзкая, 18	266-85-39	
	Савецкі раён		
ЖРЭА	пр-т Скарыны, 46	232-57-32	9.00-18.00
ЖЭС N			
5	зав. Горны, 6	239-62-22	8.00-21.00
7	зав. Я.Коласа, 11	232-21-44	
8	Кальцова, 10	262-41-32	
25	Я.Коласа, 8	232-61-33	
42	Кульман, 13	231-79-93	
49	Сурганава, 49	232-66-33	
59	Мележа, 4	262-50-67	

Назва арганізацыі	Адрас	Нумар тэлефону	Час працы
65	Я.Коласа, 53, корп. 2	232-85-77	
68	Мірашнічэнкі, 51	261-25-51	
72	Варвашэні, 8	233-39-21	
77	Гамарніка, 14	261-24-74	
85	Бяды, 11, корп.1	231-03-25	
ПРБУ	Тапаграфічная, 5	265-42-30	9.00-18.00
	Фрунзэнскі раён		
ЖРЭА N1	Гусоўскага, 61	254-40-06	9.00-18.00
ЖЭС N			
16	пр. Пушкіна, 28	251-22-21	8.00-21.00
30	Скрыганава, 3	254-40-06	
47	Адоеўскага, 81	252-22-83	
48	Я.Маўра, 42	252-94-56	
54	Дуніна-Марцінкевіча, 6	251-15-44	
81	Цімашэнкі, 20, корп. 1	258-96-87	
83	Бурдзэйнага, 23	258-22-00	
86	Адзінцова, 47	258-73-59	
94	Адзінцова, 77, корп. 1	258-73-59	
ЖРЭА N2	Матусевіча, 42	255-32-13	9.00-18.00
ЖЭС N			
17	Прытыцкага, 10	254-43-71	
37	Прытыцкага, 46	253-47-13	
43	Альшэўскага, 57	255-32-13	
53	Жудро, 67а	255-57-06	
57	Прытыцкага, 46	253-67-14	
60	Прытыцкага, 38	253-47-13	
62	Заслаўская, 23, корп. 2	223-25-96	
66	П.Глебкі, 118	253-10-02	
89	пр. Машэрава, 47	223-54-09	
97	пр. Машэрава, 83	250-61-02	
ПРБУ	Матусевіча, 42	253-08-95	
	Цэнтральны раён		
ЖРЭА	Камсамольская, 20а	227-69-55	9.00-18.00
ЖЭС N			
1	Няміга, 8	227-69-55	8.00-21.00
13	Нававіленская, 10	237-86-22	
20	Асіпенкі, 37	237-16-94	
27	Арлоўская, 24	237-26-80	
34	пр. Скарыны, 27а	226-04-81	
38	Старажоўская, 8	234-53-64	
ПРБУ	Гандлёвая, 25	222-35-72	8.30-17.30
	Замкавая, 29	223-87-13	
	В.Харужай, 46, корп. 2	237-07-72	

Беларускі кампутар

КІРЫЛА, МЯТОД ДЫ ІНШЫЯ

Калі Вы ўжо маеце кампутар з CD-ROM-ам ці цьвёрда вырашылі набыць яго, трэба клапаціцца й аб набыцьці неабходнага для Вашых справаў CD-ROM-нага прадукта. Найбольш патрэбнымі і зручнымі практычна для любога карыстальніка, незалежна ад прафэсіі ці прыхільнасьцяў, будуць электронныя энцыкляпэдыі агульнага характару — аналягі "вялікіх" ці "малых" энцыкляпэдый і энцыкляпэдычных слоўнікаў. Як і ў адпаведных "папяровых" выданьнях, там можна знайсьці даведку тэрмінова неабходную для працы, а можна з карысьцю забавіць час, гартаючы старонкі і шукаючы цікавай інфармацыі альбо разглядаючы малюнкі. Да нядаўняга часу толькі знаўцы эўрапейскіх моваў — пераважна ангельскае — маглі па-сапраўднаму бавіцца ці прафітаваць з папулярных ва ўсім сьвеце энцыкляпэдыяў, такіх, як Enkarta, Grolier, Compton і гэтаму падобных. Але нядаўна ўжо і ў Менску (для жадаючых — у краме "Сельскагаспадарчая кніга", ад фірмы "Трыюмф") зьявіўся шырока разрэклямаваны маскоўскі прадукт: як яе рэпрэзэнтавалі — перщая, сапраўдная, арыгінальная, расейская "Большая Энциклопедия Кирилла и Мефодия" 1996 году. Шыкоўная скрынка, друкаваны ў Вялікабрытаніі кампакт-дыск, але цікава — што ж там у гэтым "Кірыле і Мятодзе" унутры? Распрацоўшчыкі энцыкляпэдыі абяцаюць каля 85 000 артыкулаў, заснаваных на Вялікім Энцыкляпэдычным слоўніку, 75 відэафрагмэнтаў, 5 000 слайдаў, 300 мапаў ды яшчэ гукавыя ілюстрацыі... Раскрыем любы артыкул энцыкляпэдыі (гэта дарэчы вельмі нескладаная апэрацыя — энцыкляпэдыя сапраўды лёгка ўсталёўваецца і даступная ў карыстаньні), ну, напрыклад, раз гэта мультымэдыйны прадукт, дык артыкул "мультымэдыя"... Дзіўна, але такога няма. Пашукаем пра CD-ROM... таксама не знаходзіцца. Ну добра, гэта ўсё ж кірыла-мятодаўская "штучка", лацінскага CD можа й ня быць. Што ж такі ёсьць з гэтае вобласьці? Дарэчы шукаць па тэме немагчыма, бо практычна абавязкавага ў любой салiднай электроннай энцыкляпэдыі "дрэва ведаў", дзе можна рухацца ад агульнай тэмы да падтэмаў і асобных артыкулаў тут таксама няма. Па альфабэту адшукваем нарэшце "кампакт-дыск", чытаем: "...найболыш распаўсюджаныя К.-д. з запісам гукавых праграм... што аднаўляюцца з дапамогай аптычных прайгравальнікаў... Працягласьць гукавай праграмы да 1 гадз. ..." А дзе ж новыя мультымэдыйныя тэхналёгіі, дзе ж самыя электронныя энцыкляпэдыі нарэшце?! Атрымліваецца, гэтыя "Кірыла зь Мятодам" адмаўляюць самі сабе ў існаваньні. Шукаем "пэрсанальны кампутар" — ёсьць, але: "... бытавыя П. ЭВМ... замест дысплея звычайна выкарыстоўваецца тэлевізар, у якасьці зьнешняй памяці — магнітафон..." — паспрабуйце зараз адшукаць такую "архаіку". Адчуваньне, што інфармацыя ўся пяці—васьмігадовае даўніны. У чым справа? А ў тым проста, што стваральнікі "Большой Энциклопедии" акуратна перапісалі слоўца ў слоўца апошняе савецкае выданьне "Большого Энциклопедического Словаря" 1991 года (шчыра, праўда, спаслаўшыся на арыгінал, хаця й не называючы дату выданьня). Але, выбачайца навошта цяпер энцыкляпэдыя напісаная ў 1990 годзе? Заходнія, як друкаваныя, гэтак і кампутарныя, энцыкляпэдыі перавыдаюцца практычна кожны год, бо дорага каштуе менавіта сучасная, актуальная інфармацыя. Праўда некаторыя артыкулы "Кірылаўкі" ўжо крыху падпраўленыя пад больш сучасны стан, асабліва гэта датычыцца геаграфіі — палітычная карта надта ўжо зьмянілася за апошнія шэсьць гадоў. Гэтак можна знайсьці артыкулы аб дзяржавах, якія ўтварыліся на месцы былой Югаславіі, але амаль нічога не сказана пра крывавы канфлікт, які доўжыўся некалькі гадоў на Балканах. Пра Беларусь, у дадатак да старога, савецкага тэксту ўважліва згадана, што ў ёй у 1994 г. "учреждён пост президента", а пра самых беларусаў, што яны ў асноўным праваслаўныя, але "ёсьць каталікі". Пацікавіўся я й такой актуальнаю тэмай, як Чачэнія й не магу не падзяліцца знойдзенай інфармацыяй (пакідаю без перакладу, каб не згубіўся каларыт тэксту): "...В дек. 1994 с целью восстановления конституц. законности и правопорядка на терр. Ч. были введены вооруж. силы Рос. Федер. Сопротивление незаконных чечен. вооруж. формирований привело к полномасштабным воен. действиям, в ходе к-рых их основные силы были разгромлены. На большей части Ч. началось восстановление законных органов власти, нар х-ва, к-рому был нанесён значит. ущерб и нормализация жизни населения республики..." Неяк адразу ўявілася мне, як маскоўскія "энцыкляпэдысты", дзелавіта пастуквая па клявішах, упісваюць ў наступнае выданьне сваёй "Кірылаўкі", па вядомым трафарэціку, пра "установление новой конституц. законности и правопорядка на терр. братской Белоруссии..."



Але здаецца, з тэкстамі энцыкляпэдыі больш-менш зразумелая сытуацыя. А што ж у ёй ёсьць яшчэ цікавага? Адказаць на гэта складана. Прасьцей пералічыць па пунктах чаго ў ёй няма:

1. няма, як ужо згадана было, "дрэва ведаў";
2. няма звычайнае ў такіх энцыкляпэдыях "стралы часу" і, адпаведна, магчымасьці шукаць набходныя артыкулы па храналягічным прынцыпе;
3. няма ўбудаванага тэкставага нататніка альбо магчымасьці непасрэдна карыстацца рэдактарам Windows'а;
4. няма магчымасьці перанесьці ў свае файлы малюнкі, музыку ці відэакліпы — толькі тэксты і тое зь цяжкасьцямі;
5. няма асобнага атлясу, які прыстасаваны для атрыманьня максымальнай геаграфічнай інфармацыі. І гэтак далей...

Ёсьць жа даволі прымітыўны і дзякуючы гэтаму просты інтэрфэйс, ствараючы ўражаньне даволі выпадковага набору малюнкаў, няшмат і выключна музычных гукавых урыўкаў і набор зь невялікіх відэаклiпаў у фармаце "QuickTime", якія рэпрэзентуюць у асноўным такіх асобаў, як Брэжнеў, Гагарын, Гарбачоў, Гітлер ці Сталін. (Спадзяюся, што наступнае выданьне ў гэтае частцы будзе дапоўненае маладым энэргічным "лідарам славянаў").

Што ж атрымліваецца, нарэшце, пры больш-менш уважлівым разглядзе "Кирилла и Мефодия"? А тое, што пад шыкоўнымі вокладкамі хаваецца, выбачайце, натуральная маскоўская "фанэра", у якой няма ні арыгінальнай, ні своечасовай інфармацыі, няма нават неабходных і звычайных у аналягічных прадуктах праграмных прыстасаваньняў, а ёсьць нахабная спроба выдаць тандэт за каштоўны тавар.

Для параўнаньня можна прывесьці кароткую характарыстыку добра вядомай у нас кампутарнай энцыкляпэдыі фірмы Compton's New Media выданьня 1995 г. Артыкулаў там "усяго толькі" 32 000, але яны дапоўненыя "Слоўнікам", які дае лінгвістычны аналіз тэрмінаў. Апроч 120 відэаклiпаў энцыкляпэдыю дапаўняюць 10 000 слайдаў (некаторыя зь іх аб'яднаныя ў невялікія слайд-фільмы па розных тэмах), каля 16 гадзінаў гуказапісу ды інтэрактыўны атляс з 800 мапамі. Як абавязковыя прысутнічаюць "Timeline" — "страла часу" і "дрэва ведаў". Тыя, хто жадаюць праглядзець слайды, могуць запусьціць "Picture Tour" і пачакаць, пакуль кампутар сам не пакажа ўсе 10 000 малюнкаў. Для таго хто ня хоча губляць час на пошук артыкулаў на пэўную тэму ёсьць "Idea Search" — аўтаматычны падбор усіх артыкулаў, якія зьвязаныя з зададзенай галоўнай тэмаю. "Info Pilot" дапамагае пазнаёміцца з артыкуламі, якія маюць ускоснае, сэнсавае альбо лінгвістычнае, дачыненьне да першаснага артыкула. Адно з самых цікавых прыстасаваньняў — гэта "Work Space", віртуальная рабочая прастора, якая дазваляе адвольна спалучаць тэксты, малюнкі, гуказапісы, ствараючы для сябе арыгінальныя "кліпы" з закладзенай у энцыкляпэдыю інфармацыі.

Шчыра кажучы, Compton, можа й ня самая насычаная інфармацыяй, але адна з самых прыгожых і захапляльных, сапраўды мультымэдыйных энцыкляпэдыяў.

Зрэшты, у кожнага свае густы, і я не зьдзіўлюся, калі каму-небудзь спадабаецца і такая зразумелая і блізкая "Энциклопедия Кирилла и Мефодия", асабліва калі ёсьць грошы (57 $ — і ніякага пірацтва).

Вацлаў Арэшка

ПАНЯДЗЕЛАК, 2

БТ
17.15 ТБ - школе.
17.35 На добры лад.
17.50 Пазнай сябе.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканаміст.
18.50 Навіны.
19.00 «Музычная абойма».
19.05 «Гэтага мы не праходзілі...»
19.20 Беларускі дом.
19.55 Канцэртны сэзон.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 Музычны антракт.
22.00 «Дзікая сабака Дынга». М/ф.
23.35 На спаборніцтвах за Дзяржпрэмію Рэспублікі Беларусь.
0.35 Навіны.

ОРТ
14.00 Навіны.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Марафон-15.
15.00 Зорная гадзіна.
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 Джэм.
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 «Мы».
19.45 «Дабранач, дзеці!».
20.00 Час.
20.45 «Багз-2». «Залатая ліхаманка».
21.50 «Срэбны шар».
22.35 Навіны.
22.45 «Лінія кіно». «Плавец».
0.10 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Чараўнік Смарагдавага гораду». Мультфільм.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 М/ф «Жорсткая фантазія».
16.20 Блёк-нот.
16.35 Гульня ўсур'ёз.
17.00 Экспа-весьнік.
17.10 L-клюб.
17.55 Момант паўды.
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Схаванай камэрай.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 «На вастрыі нажа». М/ф.
22.00 Тэлескоп.
22.30 «Эх, дарогі...»
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40 Мультфільм.
14.10 «Убойны аддзел».
15.00 «Цікаўнае сланя». Мультфільм.
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
15.25 Міжнародны агляд.
16.10 «Рабінзанада, ці Мой ангельскі дзядуля». М/ф.
17.20 «Галасы». Т/ф.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 «Гісторыя каханьня».
20.15 Сьпявае Сяргей Захараў.
21.00 «Убойны аддзел».
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 Гістарычныя вышукі.
23.10 «Тэлекампакт».

НТБ
5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Вялікі кавун».
11.00, 13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая «Часінка».
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 М/ф «Блакітнае дрэва».
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Шумны пярун».
20.45 Доктар Угал.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За межамі магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 3

БТ
7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 «Музычная абойма».
7.50 Эканаміст.
8.00 Навіны.
8.15 Абібок.
8.45 «Гэтага мы не праходзілі...»
9.00 ТБ - школе.
9.20 Мультфільмы.
9.50 Цёмны пакой.
10.20 «Трапічная сьпёка».
11.20 Тураб'ектыў.
11.50 Бон тон.
12.20 Акаляда.
15.00 Навіны.
15.10 ТБ - школе.
15.40 Мультфільм.
15.50 «Усё пра ўсё».
16.15 Студыя «Вакно».
16.55 Інвафорум.
17.45 Запрашаем на вячоркі.
18.25 «Будзьце здаровы».
18.35 Эканаміст.
18.50 Навіны.
19.00 «Музычная абойма».
19.05 «Лясны генэрал». В/ф.
19.35 «Трапічная сьпёка».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 М/ф «Танга на Палацавай плошчы».
23.20 Тэлевізійны Дом кіно.
23.40 Матаспорт.
0.10 Навіны.

ОРТ
11.00 Навіны.
11.10 «Сьвет». «Мы і рынак».
11.55 М/ф «Гардэмарыны, наперад!» С. 1.
13.10 «Брэйн рынг».
14.00 Навіны.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Квар'тэт «Вясёлая квампанія».
14.55 Мультыроля.
15.10 Чароўны сьвет, ці Сынэма.
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 ...Да 16 і болей.
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 «Каб памяталі...»
19.45 «Дабранач, дзеці!».
20.00 Час.
20.45 М/ф «Целаахоўнік».
22.30 Навіны.
22.40 «50 х 50».
23.35 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Чараўнік Смарагдавага гораду». Мультфільм.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
16.20 Блёк-нот.
16.35 «Чэленджэрс».
17.05 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.15 Апірышча.
17.45 Надзвычайны канал.
18.10 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 Подыюм д'АРТ.
21.40 «На кані».
22.05 «Блукар». М/ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Хто на што здатны.
0.05 Гарачая дзясятка.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.45 Мультфільм.
14.10 «Убойны аддзел».
15.00 «Цікаўнае сланя». Мультфільм.
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
15.25 Тата, мама і я — спартовая сям'я.
16.10 «Музыка гадзіньнікаў». Т/ф.
16.20 «Тэлекампакт».
17.05 Дзіцячае ТБ.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 «Гісторыя каханьня».
20.15 Храм.
21.00 «Убойны аддзел».
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 «Сёстры Лібэрці». М/ф.

НТБ
5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Стаяць і не здавацца».
11.00, 13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая «Часінка».
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва». М/ф.
17.30 «Вуліца Сэзам».
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф «Цынік, нягоднік, гвалтаўнік».
20.45 Доктар Угал.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За межамі магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Маляваныя. «Марлен Дытрых».

СЕРАДА, 4

БТ
7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 «Музычная абойма».
7.50 Эканаміст.
8.00 Навіны.
8.15 «Тут, пад антычным небам Танаіса...» Д/ф.
8.30 Востры вугал.
9.00 ТБ - школе.
9.30 Мультфільмы.
10.10 «Трапічная сьпёка».
11.10 Тэлевізійны АРТ-клюб.
11.50 Відзьма-нявідзьма.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільм.
15.25 Студыя «Вакно».
15.40 Памежжа.
16.00 «Усе мы родам з дзяцінства».
17.30 Крэда.
17.50 Шматгалосьсе.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканаміст.
18.50 Навіны.
19.00 «Музычная абойма».
19.05 Супэргол.
19.35 «Трапічная сьпёка».
20.35 «Хто гэта?»
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 «Кузына Анхеліка». М/ф.
24.00 Навіны.
0.15 Каралеўскае паляваньне.

ОРТ
11.00 Навіны.
11.10 «Кантакт».
11.55 «Гардэмарыны, наперад!» С. 2.
13.10 «Давай сябраваць». Мультфільм.
13.15 «Брэйн рынг».
14.00 Навіны.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 «Тэт-а-тэт».
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 «Тэма».
19.45 «Дабранач, дзеці!».
20.00 Час.
20.45 Сьмехапанарама.
21.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Грасхопэр» (Швайцарыя) — «Аякс» (Галяндыя). Трансьляцыя са Швайцарыі.
23.20 Навіны.
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд 7 матчаў.
0.50 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Чараўнік Смарагдавага гораду». Мультфільм.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 «Авадзень». М/ф. С. 1.
16.20 Блёк-нот.
16.35 «Чэленджэрс».
17.05 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.15 Астралёгія каханьня.
17.45 Вашае права.
18.10 Клюб губэрнатараў.
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.35 «Аншляг».
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.15 Баскетбол. Чэмпіянат Эўропы сярод клюбных камандаў.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Хто на што здатны.
0.05 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.45 Мультфільм.
14.10 «Убойны аддзел».
15.00 «Цікаўнае сланя». Мультфільм.
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
15.25 «Асабістая справа».
16.05 Г.Бэрліёз. «Рамэа і Юлія».
16.50 Тэатральная правінцыя?..
17.15 «Галяндыя будуе «Батавію». Д/ф.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Гісторыя каханьня».
20.10 Барбара Хендрыкс у Санкт-Пецярбургу
21.00 «Убойны аддзел».
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 «Таямніцы палацаў».
22.55 Адкрыты кубак Эўропы па таэквандо.

НТБ
5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Сакрэты жанатага мужчыны».
10.30 «Вуліца Сэзам».
11.00, 13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая «Часінка».
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва». М/ф.
17.30 «Вуліца Сэзам».
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф «Узброены Рым».
20.40 Расейскі альбом. Гурт «Сьвінцовы туман».
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За межамі магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Каварня «Абломаў».

ЧАЦЬВЕР, 5

БТ
7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 «Музычная абойма».
7.50 Эканаміст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 Сядзіба.
9.00 Тэлебом-кіно.
9.25 «Пяць тыдняў на паветраным шары». Мультфільм.
10.10 Каралеўскае паляваньне.
10.50 «Трапічная сьпёка».
11.50 Госьці ў хату.
12.20 Музыка бязь межаў.
15.00 Навіны.
15.10 ТБ - школе.
15.40 Пэрспэктывы малай энэргетыкі.
16.00 Канцэртны сэзон.
17.20 Збройня.
17.50 Заняткі Н.Навахылавай.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканаміст.
18.50 Навіны.
19.00 «Музычная абойма».
19.05 «Крок».
19.40 «На мяжы тысячагодзьдзяў».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 «Сэм Х'юстан - паданьне Тэхаса». М/ф. С. 1.
23.25 «Крок».
23.55 Навіны.

ОРТ
8.00 Навіны.
8.15 «Новая ахвяра».
9.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Мілян» (Італія) — «Русэнборг» (Нарвэгія).
11.00 Навіны.
11.10 «Пад дахам сьвету».
11.55 «Гардэмарыны, наперад!» С. 3.
13.05 «Зброя паляўнічага». Мультфільм.
13.15 «Брэйн рынг».
14.00 Навіны.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Лега-га!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 Рок-урок.
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік.
18.30 «Джэнтэльмэн-шоў».
19.00 «Мая сям'я».
19.45 «Дабранач, дзеці!»
20.00 Час.
20.45 Фільм «Музыка для сьнежня».
22.45 Навіны.
22.55 «Абоз».
23.45 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Чараўнік Смарагдавага гораду». Мультфільм.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 «Авадзень». С. 2.
16.20 Блёк-нот.
16.35 «Чэленджэрс».
17.05 Ваш партнэр «Сымэнс».
17.15 «К.Р.» Д/ф.
17.45 «Цёмная» для І.Глазунова.
18.00 Новае «Пятае кола».
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Рэк-тайм.
20.45 Надвор'е на заўтра.
20.55 «Гарэм». М/ф. С. 1.
22.40 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.35 Хто на што здатны.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
15.05 «Гісторыя каханьня».
15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
16.10 Парадоксы гісторыі.
16.35 «Вандраваньне па Японіі». Д/ф.
17.05 Дзіцячае ТБ: «Тры колы, фаліянт і ...»
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Гісторыя каханьня».
20.15 Асабістая справа.
20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
21.00 «Убойны аддзел».
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 «Дом кіно».

НТБ
5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Бліскавіца».
10.30 «Вуліца Сэзам».
11.00, 13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая «Часінка».
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва». М/ф.
17.30 «Вуліца Сэзам».
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Як я выйграў вайну».
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За межамі магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Кіно не для ўсіх. «Донуса».

ПЯТНІЦА, 6

БТ
7.30 Ранішні кактэйль.
7.45 «Музычная абойма».
7.50 Эканаміст.
8.00 Навіны.
8.15 «Яшчэ на вечар...»
8.30 «Аксамітавы сэзон».
9.00 ТБ - школе.
9.30 «Айбаліт-66». М/ф.
11.05 Студыя «Калыханка».
11.35 «Труба і рог». Д/ф.
12.00 Тэлевізійны Дом кіно.
15.00 Навіны.
15.15 В.Гібсан. «Тая, што стварыла цуд». Спэкт.
17.05 Чарнобыль: праблемы і рашэньні.
17.50 Кантрасты.
18.20 Музычны антракт.
18.35 Эканаміст.
18.50 Навіны.
19.00 «Музычная абойма».
19.05 Міжнародны кур'ер.
19.40 «Трапічная сьпёка».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 «Сэм Х'юстан - паданьне Тэхаса». С. 2.
23.25 Канцэртны сэзон.
23.55 Навіны.
0.10 Акаляда.

ОРТ
8.00 Навіны.
8.15 «Новая ахвяра».
9.10 «Мая сям'я».
9.50 «Пакуль усе дома».
10.25 «Грай, гармонік любы!»
11.00 Навіны.
11.10 Ад пятніцы да пятніцы.
11.55 «Гардэмарыны, наперад!» С. 4.
13.15 «Брэйн рынг».
14.00 Навіны.
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Квар'тэт «Вясёлая квампанія».
14.55 Фільм-казка. «Васіліса Прыгожая».
16.10 Аповесьць пра нармальнага чалавека.
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны.
17.20 «Новая ахвяра».
18.15 Чалавек і закон.
18.45 «Поле цудаў».
19.45 «Дабранач, дзеці!»
20.00 Час.
20.45 М/ф «Забойства рок-зоркі».
22.35 Погляд.
23.20 Навіны.
23.30 Начная кіназаля. «Зроблена ў Амэрыцы».
1.30 Прэс-экспрэс.

КАНАЛ «РАСЕЯ»
6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 «Чараўнік Смарагдавага гораду». Мультфільм.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
10.20 Гандлёвы дом «Ле Монці».
10.35 «Авадзень». С. 3.
16.20 Блёк-нот.
16.30 Імпэрыя гульняў.
17.25 Мультфільм.
17.35 Крок за крокам.
17.45 Вэртыкаль.
18.10 Бясконцае вандраваньне.
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 «Гарэм». С. 2.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Начное рандэву.
0.45 Адамаў яблык.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.45 Мультфільм.
14.05 «Убойны аддзел».
15.00, 20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
15.15 «Дом кіно».
16.10 «Убойны аддзел».
17.05 Ток-шоу «Наўздагад». «Цэрам-кварэт».
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Гісторыя каханьня».
20.15 «Бяз назвы».
21.00 «Убойны аддзел».
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 Як быць каханымі.
22.55 «Мачаха Саманішвілі». М/ф.

НТБ
5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Гульня ў забойства».
10.30 «Вуліца Сэзам».
11.00, 13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.15 Вялікая «Часінка».
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва». М/ф.
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 М/ф «Памятаеш пах бэзу...»
20.45 Доктар Угал.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За межамі магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 М/ф «Жудасная помста Бруса Лі».
0.50 Начны канал. Эратычныя шоў сьвету.

СУБОТА, 7

БТ
8.00 Навіны.
8.15 «Музычная абойма».
8.20 Сугучнасьць.
8.40 Здароўе.
9.15 Заняткі Н.Навахылавай.
9.45 Усё пра ўсё.
10.10 «Шчасьлівыя дні Мумі-тролю». Мультфільм.
11.10 Перамоўца.
11.30 Сьвет прыроды і забаваў.
11.50 «Есьць толькі хвіля...»
12.10 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
12.30 «Вока». Пра рэкляму і ня толькі...
12.50 Шматгалосьсе.
13.20 Каляж.
13.50 Чэмпіянат Беларусі па міні-футболу.
14.30 Тэлевізійны АРТ-клюб.
15.10 Творцы.
15.55 Чацьвертае вымярэньне.
16.35 «Гісторыя каханьня».
17.05 Радавод.
17.45 Галерэя.
18.25 «Музычная абойма».
18.45 М/ф «Жанчына дня».
20.05 Банка коміксаў.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.45 Музычны антракт.
22.05 «Падмаскоўныя вечары». М/ф.
23.35 Відзьма-нявідзьма.

ОРТ
7.00 М/ф «Пацеркі для маёй каханай».
8.15 «Кампутарныя войны - 2».
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра.
9.30 «Не пазяхай!»
10.00 Ранішняя пошта.
10.35 Смак.
10.55 Вяртаньне Трацьцякоўкі.
11.25 М/ф «Яраслаў Мудры».
14.00 Навіны.
14.20 Відавочнае-неверагоднае.
14.50 «Саюзмультфільм» прадстаўляе.
15.45 Амэрыка з М.Таратутам.
16.15 «Кола гісторыі».
17.00 Навіны.
17.25 Ералаш.
17.55 М/ф «Змеялоў».
19.45 «Дабранач, дзеці!»
20.00 Час.
20.50 Што? Дзе? Калі?
22.10 «Калямбур».
22.40 М/ф «Дзікія ночы».

КАНАЛ «РАСЕЯ»
7.00 Лукамор'е.
7.30 Мультфільмы.
8.30 На вашых лістах.
9.00 Кнігарня.
9.15 Парляменцкі тыдзень.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Тэлечасопіс «Здароўе».
10.30 Добрай раніцы.
11.00 21-ы кабінэт.
11.30 Ананімныя суразмоўцы.
12.00 «Паэт у Расеі - болей, чым паэт».
12.25 Прасьцей простага.
13.00, 19.00, 23.10 Весткі.
13.20 «Паляўнічы. Апошняе спаборніцтва». М/ф. С. 1.
14.15 Нічога, апроч... А.Палееў.
14.30 Дэ факта.
15.00 Сад культуры.
15.30 Свая гульня.
16.00 Мультфільм.
16.05 Зоркі ў Крамлі.
16.30 «Амаль сьмешная гісторыя». М/ф.
19.35 Суботні вечар з Іосіфам Кабзонам.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.15 Цалкам сакрэтна.
22.15 «Адкрытыя навіны».
23.25 Праграма «А».

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
9.10 «Фаліянт».
9.25 Па рацэ плыве сякера.
9.55, 11.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 «Гонар маю».
10.40 «Неўтаймаваная Афрыка».
11.10 Ток-шоу «Наўздагад».
11.40 Жарсьці-мардасьці.
12.10 Хакей. Чэмпіянат Расеі.
14.15 Яшчэ адна Расея.
14.50 Расейскі маёнтак.
15.15 Спартовы агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 «Галяндыя - лепшыя сябры». Д/ф.
16.30 Дзіцячае ТБ: «Сьмехатрашкі».
16.40 «Ад і да...»
16.55 «Раўняецца каханьне...»
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.20 «Кароткі фільм пра каханьне, забойства і яшчэ пра адно пачуцьце». М/ф.
20.55 Сьвецкая кроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.45 «Парад парадаў».
22.30 Экспрэс-кіно.
23.00 «Жарсьці па Анжаліцы». М/ф.

НТБ
7.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Крок з даху».
10.30 «Зразумей мяне».
11.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Хакей. Чэмпіянат Расеі.
14.30 Панарама.
16.00 Сэрыял па выхадных. «ЦРУ».
16.30 «Вялікая ілюзія. Вялікая вандроўка ў Галівуд».
17.00 «Чалавек-павук». «Грозны Містэрыё».
17.30 «Я і мой сабака».
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.30 «Чалавек у масцы».
19.20 «Крымінальная Расея: сучасныя кронікі».
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 М/ф «Гулец».
23.45 Трэцяе вока.
0.30 Начны канал. «Плэйбой».

НЯДЗЕЛЯ, 8

БТ
8.00 «Канон».
8.25 «Два візыты», «Юбілей». М/фы.
9.15 «Свая дыстанцыя».
9.30 Студыя «Калыханка».
10.45 «Усё нармальна, мама!»
11.15 Тураб'ектыў.
11.45 Вяршыня сьвету.
12.05 Студыя «Вакно».
12.35 «Вечная памяць. Водгук Чарнобыля». В/ф.
13.35 «Вяскоўцы».
14.05 Мост.
14.35 «Вайна ў паветры».
15.00 Вяршыня сьвету.
15.20 Тэатр у фатэлі.
15.55 «Залатыя ключы».
16.35 М/ф «Шчасьлівы выпадак».
17.45 Кубак Беларусі па футзалу. Фінал.
18.35 Кампутарны палігон.
19.05 Абібок.
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартовы тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў «Карамболь».
22.00 М/ф «Сьмерць на Ніле».
0.30 Аксамітавы сэзон.

ОРТ
7.00 М/ф «Зламаная падкова».
8.20 Мультфільмы «Маўглі», «Бабуля ўдава».
9.00 Навіны.
9.15 «Непуцёвыя нататкі» Д.Крылова.
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Ранішняя зорка.
11.00 «Вайсковы кур'ер».
11.30 «Грай, гармонік любы!»
12.00 Русскій міръ.
12.30 «Падводная адысэя каманды Кусто».
13.25 Сьмехапанарама.
14.00 Навіны.
14.20 «Запрашэньне да музыкі».
15.05 Клюб падарожнікаў.
15.50 Неяк раз.
16.00 Мультфэерверк.
16.45 «Сам на-сам».
17.15 «Шчасьлівы выпадак».
18.05 «Ад суму да радасьці...».
19.00 Час.
19.40 М/ф «За бортам».
21.50 Футбольны агляд.
22.20 Навіны.
22.30 М/ф «Меч і шалі».

КАНАЛ «РАСЕЯ»
7.00 Лукамор'е.
7.30 Мультфільм.
8.15 Лята-мільён.
8.30 Пілігрым.
9.00 Вуснамі дзіцяці.
9.30 Прысяга.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Расейскае лята.
10.55 Прыз групы «Сава».
11.00 Чалавек на Зямлі.
11.30 Кнігарня.
12.00 Тэлетэатар. А.Аверчанка. «Муж... якіх шмат». «Драма ў доме Букіных».
12.25 Прасьцей простага.
13.00, 23.25 Весткі.
13.20 «Паляўнічы. Апошняе спаборніцтва». С. 2.
14.05 Нічога, апроч... А.Раманцаў.
14.20 Дыялёгі пра жывёлаў.
14.50 Караоке па-расейску.
15.20 XX стагодзьдзе ў кадры і за кадрам. Вера Халодная.
15.55 Рэпартэр.
16.10 Футбол бязь межаў.
16.40 «Усе гавораць».
17.00 Чароўны сьвет Дыснэя.
18.00 «Жадаеце здымацца ў кіно?»
19.00 Люстра.
19.55 Надвор'е на заўтра.
20.00 Рэпартаж ні пра што.
20.15 «Восеньскі марафон». М/ф.
21.55 «Пэрпэндыкулярнае кіно».
22.50 У Ксюшы.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ
9.10 Тата, мама і я — спартовая сям'я.
9.35 Стыль жыцьця.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Овэртайм.
10.35 «Неўтаймаваная Афрыка».
11.05 Да 60-годзьдзя Пецярбурскага ТБ.
11.45 Мультфільм.
12.10 «Сьвяты дзяцінства». М/ф.
13.45 «Па-за часам».
14.10 Яшчэ адна Расея.
15.15 Канцэрт памяці Г.А.Кавалёвай.
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.25 «Караван сьмерці». М/ф.
20.40 «Флёту быць!»
20.55 Усе бачаць.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.20 «Паглядзім».
22.35 «Ноч пытаньняў». М/ф.

НТБ
7.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф «Цімур і ягоная каманда».
10.30 «Зразумей мяне».
11.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
12.00 Фільм «Хай гавораць».
13.40 «НТБ-плюс».
14.00 Д/ф «Дзікая прырода».
16.00 «Ключы ад форта Баяр».
17.30 «Сто да аднаго».
18.00 Сёньня ўвечары.
18.30 М/ф «Адзін і бяз зброі».
20.00 Вынікі.
21.10 М/ф «Жаданьне сьмерці».
22.50 М/ф «Барышнікаў у Галівудзе».

КІНО. МЕНСК

2.12 – 8.12

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* — Глыбінная зорка, 2, 4-8 — 16.30 Эйр Амэрыка, 2-8 — 18.30, 20.30 Для дзяцей: Жорсткі раманс (2 сэрыі) (К/л «Расейская літаратура»), 3 — 15.00

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* – Апошні герой баевіка, 2 — 16.10; 3 — 16.40; 4-5 — 16.00; 7 — 14.20, 16.30; 8 — 14.00 Маладая лэдзі Чатэрлей, 2 — 18.20, 19.50, 21.20; 3 — 19.00, 20.30; 4-5 —18.10, 19.40, 21.10; 6 — 16.30; 7 — 18.40; 8 — 19.00, 20.30 Ісус, 6 — 18.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 6-7 — 20.00 Для дзяцей: Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 8 — 16.10 Кэці, 3 — 10.00; 4 — 10.00, 11.30, 14.30; 5 — 11.30; 6 — 13.00 Верная рука — сябар індзейцаў, 2 — 10.00, 14.30; 3 — 11.30, 15.00; 4 —13.00; 5 — 14.30; 6 — 10.00, 15.00

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* – Прыгадаць усё (фантастыка, у гал. ролі А.Шварцэнэгер), 2-7 — 15.00; 8 —15.00 (ільготны) Тайныя асалоды, ці Гульня па-за правіламі (эратычны фільм), 2-8 — 17.00, 18.30, 20.00, 21.40 Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Усьмешка», 3, 7-8 — 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка, 5 — 21.00 Танцавальны вечар «Для тых, каму на 30», 6 — 20.30 Кіна-дыска-шоў для падлеткаў, 8 — 15.00

ДРУЖБА Дэтэктыў КІД, 11-12 — 18.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для моладзі, 15-16 — з 20.00 па 23.00 Начная інфармацыйна-забаўляльная праграма, 15-16 — з 23.00 па 5.00 Штодзень працуе відэабар з 12.00 па 23.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* – Праз каналізацыю (пародыя на гангстэрскі баявік), 2, 5-8 — 14.00, 18.00; 3 — 14.00; 4 — 18.00 Сьмяротны танец (у аснове фільма незвычайная гісторыя пра каханьне), 2-8 —16.00, 20.00 Кінапраграма для бацькоў: Сям'я і псыхічнае здароўе. Падлетак у сям'і. Пастка. (Навукова-папулярныя фільмы), 3 — 18.00 Для дзяцей: Нявеста падземнага прынца, 4, 6 — 10.00; 4 — 14.00; 7-8 — 12.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* – На халяву, 2-8 — 12.00, 16.20, 19.00, 20.30 Жанчына ў полымі, 2-8 — 13.00, 17.00, 20.20 Заля індыйскага фільму: Зыта і Гіта (2 сэрыі), 2-8 — 14.00, 18.00 Відэапаказ: Бясстрашная знаходка, 2-8 — 18.00 Маскіт (фільм жахаў), 2-8 — 16.00 Для дзяцей: Хлопчык зь вялікім чорным сабакам, 2-4, 7-8 — 13.00 Кінаклюб «Мульцік», 5 — 10.30 Мультфільмы, 7-8 — 11.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* – Імпатэнт, 2-8 — 16.20, 19.30, 21.00 Бай-бай, бэбі, 2 — 17.50; 3-6 — 14.30, 17.50; 7-8 — 14.30 (ільготны), 17.50

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* – Дасканалыя махляры, 3-6, 8 — 15.00; 7 — 15.00 (ільготны) Сны пажадлівасьці, 3-8 — 16.50, 18.30 Відэапаказ, 2-3, 5 — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 6-8 — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00 Для дзяцей: Кароль манэжу, 3 — 13.30 Грыбны дожджык (мультфільмы), 8 — 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* – Імпатэнт, 2-5, 7 — 17.40, 19.20, 21.00; 6 — 19.20, 21.00; 8 — 16.00, 17.40, 19.20, 21.00 Фільм для сямейнага прагляду, 7 — 16.00; 8 — 14.30 Да дня беларускага кіно. Адкрыцьцё цыкла кінапрэм'ераў «Беларусьфільм сёньня...»: Прэм'ера мастацкага фільма рэжысэра В.Панамарова «На Чорных Лядах» (сустрэча з творчай групай), 6 — 17.00 Дзіцячая дыскатэка «Лімпапо», 7 — 14.00; 8 — 12.00

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* – Сабакі пекла (стэрэафільм), 2-6 — 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 7-8 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Сьмяротная бітва («Мортал комбат»), 2-8 — 15.00, 19.00 У Сыэтле ня сьпяць, 2-8 — 13.00, 17.00, 21.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* - Якому не даравалі, 2-8 — 16.00 (ільготны, кошт квітка 3000 руб.), 19.50 Карына, Карына!, 2-8 — 17.55, 21.45 Гусарская баляда, 6 — 14.20 (дабрачынны)

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* – Нясуць мяне коні (фільм В.Матыля, быў паказаны на фэстывалі «Лістапад-96»), 2-8 — 15.00, 19.00 Недакранальныя, 2-8 — 17.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 4-8 — 21.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў, 8 — з 16.00 па 18.00 Дэнс-шоў, 6-7 — з 24.00 па 6.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* – Скала (2 сэрыі), 2 — 16.40; 3-4 — 15.00, 19.20; 5 — 15.30, 18.30; 6 —15.00; 7-8 — 15.30 Максымальнае паскарэньне, 2 — 13.10; 3-4, 6 — 13.10, 17.30; 5 — 13.40; 7-8 — 13.40, 18.00 Размова, 2 — 19.00 Для дзяцей: Сьнягурка, 2 — 10.00, 15.00; 3-4 — 10.00 Пяць скрадзеных «манахаў», 2-4 — 11.40 Ваўчаня сярод людзей, 5-6 — 10.00 Вялікія прыгоды Зора, 5, 7-8 — 12.00; 6 — 11.30 За ваколіцай дракон, 7-8 — 1.30

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* – Каханьне і магія, 25, 28-1 — 15.00, 18.30; 27 — 15.00 (ільготны), 18.30 Кроўныя повязі, 25, 27-28 — 16.40, 20.20; 29-1 — 16.40 Відэа-дыска-шоў для падлеткаў, 27 — з 18.00 па 21.30 Музычна-забаўляльная відэапраграма, 25 — з 18.00 па 22.00 Музычна-забаўляльная праграма, 28-30 — з 20.00 па 24.00 Відэазаля: Каралева джунгляў (для дзяцей), 27-1 — 16.00 Ваяры ценю, 27-1 — 18.00 Пазур тыгра-2, 27-1 — 20.00 У кінатэатры працуе відэабар Кавярня "Малютка", 30 — з 11.00 па 16.00

Для дзяцей:

Папялушка, 27-28 — 10.30; 30-1 — 13.30 Кінаклюб "Казка", 28-29 — 12.00 Кінаклюб "У дапамогу настаўніку" ("Ягор Булычоў і іншыя"), 27 — 14.00 Кінаклюб "Падлетак", 28-29 — 15.00

РАКЕТА *(Рабочы зав., 3, тэл. 260-620)* - Прынц зь Нью-Ёрку, 2-8 — 18.40 Назіральнік жарсьці, 2-8 — 17.00, 20.30 Відэапаказ, 2-6 — 16.30, 19.00; 7-8 — 14.30, 17.40, 19.00 Для дзяцей: На сьцяжыне вайны, 7-8 — 15.00

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* – Дзікая парачка (баявік), 2-6 — 16.00, 19.30; 7-8 — 14.00, 17.30, 21.20 Праз час (фантастычная камэдыя), 2-6 — 17.50, 21.20; 7-8 — 15.50, 19.20 Для дзяцей: Сьледапыт (маст. фільм) Гэта СНІД (дак. фільм), 2-3 — 14.00 Новыя прыгоды капітана Ўрунгеля (мультфільм) Дзеці на дарозе (дак. фільм), 4-5 — 14.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* – Вулічны паляўнічы (дэтэктыў), 2-3, 5-7 — 14.30 Канец сэксуальнай дыктатуры (новы эратычны фільм), 2-8 — 16.30, 18.00, 19.40, 21.10 Кінатэатар «Сучасьнік» зьнізіў кошты на фільмы агульнага экрану, акрамя эратычных і дзіцячых сэансаў. Кошт квітка — 2500 руб. Для дзяцей: Ну, пачакай! (вып.N8-14), 4 — 14.30 Чынгачгук — Вялікі змей, 8 — 14.30

СЬЦЯГ *(Вялікаморская, 3, тэл. 211-009)* – Віжоўскія страсьці, 2-3, 6 — 16.20, 18.00; 7-8 — 12.20, 16.20, 18.00 Кроўныя повязі, 2-3, 6 — 20.00; 7-8 — 14.00, 20.00 Для дзяцей: Манюка 7 — 10.50 Іншапланэцянка, 8 — 10.50

УДАРНІК *(Жукоўскага, 15б, тэл. 259-630)* – Кепскія дзяўчаты, 2-4 — 15.30; 7-8 — 17.10 Сакрэтнае выпрабаваньне, 2-4 — 17.20; 7-8 — 15.30 Скрадзеная, 2-8 — 19.00 Для дзяцей: Ералаш, 4 — 14.00 Батыр — заечая душа (мультфільмы), 7-8 — 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ *(пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297)* – Канец сьвету («Чароўная міля»), 2-8 — 11.40, 13.10, 16.20, 19.30 Чатыры пакоі, 2-8 — 14.40, 17.50, 21.00

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* – Прыватнае расьледаваньне, 2-8 — 12.30, 17.40 Каханьне і магія, 2-8 — 16.00, 19.20 Тры мушкетэры, 2, 6-8 — 14.10, 21.00; 3-5 — 21.00 Для дзяцей: Габсэк, 4 — 13.30 Залатое цыпляня (мультфільмы), 5 — 14.30 Каша зь сякеры (мультфільмы), 7-8 — 11.10

ВІДЭАСАЛЁН:

«Скала Малхоланд» (Рэжысэр Лі Тамахры, ЗША 1996, у ролях — Нік Нолт, Мэлані Грыфіт, Чаз Палмінтэры, Джон Малковіч). Ня раім дзецям да 16 гадоў. Лос-Анджэлес, пачатак 50-ых. У навакольлях горада знойдзенае цела забітай дзяўчыны. Паліцэйскі падразьдзел Макса Гувэра атрымлівае асаблівыя паўнамоцтвы для барацьбы са злачыннасьцю. Расьследаваньне прыводзіць дэтэктываў на вайсковую базу генэрала Цімса...) 2-5 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

«Здравія жадаю» (Рэжысэр Ю.Валкагон, Сьвярдлоўская к/с у ролях А.Андросаў, В.Ілычоў, М.Конанаў). Эксцэнтрычная камэдыя пра няўстаўныя адносіны ў Савецкім Войску. 6-8 — 11.00, 12.20, 13.40, 16.20, 17.40, 19.00

ТЭАТАР імя ЯНКІ КУПАЛЫ

2 сьнежня «Паўлінка» Янкі Купалы, 4-га — «Нежанаты мнагажэнец» Мальера, 5-га — «Лес» Астроўскага.

5 сьнежня на Малой сцэне прэм'ера — «Крывавая Мэры» Д.Бойкі, у жанры «вечаровы кактэйль у адной дзеі».

ТЭАТАР ОПЭРЫ І БАЛЕТА

3 сьнежня адбудзецца ранішні спэктакаль для дзяцей «Тры парсючкі»,

5 сьнежня — опэра «Кармэн».

РАСЕЙСКІ ТЭАТАР:

3 сьнежня «Адъ'ютант-Ша Ягонага Маярытэту»,

4 сьнежня «Букееў і кампанія»,

5 сьнежня «Адзіны спадкаемца».

2 сьнежня ў **КАНЦЭРТНАЙ ЗАЛІ ФІЛЯРМОНІІ**

адбудзецца канцэрт Якава Навуменкі і Дзяржаўнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам М.Фінбэрга.

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ ПРАФСАЮЗАЎ

3 сьнежня - Аляксандар Філіпенка будзе чытаць творы Булгакава, Зошчанкі, Жванецкага, Даўлатава і інш. Пачатак а 19-й гадзіне.

4 сьнежня а 20-й гадзіне – гурт «Крама» сьвяткуе юбілей. Прагучаць кампазыцыі «Крамы» і віншаваньні сяброў-музыкантаў. Канцэрт пачнецца .

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЭЙ запрашае палюбавацца творамі вядомых майстроў беларускай мастацкай керамікі З.Баўтрук і Я.Мусінскай.

Працягваецца пасьмяротная выстава М.Селешчука.

У **ПАЛАЦЫ МАСТАЦТВАЎ** (вул.Казлова) выстава жывапісу «Асоба і сучаснае асяродзьдзе».

Тамжа выстава — «Мастакі супраць СНІДу». Творчая група «Поле тяготения» (С.Бабарэка, П.Іонаў, К.Селіханаў і іншыя).

Малая заля Палаца мастацтваў прадстаўляе творчасьць С.Бандарэнкі.

ВІДЭА

2 сьнежня

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ:

1. «НЯБЕСНЫЯ ВАЯРЫ»

1996, 90 хвіл; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. У ролях: Родзі Пайпэр, Білі Драга. Баявік-фантастыка. Дзеяньне фільма адбываецца ў недалёкім будучым. З калёніі-вязьніцы адной з плянэтаў Сонечнай сыстэмы мацёры злачынца (Білі Драга) ўцякае на Зямлю...

2. «БРУДНЫЯ ГРОШЫ»

1996, 95 хвіл, Blood Money; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадо. У ролях: Джэймс Бролін, Білі Драга, Т. Лёрдс. Баявік. Трое асуджаных за забойства перабілі ахову і ўцяклі з будынка суда пасьля адхіленьня судзьдзямі прашэньня аб зьмякчэньні пакараньня...

3. «ГАЛЬГАМЭТ»

1996, 97 хвіл, Galgameth; узроставае абмежаваньне: дзецям раім глядзець сумесна з бацькамі. У ролях: Д. Отвэй, Д. Сьцюарт. Прыгоды-казка. Жылі-былі ў цудоўным каралеўстве маленькі прынц, справядлівы кароль, шчасьлівы народ і злобны Чорны рыцар. Усё было нармальна да таго моманту, пакуль Чорны рыцар ня вырашыў забіць караля і ўзяць уладу ў свае рукі...

4. «ВЫСПА СКАРБАЎ МАПЭТАЎ»

1996, 99 хвіл, Muppet Treasure Island; узроставае абмежаваньне: дзецям раім прагляд сумесна з бацькамі. У ролях: Цім Кэры і лялькі з «Мапэт-шоў». Прыгоды-м'юзікл. Вясёлыя лялькі з самага папулярнага тэлешоў накіраваліся на пошукі скарбаў...

5. «МАРКІЗ ДЭ САД»

1996, 82 хвіл, Marquise De Sade; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэжысэр Гвінэт Гібі, у ролях: Нік Манкузо, Джон-Рыс Дэвіс, Шарлот Нільсан. Гістарычны трылер. Калі Вы будзеце глядзець гэты фільм, паапякуйцеся над тым, каб побач не было дзяцей, бо размова пойдзе пра вытокі самазьдзекаў і асалоды цела пакараньнем...

6. «ЧАС ПАНДОРЫ»

1996, 176 хвіл, Pandora's Clock; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэжысэр Эрык Ланэвіль, у ролях: Робэрт Лёджыа, Рычард Дзін Андэрсан. Фантастычны трылер. ...Нейкі хваравітага выгляду чалавек уцякае ад пагоні. Зь верталёта раздаецца стрэл снайпэра. Забіты прафэсар закрытай сакрэтнай лябараторыі, якая дасьледавала самую страшную біялягічную зброю з былога Савецкага Саюза. Навуковец падчас выпрабаваньня нечаканым чынам заразіўся сьмяротным вірусам і перад сьмерцю пасьпеў параніць выпадковага фотааматара, які здымаў на прыродзе. Апошні, нічога не падазраючы, сядае ў самалёт, які ляціць з Эўропы ў Амэрыку. Там ён губляе сьвядомасьць, і пілёты вымушаныя запрасіць экстраную пасадку, але ўсе краіны адмаўляюць лайнэру ў пасадкавай паласе і нават пагражаюць зьбіць яго. калі будзе зробленая спроба сесьці...

7. «ЦАЦКА НА КАЛЯДЫ»

1996, 82 хвіл, Jingle All The Way; узроставае абмежаваньне: дзецям раім прагляд сумесна з бацькамі. Рэжысэр Браян Левант («Флінстоўны», «Бэтховэн», «Цяжкое дзіця»), прадусар: Крыс Калямбус («Місыс Даўтфайр», «Адзін дома»), у ролях: Арнольд Шварцэнэгер, Джэймс Бялушы. Выдатная фантастычная камэдыя для дзяцей і дарослых. Арнольд Шварцэнэгер грае вечназаклапочанага працай галаву сямейства, які спрабуе ў апошні дзень перад Калядамі купіць сыну новую цацку «Турбамэн». Але зрабіць гэта было ня так проста. Ва ўсіх супэрмаркетах і спэцыялізаваных дзіцячых крамах «Турбамэны» раскупленыя да апошняга. Шварцэнэгер у роспачы, як і многія іншыя бацькі, з вар'яцкім выглядам блукае па горадзе ў пошуках падарунка сыну...

ФІЛЬМ-БЛІЦ: /коратка пра галоўнае/

«Выспа доктара Мора» (страхоцьце. У ролях Марлён Брандо);

«Самка» (фантастыка-эротыка);

«Дзеткі» (падлеткавая камэдыя);

«Нараспашку» (камэдыя з удзелам Сындзі Кроўфард і іншых топ-мадэляў);

«Разбуральнік» (баявік з Чакам Нортысам у галоўнай ролі);

«Разбураны сьвет» (баявік);

«Жывая мярцьвячына» (фантастыка-камэдыя);

«Круты паварот» (баявік);

«Жывыя фарбы» (мэлядрама);

«Ціна і прафэсар» (камэдыя-эротыка);

«Ваяр справядлівасьці» (Warrior Of Justice; баявік. У ролях: Рычард Лінч, Ёрга Агняноўскі);

«Крадзеж» (The Heist; баявік. У ролях: Пірс Броснан, Уэндзі Х'юз).

«Чым заняцца мерцьвяку ў Дэнвэры» (трылер. У ролях: Эндзі Гарсіа, Крыстофэр Лойд, Крыстофэр Уокен)

Патанала ў фатэлі Тоня ВІДЗЯНКОВА

ПРЫСАДА ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ:

— Нядаўна ў сваім інтэрвію Entertainment Tonight **Сыльвэстар Сталонэ** заявіў, што ён «пэўна і дакладна» ажэніцца на Джэніфэр Флавін. Пары давялося перажыць нямала непакойных месяцаў, калі іхнаму дзіцяці рабілі апэрацыю на сэрцы. Актор заўважыў: «Джэніфэр няпростая... яна бясконца мацнейшая за мяне».

— Вытворчая кампанія **Робэрта Дэ Ніра** «Tribeca Production» заключыла кантракт з кабэльным тэлевізійным каналам «Showtime Network» на стварэньне трох паўнаметражных тэлефільмаў. Створаная ў 1988 годзе фірма Дэ Ніра раней супрацоўнічала з «TriStar», але пасьля шматлікіх перайтрусаў на гэтай кінакампаніі, відаць, вырашыла знайсьці новага патрнэра. «Tribeca Prod.» таксама мае дамову з фірмай «Savoy», для якой зьняла ў мінулым годзе фільм «Верная». Але правал гэтай стужкі спарадзіў пэўныя трэньні паміж партнэрамі. Аднак пляны ў кампаніі Дэ Ніра ўсе ж ёсьць. Ня так даўна яна набыла на паях з «Miramax» права на кінапастаноўку папулярнага брадвэйскага м'юзікла «Арэнда» (Rent). У кулюарах ходзяць чуткі, што ставіць яе жадае Мартын Скарцэзэ, але ці пажадае ён зьвязвацца з тэлебачаньнем?

— Стаўшы адной з самых папулярных актрак у сьвеце, **Сандра Балак** рэзка зьмяніла курс і пераключылася на рэжысуру, а ў апошні час —і на прад'юсаваньне. Яе першая рэжысэрская праца, кароткамэтражны фільм пра сужэнскую пару, якая адкрывае маленькую кавярню, павінен быць паказаны ў студзені на фэстывалі незалежных фільмаў у Сандэнсе. Пасьля здымак у другой сэрыі «Хуткасьці» Балак зьбіраецца прад'юсаваць рамантычную камэдыю «Кэйт і Леапольд» пра тое, як група навукоўцаў будуе машыну часу, запрашае ў наш час арыстакратаў з XIX стагодзьдзя, і дзяўчына з 90-х гадоў XX стагодзьдзя закахалася ў хлопца зь мінулага. Але да суму фанатаў трэба адзначыць, што здымацца ў фільме Сандра ня будзе. Фільм «Кэйт і Леапольд» паставіць рэжысэр Эндру Флемінг. Што датычыцца актораў, то ролі пакуль не разьмеркаваныя. Фанатам, якія спадзяюцца на тое, што акторка пераменіць рашэньне, Балак казала некалькі разоў, што жадае абмежавацца пакуль толькі прад'юсарскімі абавязкамі.

Радавалася за зорак Тоня ВІДЗЯНКОВА

БЕЛАРУСКІ НЕПАДЦЭНЗУРНЫ ДРУК

Каталёг пэрыядычных ды працяглых выданьняў 1989-90 гадоў (працяг) *

(Працяг. Пачатак у N 34)

11. БЕЛОРУССКАЯ ТРИБУНА [2] // РЕДАКТОР-ИЗДАТЕЛЬ Д.ЕМЕЛЬЯНОВ; ОТВ. СЕКРЕТАРЬ Н.АЛАДЬЕВА; РЕД. БЕЛ. ВЫПУСКА С.НЯХАМЕС; РЕД.РУС. ВЫПУСКА Л.ЕМЕЛЬЯНОВА И ДР. — [1989] — №7 (11) — 8' — [8 с.] — (прынтар).

Архіву вядомы толькі N7 (11) "Белорусской трибуны" [2], якая адгалінавалася пасьля раскопу рэдакцыі "Белорусской трибуны" ўлетку 1989 г. Ён быў выдадзены, праўдападобна, у ліпені або жніўні фарматам у 1/8 аркуша і аб'ёмам у 8 непагінаваных старонак (пазначаная толькі 1-я старонка). У нумары: матэрыялы пра пакт Молатава-Рыбэнтропа; артыкулы пра зьезд БНФ (нэгатыўныя); вынікі сацыялягічнага дасьледаваньня жыхароў Менску пра адносіны да БНФ і т.п., а таксама іншыя матэрыялы.

12. БИБЛИОТЕКА "ПАПЕРАБУДОВЫ" // Н.КОТВИЦКАЯ, [А.ДЫЛЮК]. — МЕНСК. — 1990. — 16'. — 4-16 с. — (ратапрынт).

Газэта "Библиотека "Паперабудовы" выходзіла пасьля раскопу рэдакцыі "Паперабудовы"; выдавалася ў Менску у 1990 г. Усяго выйшла шэсьць нумароў (першы раз без пазначэньня і каптура). Каптур зьмяняўся. Мастацкае аздабленьне па-за рамкамі адсутнічае. Колер выданьня — чорна-белы. Фармат — у 1/16 аркуша; аб'ём вагаўся ад 4 да 16 старонак. Дакладны наклад ня высьветлены. Спосаб рэпрадукаваньня — ратапрынт.

Мова выданьня — расейская. Склад рэдакцыі ня быў пазначаны, апроч выпускаў N5 і 6, падрыхтаваных Н.Катвіцкай. Газэта была створаная з мэтаю выдаваць больш грунтоўныя матэрыялы, чым у "Паперабудове". Друкаваліся матэрыялы палітычнай накіраванасьці. Выданьне блізкае да Дэмакратычнай плятформы ў КПСС.

Дадатковая інфармацыя: А.Дылюк.

13. ВЕСТКІ АДРАДЖЭНЬНЯ. Падзагаловак зьмяняўся: ШТОМЕСЯЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК ЛІТАРАТУРЫ: ВЫДАНЬНЕ БІБЛІЯГРАФІЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СЛУЖБЫ КБС [Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак]; БЮЛЕТЭНЬ КАНФЭДЭРАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ СУПОЛАК // РАДА СУПОЛКІ "ЗЬНІЧ"; [РАДА СУПОЛКІ "ЗЬНІЧ"], А.СЁМУХА, К.МАЦКЕВІЧ, Н.МАЦЬВІЕНКА, Я.МАТЛЕЎСКІ. — МЕНСК [ВІЛЬНЯ] — 1989. — 8' — 4-8С. —(машынапіс + ксэра).

1989: 1, 2.

"Весткі Адраджэньня" выходзілі у 1989 г. Апроч N1, былі падрыхтаваныя чарговыя N2 і 3, якія ня выйшлі (матэрыялы нумароў знаходзяцца ў Музэі Беларускага Кнігадрукаваньня ў Полацку). Таксама быў падрыхтаваны N4 пазачарговы, які выйшаў з абазначэньнем N2.

Мова — беларуская, правапіс — дарэформны. Бібліяграфічныя апісаньні і нерэдакцыйныя матэрыялы — у мове і правапісу арыгіналу. Выданьне паўстала з ініцыятывы В.Вячоркі і ажыцьцяўлялася Бібліяграфічна-інфармацыйнай службай Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак у складзе Ю.Лаўрыка (галоўны рэдактар), Л.Сьвянцецкай і І.Коваль. Заяўленая пэрыядычнасьць — штомесячна — не была вытрыманая. Фармат выданьня — у 1/8 аркуша; аб'ём — ад 4 да 8 старонак; прыкладны наклад — каля 2-3 тысячаў асобнікаў. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэрапамнажэньнем.

"Весткі Адраджэньня" былі задуманыя як выданьне, якое б ажыцьцяўляла бягучае і рэтраспэктыўнае бібліяграфічнае інфармаваньне на патрэбы адраджэнцкага руху. Таму асноўны зьмест выпускаў мусілі складаць бібліяграфічныя матэрыялы, укладзеныя паводле распрацаванай сябрамі БІС адмысловай сыстэмы клясыфікацыі, якая ўлічвала інфармацыйныя патрэбы беларускіх суполак і групаў падтрымкі БНФ у асноўных кірунках іхняе дзейнасьці. Бібліяграфічныя сьпісы складаліся на падставе беларускага і маскоўскага друку (у т.п. незалежнага).

Чацьверты нумар "Вестак Адраджэньня", паводле задумы Бібліяграфічна-інфармацыйнай службы КБС, мусіў выйсьці па-за чаргою і павінен быў зьмяшчаць літаратуразнаўчы агляд беларускай літаратуры і рэтраспэктыўны рэкамэндавальны сьпіс твораў беларускае літаратуры, а таксама падборку вершаў А.Бембеля. Агляд і сьпіс твораў на той час існавалі ў форме ананімнага непадцэнзурнага монавыданьня (аўтарства належала С.Дубаўцу) у невялікай колькасьці асобнікаў. Апублікаваньне гэтых матэрыялаў на старонках "Вестак Адраджэньня" дазволіла б зрабіць яго вядомым для больш шырокіх масаў чытачоў. У сувязі з праблемамі тэхнічнага характару адабраны матэрыял быў перададзены выдавецкай групе "Супольнасьці", якая ў складзе А.Сёмухі, К.Мацкевіч, Н.Мацьвіенкі і Я.Матлеўскага ажыцьцявіла тэхнічнае выданьне гэтага выпуску пад абазначэньнем N2. Аб'ём выпуску — 8 с.

Дадатковая інфармацыя — Ю.Лаўрык.

14. ВОЛЬНЫ МАЗЫР: НЕЗАЛЕЖНАЕ ВЫДАНЬНЕ БНФ Г. МАЗЫРА // РЭД. ІГАР СІНЯКЕВІЧ, ЛАРЫСА БЕЛАЯ. — 1990. — №1, 2. — 8'. — 4-8 с., іл. — НАКЛАД 999. — ДРУКАРНЯ LIESMA.

1990: 1, 2.

Выданьне пачало выходзіць з 1990 г., нам вядомыя два нумары. Рэдактар першага нумару — Ігар Сінякевіч, другога — Ларыса Белая. У выданьні друкаваліся матэрыялы пераважна палітычнай, нацыянальнай ды чарнобыльскай тэматыкі, а таксама асьвятляліся мясцовыя падзеі. Мова выданьня — беларуская, правапіс — дарэформны; арыгінальныя матэрыялы друкаваліся па-расейску. Фармат — у 1/8 аркуша; аб'ём — 4-8 старонак.

15. ГЛАСНОСТЬ: ПРИЛОЖЕНИЕ К ГАЗЕТЕ «АЛЬТЕРНАТИВА»: ИЗДАНИЕ СОЦИАЛ-ДЕМОКРАТИЧЕСКОГО СОЮЗА / А.Н.ГЛАДКИЙ і інш. — МИНСК — 1989-1990. — 8' — 4 с. — 2.000-5.000 асобнікаў. — (машынапіс+ксэра).

1989: 1; 1990: 2.

Дадатак да газэты «Альтернатива» — «Гласность» выходзіў у 1989-90 г. Выпуск быў распачаты ў сувязі з тэхнічнымі праблемамі выданьня «Альтернативы». Выйшла ўсяго два нумары. Мова выданьня — расейская. Склад рэдакцыі зьмяняўся, але ў падрыхтоўцы абодвух выпускаў браў удзел А.Гладкі. Пэрыядычнасьць заяўленаю не была. Фармат — у 1/8 аркуша; аб'ём — 4 старонкі. Наклад: N1 — 2.000 асобнікаў; N2 —5.000 асобнікаў. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэракапіяваньнем.

Друкаваліся матэрыялы з выразнай палітычнай накіраванасьцю, шмат месца займала прафсаюзная тэматыка.

Дадатковая інфармацыя: Ул.Андросаў.

16. ГОЛАС БЕЛАРУСА: ГРАМАДЗКА-КУЛЬТУРНАЕ ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА КУЛЬТУРЫ «СЬВІТАНАК» (МЕСТА РЫГА — у нумары №1) / В.Паўловіч. — РЫГА. — 1989. — 8'. — 4-8 с., фотаіл. —(№3-4 — наклад 3.000 ас.). — (друк).

1989 У фондзе Архіву маюцца N1, 2, 3-4.

Газэта «Голас беларуса» выдавалася Беларускім таварыствам культуры «Сьвітанак» (Рыга). Выпускі рыхтаваў Вадзім Паўловіч. Фармат — у 1/8 аркуша; аб'ём паступова ўзрастаў — 4, 6, 8 старонак. У N3-4 указаны наклад — 3.000 асобнікаў.

Тэматыка: дакумэнты таварыства; гістарычныя і краязнаўчыя публікацыі.

17. ГОМАН: БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. — Бабруйск. — 1990. — (друк).

У Архіве маецца інфармацыя пра існаваньне N1, 2 за 1990 год.

18. ГРАЖДАНИН: ДИСКУССИОННЫЙ ПОЛИТКЛУБ «СОВРЕМЕННИК». — Менск. — 1989 (прынтар).

У Архіве маецца інфармацыя пра існаваньне N1, 2 за 1989 год.

19. ГРАМАДА: БЮЛЕТЭНЬ САВЕЦКАЕ РАДЫ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ» / РЭД. НЯ ЎКАЗ.— МЕНСК: ДРУКАРНЯ МАРЦІНА КУХТЫ. — 1990. — 16' — 4 с. — 1.000 АСОБН. — (машынапіс + ксэра).

Бюлетэнь Савецкай Рады БНФ «Грамада» выходзіў у 1990 г. у Менску. Вядома пра існаваньне двух нумароў (N1 і 2, 1990). Мова рэдакцыі — беларуская, правапіс — дарэформны. Матэрыялы друкуюцца ў мове арыгіналу (у т.л. па-расейску). Абвешчана, што газэта выдавалася ў «друкарні Марціна Кухты». Склад рэдакцыі не падаецца. Пэрыядычнасьць не ўказаная. Фармат — у 1/8 аркуша. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэракапіяваньнем.

Газэта перадрукоўвала гістарычныя матэрыялы зь іншых выданьняў, паведамляла сьпісы кандыдатаў у дэпутаты, якіх падрымліваў БНФ у Савецкім раёне Менску.

20. ГРАМАДА: падзагаловак зьмяняўся: ВОРГАН ГРУПЫ ПАДТРЫМКІ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ» МЕНСКАГА РАЁНА БЕЛАРУСІ [СЕНЬНІЦА]; БЮЛЕТЭНЬ ГРУПЫ ПАДТРЫМКІ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ» МЕНСКАГА РАЁНА БЕЛАРУСІ; БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ФРОНТ «АДРАДЖЭНЬНЕ»: ВОРГАН РАДЫ МЕНСКАГА РАЁНА БЕЛАРУСІ / РЭД. Ю.ПЯТРОЎСКІ. — 1989. — 8' — 12 с. —(машынапіс + ксэра).

1989. У фондах Архіву маюцца N9-10, 11-12, 14.

Газэта «Грамада» зьяўлялася органам групы падтрымкі БНФ у Менскім раёне. Рэдактар — Ю.Пятроўскі. Усе вядомыя нумары (у тым ліку і з падвоенай нумарацыяй) маюць 12 старонак аб'ёму. Фармат — у 1/8 аркуша. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэракапіяваньнем.

Тэматыка — дакумэнты БНФ, паведамленьні пра акцыі БНФ, мясцовыя навіны, перадрукі.

21. ГРУНВАЛЬД: НАВІНЫ БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭНЬНЯ / В.ЧЫЖЫК. — ТАЛІН. — 1990. — 4'. — 8 с., іл., фота. — НАКЛАД 25.000-30.000 асобнікаў. — ДРУКАРНЯ «ОКТООБЕР».

«Грунвальд» — інфармацыйны бюлетэнь Беларускага Культурнага Таварыства «Грунвальд» (Талін). Выпускі рыхтаваў В.Чыжык. Аб'ём — 1/4 аркуша; аб'ём — 8 старонак. Наклад —25.000-30.000 асобнікаў.

Тэматыка: палітычныя матэрыялы; сытуацыя ў Эстоніі; гістарычныя артыкулы.

22. ДЕЛО: ИНФОРМАЦИОННО-РЕКЛАМНЫЙ БЮЛЛЕТЕНЬ КРЕСТЬЯНСКОГО СОЮЗА БССР. — [1990]. — (друк).

1990: 1. У Архіве маецца інфармацыя пра N1.

23. «ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!» / КИМ БЕЗЫМЯННЫЙ. — МЕНСК. — 1990. —4' — 2 с., іл.

1990: 1.

Вядомы адзіны нумар газэты, які выйшаў у 1990 г. Мова выданьня — расейская. Пазначана, што газэта выдаецца пры пасрэдніцтве фірмы MINIMAX. Сапраўдны наклад ня высьветлены. Фармат — 1/4 аркуша; аб'ём — 2 с., ілюстрацыі.

У нумары — перадрукі зь іншых выданьняў на палітычныя тэмы.

24. ЗБУДІННЕ: ВЫДАННЕ ЫНЫЦЯТЫВНИЈІ РАДЫ СУДІННЯ ЗА ОДРОДІННЕ ЕТВЫЗІ / Мыкола Гырасымык, Валер Калынивськиј, Володымыр Кыватыцкиј, Мыкола Шыляговыч. — 1989-1990. — 8' — 4-8 с., іл., фота. — наклад 5.000-12.000 асобнікаў.

1989: 1, 2, 3, 4, 5; 1990: 6 (11), 7 (12), 8 (13), 9 (14), 10 (15), 11 (16), 12 (17), 13 (18).

Збудінне («Абуджэньне»): выданьне Ініцыятыўнае рады Руху за Адраджэньне Ецьвязі) пачало выходзіць зь ліпеня 1989 г. на палескай мове, арыгінальныя матэрыялы дру-

* Каталёг выданьняў 1971-88 гадоў быў надрукаваны ў 33-м нумары "Нашай Нівы".

куюцца на расейскай, беларускай і ўкраінскай мовах. Фармат выданьня - 1/8 аркуша; аб'ём — 4-8 старонак. Наклад 5.000-12.000 асобнікаў.

Склад рэдакцыі зьмяняўся.

25. ІВЕЙСКАЯ КРЫНІЦА: ВЫДАНЬНЕ ІВЕЙСКАЙ РАЁННАЙ РАДЫ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ» / Ю.ГАЙДУК, І.КАРПІКАЎ. — ІЎЕ. — 1990. — 4 с. — (машынапіс + ксэра).

1990: 1, 2.

Газэта «Івейская крыніца» выдавалася ў 1990 г., вядома пра існаваньне 2-х нумароў. Склад рэдакцыі: Юры Гайдук і Ігар Карпікаў. Мова выданьня — беларуская, правапіс — дарэформны.

Друкаваліся матэрыялы пераважна палітычнае, нацыянальнае і гістарычнае тэматыкі. Наклад і пэрыядычнасьць ня высьветлены.

26. КАНТАКТ: ШЛЯХІ БЕЛАРУСКАЙ ДУМКІ / ВЫДАВЕЦТВА «КАНТАКТ». — [МЕНСК — БЕЛАСТОК]. — 1989-1990. — 16' — 33-48 с.,іл. —(ратапрынт).

1989: 1, 2; 1990: 1 (3), 2 (4).

Часопіс «Кантакт» выдаваўся ў 1989-90 г. Усяго выйшла чатыры нумары. Мова рэдакцыі — беларуская, правапіс дарэформны; дакумэнты друкуюцца на мове і паводле правапісу арыгіналу. Назва рэдакцыі — «Выдавецтва "Кантакт"»; склад рэдакцыі ня высьветлены. Выкарыстаны матэрыялы, што рыхтаваліся як у Беларусі, гэтак і ў Польшчы. Паводле няспраўджаных зьвестак часопіс выдаваўся ў Беластоку; магчымая таксама і дадрукоўка ў Менску. Пэрыядычнасьць — не ўказаная, але часопіс выходзіў раз у паўгады. Спосаб рэпрадукаваньня — праўдападобна, ратапрынт, а таксама — ксэракс (для N1-1990). Фармат — 1/16 аркуша; аб'ём — ад 33 да 48 старонак.

Матэрыялы пераважна на палітычную і гістарычную тэматыку, публікаваліся дакумэнты.

27. КОЛОКОЛ: ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКОГО СОЮЗА «ЗАЩИТЫ ПРАВ ЧЕЛОВЕКА» / А.ЖЕРДЕВ, А.ФЕДЕРКАН. — ГОМЕЛЬ. — [1990]. — №2, АПРЕЛЬ. —4' — [2 с.]. — (машынапіс + ксэра).

Газэта гомельскага саюзу «Защита прав человека» выдавалася ў 1990 г. у Гомелі. Колькасьць выдадзеных нумароў ня высьветленая. Нам вядомы толькі N2, апублікаваны ў красавіку 1990. Год выхаду не пазначаны. Мова выданьня — расейская. Пэрыядычнасьць і наклад не абазначаныя. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэрапамнажэньнем.

Публікуюцца матэрыялы палітычнай і чарнобыльскай тэматыкі пераважна лякальнага характару.

28. КСЭРАКС БЕЛАРУСКІ / ВЫДАВЕЦ АЛЕСЬ АРКУШ, РЭДАКТАР ВІНЦЭСЬ МУДРОЎ. — ПОЛАЦАК [-ВІЛЬНЯ]. — №1. — 16' — 35 с. —(машынапіс + ксэра).

Часопіс «Ксэракс беларускі» выходзіць у Полацку з 1989 г. зь перапынкамі. Да канца 1990 г. выйшаў толькі адзін нумар. Фармат — 1/16 аркуша; аб'ём — 35 старонак. Спосаб рэпрадукаваньня: машынапіс з ксэрапамнажэньнем.

Мова выданьня — беларуская, правапіс — дарэформны. Заснавальнік і выдавец часопіса — А.Аркуш, рэдактар — В.Мудроў. N1 часопіса рыхтаваўся ў Полацку і друкаваўся ў Вільні пры дапамозе А.Гуркова. Пэрыядычнасьць — нерэгулярная. Часопіс — літаратурны. Кола аўтараў — пераважна, полацкае асяродзьдзе (С.Сокалаў-Воюш, В.Аксак, А.Аркуш, В.Мудроў, Ул.Арлоў і інш.).

Дадатковая інфармацыя: А.Аркуш.

29. КУЦЕЙНА: ВЫДАНЬНЕ АРШАНСКАЙ РАДЫ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ» / Ю.САНЬКО, А.КАЖАМЯКА, А.МЕЛЬНІКАЎ. — 1990. — 16' — 8 с., іл.

Вядомы адзін нумар. Мова выданьня — беларуская, правапіс —дарэформны. Фармат — 1/16 аркуша; аб'ём — 35 старонак.

Тэмы: праваахоўныя; гістарычныя; палітычныя.

30. МАРТЫРАЛОГ: ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКАГА ГІСТОРЫКА-АСВЕТНІЦКАГА ТАВАРЫСТВА ПАМЯЦІ АХВЯРАЎ СТАЛІНІЗМУ «МАРТЫРАЛОГ БЕЛАРУСІ» / З.ПАЗЬНЯК, УЛ.КРУКОЎСКІ, І.МАРАЧКІНА-СТАРЭЙШАЯ. — МЕНСК [-ВІЛЬНЯ ?]. — 1989. — №1. — 28 с. — (машынапіс + ксэра).

Выйшаў толькі першы нумар выданьня «Мартыралог». Матэрыял быў падрыхтаваны ў Менску ў студзені 1989 г. і апублікаваны ў тым жа годзе. Выпуск падрыхтавалі: Зянон Пазьняк, Уладзімер Крукоўскі, Ірына Марачкіна-старэйшая. Пэрыядычнасьць і наклад не пазначаныя. Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэрапамнажэньнем.

Тэмы: дакумэнты БГГАТПАС «Мартыралог Беларусі»; публіцыстычныя матэрыялы палітычнае і гістарычнае тэматыкі.

31. МІСТЫКА / В.ВАРАНЕЦ. — ГОРАДНЯ. — 1982-1983. — №№1-4. — (машынапіс).

1982: 1, 2, 3; 1983: 4.

Машынапіс «Містыка» выдаваўся студэнтамі Гарадзенскага ўнівэрсытэту. Тэматыка — літаратура.

32. МОСТ: ВОЛЬНАЯ СОЦИАЛИСТИЧЕСКАЯ ГАЗЕТА. — Менск, 1989. —№1. — 2 с.

У фондах Архіву адсутнічае.

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:



1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** - Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 39.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Бліщчынскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с.20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналегія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.
22. **Жана Эрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі.** — Менск: Эўрафорум-БФК, 1996.– 400 с. 35 000 БРБ.
23. **Унія: часопіс хрысьціянскага сумоўя. №4 — 1995.** — 48 с. 15.000 БРБ

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Бубнов Ю. Социология половых различий и супружеской совместимости. — Менск: Право и экономика, 1996. — 190 с. 200 ас. ISBN 985-6194-54-7

Горолевич Т. Фолософия естествознания: советский и постсоветский периоды (субъективные заметки). — Менск: Право и экономика, 1996. — 91 с. 250 ас. ISBN 985-6194-51-2

Инфляция в Беларуси: Что, как и почему. (В.Гаврилюк, Е.Медведев, Т.Миронова и др.; под ред. Т.Лыча, В.Свиридовича. — Менск: Вэвэр, 1996. — 96 с. 600 ас. ISBN 985-6215-06-4

Квалификация хищений имущества. (Тишкевич И., Тишкевич С. — Менск: «Репринт», 1996. — 144 с. 5000 ас. ISBN 985-6147-22-0


Kultura. — Paryż, 1996. Listopad. 160 с. ISBN 0023-5148

Прырода Беларусі: Каляндар'97 / Слайды В.Алешкі. — Менск: Цэнтр сацыяльнай адаптацыі і псыхалягічнай падтрымкі «Конкордил», «Printexpress», ПКФ «Бонком», 1996. 5000 ас.

Сказаў як зьвязаў: Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі / Мастак Г.Кобрын. — Менск, Юнацтва, 1996. — 30 с.: іл. 6000 ас. ISBN 985-05-0125-1

Царкоўны пасланец. Паведамленьні Парафіяльнае Рады Катэдральнага Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага. Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква. Лета-восень, 1996. 20 с.

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 30.000 БРБ):



1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там напівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ**. Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС**. Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ**. Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ**. У краіне тапераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА**. The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу.
У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў "Нашай Нівы"

У рэдакцыі "Нашай Нівы" Вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні: №1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць ксэракопію любога іншага нумару.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

ЛІТОЎСКІ СТАТУТ

У Менск завезеныя кнігі віленскага акадэмічнага выданьня Першага Літоўскага Статуту 1529 г. У адным з тамоў зьмешчанае факсыміле трох сьпісаў Статуту — па-старабеларуску, па-лацінску, па-старапольску, у іншым томе — паралельныя тэксты гэтых сьпісаў, якія перададзеныя сучаснаю графікай.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

МЭТРЫКА

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі. У Менску маюцца шосты й восьмы тамы Мэтрыкі.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

ВЫ І ВАШ СЫН

Да кожнай рэальнай ці ўяўнай сытуацыі выберыце свой варыянт адказу ("а", "б" ці "в").

1. Ваш маленькі сын прыйшоў дадому са сьлядамі яўнай патасоўкі. Вопратка на ім падраная, каленкі разьбітыя. Як Вы сябе будзеце паводзіць?
а) аглядаеце сінякі і ўшыбы, умываеце малога, крыху ласкава паўшчуваеце; б)Вы нэрвуецеся, мітусіцеся. Вырашаеце больш не адпускаць яго на вуліцу аднаго; в) Вы блізкія да гістэрыкі; караеце малога?

2. Вы падаравалі свайму дзевяцігадоваму сыну гадзіньнік — рэч, пра каторую ён марыў. Праз некалькі дзён бачыце хлопчыка ў сьлёзах: гадзіньнік ён недзе згубіў. Якая Вашая рэакцыя:
а) Вы супакойваеце сына, спрабуеце адцягнуць ягоную ўвагу ад перажываньняў. Вам зусім не шкада згубленага гадзіньніка, але пры выглядзе сына Вашае сэрца разрываецца; б) сьпярша гатовыя былі бегчы на пошукі, але потым разумееце іх бессэнсоўнасьць. Вырашаеце, што "такім няўдзячным і балаваным дзецям увогуле нельга рабіць дарагія падарункі"; в) караеце сына, і ў Вашай абвінаваўчай прамове фігуруе кошт гадзіньніка?

3. Ваш дзевяцігадовы сын перадае, што настаўнік жадае Вас бачыць. Як Вы да гэтага паставіцеся:
а) Вы зусім далёкія ад панікі, спакойны, але пры першай жа магчымасьці наведаеце настаўніка; б) Вы спрабуеце высьветліць, што ж зрабіў Ваш сын. Абяцаеце яму самае суровае пакараньне, калі настаўнік паскардзіцца на яго; в) Вы блізкія да гістэрыкі, гатовыя адразу ж бегчы да настаўніка, Вам не абысьціся без заспакаяльных кропель?

4. Вам дзевяцігадовы сын атрымаў у чвэрці дзьве двойкі. Для Вас гэта ўдар, бо хлопчык раней вельмі добра вучыўся. Як Вы рэагуеце:
а) Вам гэта не падабаецца, але Вы лічыце, што гэта ўсё-такі не трагедыя. Вырашаеце займацца з сынам падчас вакацыяў па гэтых прадметах; б) ня ведаеце, каго вінаваціць у здарэньні: ці то сына — "ён зусім ад рук адбіўся", ці то мужа (жонку) — "гэтая ж ягоная спадчынная тупасьць", ці то настаўніка — "ён яго проста ненавідзіць"; в) у сям'і скандал, Вас супакойвае толькі тое, што і ў сябра Вашага сына таксама дзьве двойкі?

5. Вы бачыце, як Ваш дзевяцігадовы сын зьдзекуецца над бяздомнай коткай. Як Вы будзеце сябе паводзіць:
а) Вы абураныя, патрабуеце адразу ж спыніць гэтае барбарства; б) з жахам адцягваеце сына ад коткі: "А калі яна шалёная?"; в) абыякава праходзіце побач — гэты занятак цалкам натуральны для хлопчыка?

6. Вы знайшлі ў Вашага дванаццацігадовага сына цыгарэты. Як Вы рэагуеце:
а) не падаеце выгляду, што Вы ўсё ведаеце, аднак усё часьцей гаворыце пра шкоду паленьня; б) не надаеце гэтаму асаблівай увагі, але пры першым жа скандале прыгадваеце і паленьне; в) чакаеце зручнага моманту, каб "злавіць яго з цыгарэтай"?

7. Вы пасварыліся з мужам, вельмі раздражнёныя, зь цяжкасьцю стрымліваеце сьлёзы, калі са школы вяртаецца Ваш дзесяцігадовы сын; хлопчык радуецца, ён атрымаў добрыя адзнакі і чакае паходу ў кіно з Вамі. Як Вы сябе будзеце паводзіць:
а) нічым не выдаеце свайго стану, ідзеце з сынам у кіно; б) стрымана паведамляеце, што кепска пачуваецеся, прапануеце адкласьці паход у кіно; в) прыход сына толькі яшчэ больш раздражняе Вас, пра кіно ня можа быць і гутаркі?

8. У Вашага сына хутка дзень народзінаў — дзесяць гадоў, ён запрасіў гасьцей і з радасьцю чакае сьвята. За дзень да ўрачыстасьці Вы даведваецеся, што толькі на адзін дзень прыяжджаюць Вашыя сябры, зь якімі Вы даўно ня бачыліся. Як Вы зробіце:
а) Вашыя госьці — не перашкода сьвяту сына, Вы цудоўна можаце правесьці час разам; б) Вы тлумачыце сыну сытуацыю, просіце пра перанос урачыстасьцяў; в) проста паведамляеце, што сьвяткаваньне дня народзінаў адмяняецца?

9. Вы заўважаеце, што ў Вас пачынаюць зьнікаць дробныя грошы. З жахам выяўляеце, што гэта справа Вашага сына. Як Вы рэагуеце:
а) Вы заклапочаны, але пакуль не зламаны. Вырашаеце, што сьпярша трэба высьветліць, навошта сыну былі патрэбныя грошы, а ўжо потым прымаць меры; б) караеце сына, нічога не патлумачыўшы; в) Вам усё зразумела — Ваш сын вор?

10. У Вашага пятнаццацігадовага сына непрыемнасьці. Ён пачаў горш вучыцца, грубіць настаўнікам. Вы ведаеце, што прычына ўсяму — ягонае першае неразьдзеленае каханьне. Як Вы сябе паводзіце:
а) паспрабуеце зразумець сына, прыгадаеце сябе ў ягоным узросьце, ва ўсім праявіце далікатнасьць; б) перакананыя, што гэтая "дур з часам пройдзе"; в) "пра якое каханьне гутарка можа ісьці ў пятнаццаць гадоў?! Пакуль не выправіць двойкі і не навучыцца добра сябе паводзіць, ня выйдзе з хаты"?

11. Ваш добры пятнаццацігадовы сын зьвязаўся з дурной кампаніяй. Ён запусьціў навучаньне, паліць пры Вас, некалькі разоў прыходзіў дадому, выпіўшы сьпіртнога. Што Вы зробіце:
а) услых пашкадуеце, што ня можаце паважаць уласнага сына, пры кожным зручным выпадку тлумачыце яму, што такія паводзіны нявартыя мужчыны. Шчыра верыце, што такому сумніўнаму сяброўству хутка надыйдзе канец; б) прыпісваеце ўсё пераходнаму ўзросту, але скандалы ў сям'і становяцца больш частымі; в) пачынаеце прызвычайвацца да думкі, што Ваш сын — хуліган?



12. Падчас непрыемнай размовы з сынам Вы не стрымаліся і далі яму поўху. Праз некаторы час становіцца зразумелым, што хлопчык яе не заслужыў. Як Вы будзеце сябе паводзіць:
а) просіце ў сына прабачэньня, даеце сабе слова быць стрыманей; б) спрабуеце загладзіць сваю віну, але прасіць прабачэньне ня станеце, лічыце, што гэта можа пахіснуць Ваш аўтарытэт; в) "Сам мяне давёў! На тое і бацькі!"?

13. Уваходзячы ў кватэру, Вы чуеце гутарку Вашага сына зь ягоным сябрам. Ён дзеліцца сваім невялікім досьведам адносна дзяўчат. Гаворыць, што ня ставіцца да іх сур'ёзна. Якая Вашая рэакцыя:
а) адразу ж абвяшчаеце пра сваю прысутнасьць; такая пазыцыя Вашага сына ня вельмі падабаецца Вам; б) на хвілю нібыта заміраеце ў дзьвярэй, затым уваходзіце ў кватэру. Такое стаўленьне сына да дзяўчат Вам падабаецца: "Рана яму яшчэ пра іх сур'ёзна. Галоўнае — ня даць сябе ажаніць па глупству!"; в) крыху слухаеце далей. Ніяк не рэагуеце на словы сына, але пры нагодзе скажаце яму, што ў галаве ў яго адны дзяўчаты?

14. Ваш сямнаццацігадовы сын абвясьціў, што Вы нічога не разумееце ў сучасным жыцьці. Як Вы паставіцеся да ягоных словаў:
а) Вы не настойваеце, але пра "сучаснае жыцьцё" гатовы спрачацца зь ім на роўных; б) Вы абураны і лічыце, што менавіта ў сучасным жыцьці Вы разьбіраецеся слушна; в) "пакуль гэты грубіян не папросіць прабачэньня, не жадаю яго бачыць!" — Вашая рэакцыя?

15. Ваш васемнаццацігадовы сын абвясьціў, што месяцы праз два ажэніцца. Прычым будучая нявеста Вам невядомая. Што Вы яму адкажаце:
а) не спрабуеце адгаворваць сына, лічыце, што зь цягам часу ўсё стане на свае месцы; б) успрымаеце навіну са зьмяшанай гамай іроніі; в) Вы нібы мову губляеце, але калі ізноў ачуняеце, Вашаму красамоўству няма мяжы: "Толькі праз мой труп!" і г.д.?

16. Чым Вас можа больш за ўсё парадаваць Вашае дзіця:
а) выбітнымі здольнасьцямі (у матэматыцы, маляваньні, спорце і г.д.); б) цудоўнымі адзнакамі ў школе; в) дасканалым паслушэнствам у сям'і?

17. Чым засмуціць:
а) паўсёднай пасрэднасьцю; б) двойкай у чвэрці; в) непаслушэнствам?

18. У чым, на Ваш погляд, заключаецца галоўная прычына жыцьцёвых посьпехаў:
а) у сіле волі; б) у моцным здароўі; в) у разумовых здольнасьцях?

19. У чым прычына ўсіх няўдачаў:
а) у неабдуманасьці ўчынкаў; б) у самаўпэўненасьці; в) у глупстве?

20. Кім бы Вы жадалі бачыць Вашае дарослае дзіця:
а) добрым чалавекам і сябрам; б) цудоўным спэцыялістам; в) знакамітасьцю?

21. Чаго Вы найбольш баіцёся ў жыцьці Вашага дарослага дзіцяці:
а) цяжкай хваробы; б) саўдзелу ў злачынстве; в) няўдалага асабістага жыцьця?

22. У чым, на Ваш погляд, заключаецца ўменьне пастаяць за сябе:
а) у самавалоданьні; б) у пачуцьці гумару; в) у фізычнай моцы?

23. Што найцяжэй выхаваць:
а) чуйнасьць; б) працалюбства; в) прыстойнасьць?

24. Якая якасьць ёсьць самай галоўнай для бацькоў?
а) самавалоданье; б) уменьне ва ўсім бачыць сьмешнае; в) уменьне разумець праблемы сваіх дзяцей?

25. Ці лічыце Вы, што матэрыяльны дабрабыт — самае галоўнае ў жыцьці:
а) не; б) баюся, што ў сучасным жыцьці — так; в) канешне, так?

26. Які, на Вашу думку, зь пералічаных прадметаў самы неабходны для юнака:
а) зброя (рыбалоўныя прынады, матацыкаль); б) стэрэамагнітафон; в) супэрмодны швэтэр?

27. Які падарунак ад сына-школьніка Вам даражэй за ўсё:
а) зроблены ўласнымі рукамі ўслончык; б) букет цудоўных ружаў; в) дарагі падарунак, куплены на сэканомленыя грошы?

28. Ці лічыце Вы, што Ваш сын "пайшоў ня ў Вас":
а) людзей безь недахопаў не бывае; у мяне — свае, у яго — свае; б) зрэдку мне гэта здаецца; в) так, я такім ня быў?

29. Ці часта Вы навязваеце свайму дзіцяці свой пункт гледзішча:
а) імкнуся гэтага не рабіць увогуле; б) зрэдку, калі гэта неабходна; в) канешне, толькі называюць гэта не "навязваць свой пункт гледзішча", а "настаўляць на сапраўдны шлях"?

30. Вы лічыце сябе ідэальнымі бацькамі:
а) ідэальных бацькоў не бывае, як і не бывае ідэальных людзей; б) не лічу; в) канешне, я ж не шкадую для майго дзіцяці ні часу, ні сілаў?

АЦАНІЦЕ ВЫНІКІ ПАВОДЛЕ НАСТУПНАЙ ШКАЛЫ.

За адказ варыянта "а" пастаўце сабе 1 бал, "б" — 2 балы, "в" — 3 балы. *Падсумуйце вынікі.*

30-35 балаў. Вы самі можаце даваць парады па выхаваньні дзяцей. Нам жа Вам параіць няма чаго. Вашае пакліканьне — быць пэдагогам.

36-40 балаў. У асноўным Вы ўсё робіце правільна, аднак не забывайцеся, што нэрвы — кепскі дапаможнік у выхаваньні.

41-55 балаў. Вам варта перагледзець свае погляды на сябе і Вашае дзіця. Хаця б зрэдку прыгадвайце сябе ў ягоным узросьце!

56-65 балаў. Вы часта бываеце несправядлівым. Дзіўная рэч: Вы змудрыліся пабачыць розьніцу паміж словамі "чалавек" і "дзіця"!

66-90 балаў. Вам варта было б сур'ёзна задумацца, перш чым заводзіць дзіця, бо ад гэтага Вашага кроку ніхто ня стаў больш шчасьлівым!

Верагодна, у гэтым тэсьце немалая доля жарту. Аднак ва ўсякім жарце, як кажуць, ёсьць намёк...

ТЭСТ

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 — 23):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на кампутары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру зонятасьці насельніцтва (ІНФ. №1- 9); Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1-28).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-24); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 29).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб вырасла рэпа вялікая...(ІНФ. №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Соньнік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share": Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пыркі шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24); Гарэлка: Чаго баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ.№26); Фарбуем вопратку і тканіну (ІНФ.№26); Калі я памяняю батарэйкі (ІНФ.№27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ.№28).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Апэрацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя отруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домок. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

Прэс-рэліз. Сьвет за тыдзень (ІНФ.№28).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-27).

За мяжою: Хто такія ньюёрцы; Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

Беларусь і сьвет: Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

Псыхалёгія: Сцэнар чалавечага жыцьця пішацца яшчэ ў дзяцінстве (ІНФ. №24); Калі Ён купаецца, усе павінны залезьці ў ваду і пляскацца (ІНФ. №24).

Чалавек: Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць; Дзёньнік без канца. Г.Матусевіч. Тэст: самая простая памяць (ІНФ. №27)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары.

Грамафон: Новыя вершы нашых чытачоў



- Аддай мне мае 90 цэнтаў і мяне не цікавіць, што ты пакладзеш пад маю елку.

Умоўныя знакі на вырабах



ПРЫБЛІЗНАЯ ВАГА РОЗНЫХ ВІДАЎ БЯЛІЗНЫ

НАЗВА ВЫРАБУ	МАСА,Г
Прасьціна	400-500
Навалка	200
Махровы ручнік	350
Тонкі ручнік	150-200
Апокрыўка да коўдры	650
Абрус	600
Мужчынская кашуля	300
Дзіцячая кашуля	200
Мужчынская сакалка	150
Насоўка	25
Тканевая коўдра	1300

Спосабы распазнаваньня валокнаў, з каторых выкананая тканіна (выраб)

Валакно	*Воўна*
Паверхня	*Рыхлая, шарахаватая, матавая*
Зьмяцьце ў месцы перагнуцьця	*Зьмінаецца*
Характар гарэньня і выгляд абвугленага валакна	*Цалкам згарае, попел рассыпаецца, попел сьветла-шэрага колеру*
Пах пры паленьні	*Паленай паперы*

Баваўна. *Рыхлая, шарахаватая, пушыстая, матавая. Не зьмінаецца. Гарыць кепска з утварэньнем на канцы крохкага шарыку. Паленага рога.*

Натуральны ядваб. *Гладкая, бліскучая. Тое самае. Тое самае. Тое самае*

Ацэтатнае, трыацэтатнае *Тое самае. Зьмінаецца. Гарыць хутка з утварэньнем на канцы бурага шарыку; пры вынясеньні з полымя затухае. Воцату.*

Віскознае. *Тое самае. Тое самае. Цалкам згарае, попел рассыпаецца, попел сьветла-шэрага колеру. Паленай паперы.*

Поліаміднае (капрон). *Тое самае. Не зьмінаецца. Не гарыць, але плавіцца з утварэньнем на канцы мяккага шарыку. Паху няма.*

Поліэтэрнае (лаўсан). *Гладкая, матавая. Тое самае. Плавіцца без гарэньня, з утварэньнем на канцы цьвёрдага шарыку. Тое самае.*

Поліакрылянітрыльнае (нітрон) *Рыхлая, шарахаватая, пушыстая, матавая. Сьпярша плавіцца і робіцца брунатнага колеру, затым гарыць копцячым полымем з утварэньнем на канцы цьвёрдага шарыку. Тое самае.*

З ГІСТОРЫІ САВЕЦКАГА ДЫСЭНТУ*

Хрушчоўская «адліга» пачатку 60-х, калі за «жалезную заслону» ў СССР упершыню трапіў сьвежы заходні вецер, хутка зьмянілася чарговым «ледніковым пэрыядам». На ўвесь сьвет грымнулі справы пісьменьнікаў-дысыдэнтаў — Даніэля і Сіняўскага. Суд над імі адбыўся ў 1966-м; яны атрымалі тэрміны ў лягерах суворага рэжыму «за антысавецкую агітацыю і прапаганду, распаўсюджаньне антысавецкай літаратуры».

Інтэлігенцыя, хапіўшы глыток «адлігі», скалыхнулася. Зьявіліся шматлікія лісты-пратэсты — у Вярхоўны Савет, ЦК КПСС, Прэзыдуюм XXIII зьезду. Шырока вядомы адзін зь іх, падпісаны савецкімі (у тым ліку й беларускімі) пісьменьнікамі. Ішлі пратэсты ад студэнтаў, мастакоў, работнікаў выдавецтваў, навукоўцаў. Суслаў запатрабаваў «разабрацца і пакарась». На «падпісантаў» пачалі заводзіць асабістыя справы, іх «прапрацоўвалі» на сходах, звальнялі з працы.

Група дысыдэнтаў-інтэлігентаў, куды ўвайшлі А.Гінзбург, Ю.Галанскоў, А.Дабравольскі, В.Лашкова, выбрала іншы шлях — замест лістоў-прашэньняў пачалі зьбіраць матэрыялы працэсу: ня толькі пратаколы, але й меркаваньні пра суд, інтэрвію, вершы, нават показкі. Усё гэта ўвайшло ў «Белую кнігу», якая была перапраўленая за мяжу. Стваральнікаў кнігі арыштавалі і судзілі.

Іх арышт, у сваю чаргу, нарадзіў паток лістоў-пратэстаў і зваротаў. Праваахоўчыя органы пачалі бязьлітасную апрацоўку іншадумцаў: сачэньне, ператрусы, выклікі ў пракуратуру й г.д. Актыўна цкавалі іх і газэты. Палітбюро ЦК двойчы абмяркоўвала сытуацыю і даручыла В.Грышыну «разабрацца і спыніць».

У гэтых абставінах і зьявілася запіска-данос. Ю.Андропаў, старшыня КГБ, мог сам накіраваць яе «наверх». Але характэрна, што такога роду палітычныя дакумэнты ён імкнуўся ніколі не падпісваць аднаасобна. Са свайго боку, В.Грышын таксама імкнуўся надаць запісцы законную форму, атрымаўшы подпіс Генэральнага пракурора краіны Р.Рудэнкі. Пазначаны й той, на загады якога арыштоўвалі і прыходзілі зь ператрусам — міністар унутраных справаў СССР М.Шчолакаў.

Зусім сакрэтна

ЦК КПСС

У апошнія месяцы прапагандысцкія цэнтры імпэрыялістычных дзяржаваў актыўна выкарыстоўваюць у сваёй антысавецкай дзейнасьці судовы працэс у справе ГІНЗБУРГА, ГАЛАНСКОВА, ДАБРАВОЛЬСКАГА і ЛАШКОВАЙ. Рэакцыя буржуазнага Захаду на гэты працэс вылілася ў адкрыты паклёп на савецкі дзяржаўны і грамадзкі лад, у імкненьні арганізаваць кампанію супраць СССР як дзяржавы, у якой нібыта адсутнічаюць дэмакратычныя свабоды.

Непасрэдную дапамогу супраціўніку ў распальваньні варожай кампаніі чыняць сваімі дзеяньнямі ГРЫГАРЭНКА, ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН, ЯКІР, ЛІТВІНАЎ і БАГАРАЗ-БРУХМАН, якія фактычна пайшлі на супрацоўніцтва з Захадам.

Выступаючы ў ролі памагатых найбольш рэакцыйнай часткі прадстаўнікоў буржуазнай прэсы і радыё, яны сыстэматычна забясьпечваюць іх паклёпніцкімі матэрыяламі, спрабуюць праводзіць прыватным парадкам прэсавыя канфэрэнцыі для іншаземцаў; падбухторваюць антыграмадзкія элемэнты да палітычна шкоднай дзейнасьці, інсьпіруюць выраб і распаўсюджаньне варожых паводле свайго зьместу лістоў, заяваў, «пратэстаў», правакацыйна вядуць сябе ў дачыненьні да органаў улады.

ГРЫГАРЭНКА П.Г., 1907 году нараджэньня, украінец, былы член КПСС (выключаны ў 1964 годзе), былы генэрал-маёр Савецкай Арміі, майстар аддзелу забесьпячэньня БУ-20 Масбуду-4. У 1963 годзе ад імя выдуманага «Саюзу барацьбы за адраджэньне ленінізму» вырабіў і распаўсюдзіў антысавецкія ўлёткі, за што пастановай суда як псыхічна хворы накіроўваўся на прымусовае лячэньне. У 1966 годзе ўзяў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы «мітынгу памяці ахвяраў сталінізму». У пэрыяд судовага працэсу ў справе ГІНЗБУРГА і іншых сваімі правакацыйнымі паводзінамі ў будынку суда спрыяў паклёпніцкаму асьвятленьню працэсу замежнымі журналістамі. У 1968 годзе склаў і імкнуўся накіраваць дакумэнт варожага зьместу ўдзельнікам Кансультацыйнай нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партыяў у Будапэшце.

ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН А.С., 1924 году нараджэньня, габрай, беспартыйны, кандыдат фізычна-матэматычных навук, малодшы навуковы супрацоўнік Усесаюзнага інстытуту навуковай і тэхнічнай інфармацыі. У 1949 годзе арыштоўваўся па вінавачаньні ў правядзеньні антысавецкай прапаганды. У ходзе сьледзтва быў прызнаны непрытомным і накіраваны на прымусовае лячэньне. У 1959 годзе зноў быў арыштаваны за антысавецкую дзейнасьць і накіраваны на прымусовае лячэньне. У 1965 годзе прымаў удзел у «мітынгу галоснасьці» на плошчы Пушкіна. На працягу 1965-1967 гадоў сыстэматычна сустракаўся з іншаземцамі... Арыштаваны ў студзені 1967 года грамадзянін ФРГ эмісар НТС ШАФХАЎЗЭР меў заданьне перадаць ВОЛЬПІНУ-ЯСЕНІНУ два інструктыўныя лісты і антысавецкую літаратуру. Пад час судовага працэсу ў справе ГІНЗБУРГА і іншых быў арганізатарам зборышчаў каля будынка суда, удзельнічаў у складаньні правакацыйных зваротаў, частку зь якіх перадаў заходнім карэспандэнтам.

ЯКІР П.І., 1923 году нараджэньня, габрай, беспартыйны, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытуту гісторыі АН СССР, зьяўляецца адным з асноўных арганізатараў акцыяў падбухторваньня, якія праводзіліся пад сьцягам «барацьбы з наступствамі культу асобы». Прымаў удзел у распаўсюджаньні ўлётак палітычна варожага зьместу паз назвай «Грамадзянскі зварот», праводзіў збор подпісаў пад лістом дзяцей рэпрэсаваных.

ЛІТВІНАЎ П.М., 1940 году нараджэньня, расеец, беспартыйны, працаваў выкладчыкам Маскоўскага інстытуту тонкай хімічнай тэхналёгіі, звольнены ў студзені сёлета за парушэньне працоўнай дысцыпліны. Актыўна ўдзельнічаў у розных антыграмадзкіх акцыях. У пэрыяд сьледзтва і суда ў справе ГІНЗБУРГА і іншых вёў апрацоўку сьведкаў і дабіваўся ад іх паказаньняў на карысьць абвінавачаных. Сумесна з БАГАРАЗ-БРУХМАН склаў паклёпны зварот «Да сусьветнай грамадзкасьці» і разам зь іншымі правакацыйнымі матэрыяламі перапраўіў яго за мяжу. У цяперашні час зьбірае матэрыял для паклёпнага рукапісу пад умоўнай назвай «Белая кніга-2».

БАГАРАЗ-БРУХМАН, Л.І., 1929 году нараджэньня, габрайка, беспартыйная, кандыдат філялягічных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытуту тэхнічнай інфармацыі, клясыфікацыі і кадаваньня Камітэту стандартаў. Сыстэматычна выступае ў якасьці аўтара-распаўсюдніка палітычна шкодных рукапісаў «Аб адной паездцы» і «Мае паказаньні», зваротаў да дзеячоў навукі і культуры ў абарону ДАНІЭЛЯ і да «Сусьветнай грамадзкасьці» ў справе ГІНЗБУРГА і іншых. Неаднаразова забясьпечвала іншаземцаў паклёпнай інфармацыяй.

Органамі пракуратуры і дзяржбясьпекі з ГРЫГАРЭНКАМ, ВОЛЬПІНЫМ-ЯСЕНІНЫМ, ЯКІРАМ, ЛІТВІНАВЫМ і БАГАРАЗ-БРУХМАН неаднаразова праводзіліся папераджальныя гутаркі, аднак усё гэта ніякага дзеяньня на іх не аказала. Больш таго, ужо пасьля папярэджаньняў ЯКІР прыняў актыўны ўдзел у вырабе, пашырэньні ў СССР і перадачы на Захад новага правакацыйнага звароту «Да дзеячоў навукі, культуры і мастацтва СССР», у якім сьцьвярджаецца пра адсутнасьць у Савецкім Саюзе палітычных свабодаў, узводзіцца паклёп на дзейнасьць партыйнага і дзяржаўнага апарату, зьмяшчаецца зварот да грамадзкасьці выступіць за перагляд лініі партыі.

Аўтары «Звароту», характарызуючы савецкую рэчаіснасьць, указваюць: «На працягу некалькіх гадоў у нашым грамадзкім жыцьці пазначаюцца злавесныя сымптомы рэстаўрацыі сталінізму. Найбольш ярка выяўляецца гэта ў паўторы самых страшных дзеяньняў гэтай эпохі — у арганізацыі жорсткіх працэсаў над людзьмі, якія адважыліся адстойваць сваю годнасьць і ўнутраную свабоду, паспрабавалі думаць і пратэставаць... Бесчалавечныя расправы над інтэлігентамі — гэта лягічнае завяршэньне атмасфэры грамадзкага жыцьця некалькіх апошніх гадоў. Наіўным надзеям на поўнае аздараўленьне грамадзкага жыцьця, уселеным у нас рашэньнямі XX і XXII зьездаў, не ўдалося збыцца... Ні адзін з дэмакратычных пачаткаў не даведзены да канца... У грамадзкіх навуках працягвае накідацца згубны і незваротны дыктат кан'юнктуры».

«Зварот» сканчаецца правакацыйным заклікам да дзеячоў навукі, культуры і мастацтва «падняць свой голас супраць наступу небясьпекі новых сталіных і яжовых... Вы пастаўленыя ў такія ўмовы, што выкананьне свайго грамадзянскага абавязку — кожны раз акт мужнасьці. Але ж выбару таксама няма — альбо мужнасьць, альбо баязьлівы саўдзел у брудных справах...»

Становіцца відавочным імкненьне пададзеных асобаў надаць сваёй антыграмадзкай дзейнасьці шырокі размах, уцягнуць у яе дзеячоў навукі, культуры і мастацтва і знайсьці арганізацыйныя формы гэтага «руху». У адным з варыянтаў «звароту», атрыманага апэратыўным шляхам, гаворыцца: «Мы заклікаем вас да стварэньня аўтарытэтнай грамадзкай арганізацыі, якая зможа, мінаючы бюракратычны апарат, уступаць у непасрэдныя дачыненьні з урадам, абараняючы правы, свабоду, жыцьцё, годнасьць людзей, баронячы краіну ад магчымасьці адраджэньня сталінізму у любой форме».

Паклёпны «зварот» і лісты ГРЫГАРЭНКІ, ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, перададзеныя замежнымі радыёстанцыямі, сталі вядомымі варожа настроеным асобам у Савецкім Саюзе і ўспрымаюцца імі як сьведчаньне актыўнай палітычнай барацьбы. Кватэры ГРЫГАРЭНКІ, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, прыцягваюць да сябе рознага кшталту антысаветчыкаў, якія спэцыяльна прыяжджаюць у Маскву для абмеркаваньня зь імі плянаў далейшых правакацыйных выступаў.

У гутарках з асобнымі зь іх ЛІТВІНАЎ дапушчае антысавецкія заявы: «... Цяпер ставіць пытаньне аб сыстэме (маецца на ўвазе дзяржаўны і грамадзкі лад СССР) рана... Няхай улада трымаецца на штыхах, але ж народ яе прыняў. Яна штосьці дае, узровень крыху павышаецца... Тое, што мы робім не палітычная барацьба, гэта барацьба за магчымасьць палітычнай барацьбы... Пытаньне пра сыстэму можна ставіць у размове, але шырока яго ня ставім. Пакуль рана».

ГРЫГАРЭНКА, ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН, ЯКІР, ЛІТВІНАЎ і БАГАРАЗ-БРУХМАН упэўненыя ў антысавецкім характары сваёй дзейнасьці, але спыняць яе не зьбіраюцца, бо, як яны кажуць, упэўненыя, што ў цяперашні час да іх ня будуць ужытыя меры пакараньня. У гутарцы зь Якірам адзін зь яго аднадумцаў проста заявіў: «Яны ні цябе, ні Паўліка (ЛІТВІНАЎ) не пасьмеюць пасадзіць, таму што на Захадзе гучыць: сын і ўнук...»

Такім чынам, паводзіны гэтай групы людзей набываюць усё больш дзёрзкі характар, а беспакаранасьць іх дзейнасьці выклікае ў многіх савецкіх грамадзянаў неразуменьне.

Пракуратура СССР, Камітэт дзяржбясьпекі і Міністэрства аховы грамадзкага парадку ва ўчынках ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН знаходзяць склад злачынства, прадугледжанага арт. 190 1 КК РСФСР (пашырэньне заведама ілжывых меркаваньняў, якія ганьбяць Савецкі дзяржаўны і грамадзкі лад). Аднак прыцягваць іх да крымінальнай адказнасьці ў цяперашні час, на нашую думку, немэтазгодна, бо гэтая мера можа выклікаць новую хвалю дэмагагічных патрабаваньняў з боку антыграмадзкіх элемэнтаў унутры краіны і падбухторных дзеяньняў буржуазнай прапаганды.

У зьвязку з гэтым выносім наступныя прапановы:

— даручыць пракурору горада Масквы ўзбудзіць у адносінах да ГРЫГАРЭНКІ крымінальную справу па арт. 190 1 КК РСФСР, падвергнуць яго арышту і накіраваць яго на судова-мэдычную экспэртызу. У залежнасьці ад вынікаў экспэртызы вырашыць пытаньне пра перадачу ГРЫГАРЭНКІ ў суд альбо пра накіраваньне яго на прымусовае лячэньне;

— дазволіць ВОЛЬПІНУ-ЯСЕНІНУ выехаць у ЗША для ўдзелу ў рабоце сымпозіюму па матэматычным аналізе (афіцыйнае запрашэньне з ЗША у яго ёсьць. У тым выпадку, калі ВОЛЬПІН-ЯСЕНІН пад час знаходжаньня ў ЗША скампрамэтуе сябе нявартымі паводзінамі, разгледзець пытаньне аб пазбаўленьні ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА савецкага грамадзянства і закрыцьці яму ўезду ў СССР;

— ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН выклікаць у Пракуратуру СССР і ў катэгарычнай форме запатрабаваць неадкладнага спыненьня антыграмадзкай дзейнасьці. Папярэдзіць ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, што ў адваротным выпадку яны будуць пазбаўленыя прапіскі і выдаленыя з Масквы.

У зьвязку з гэтым лічым неабходным унесьці дапаўненьні ў Пастанову Савета Міністраў СССР ад 15 жніўня 1966 году №658-211 «Аб умацаваньні пашпартнага рэжыму ў гарадах Маскве, Ленінградзе і Маскоўскай вобласьці» (праект дадаецца);

— даручыць Массавету (калі папярэджаньне не падзейнічае) на падставе дапаўненьня да ўказанай Пастановы Савета Міністраў СССР прыняць рашэньне аб пазбаўленьні ЯКІРА, ЛІТВІНАВА маскоўскай прапіскі тэрмінам на 2 гады;

— даручыць Міністэрству аховы грамадзкага парадку выдаліць ЯКІРА і ЛІТВІНАВА з Масквы, вызначаўшы месца жыхарства ЯКІРУ ў Цюменьскай вобласьці, ЛІТВІНАВУ ў Гур'еўскай вобласьці Казахскай ССР;

— пытаньне аб пазбаўленьні прапіскі і выгнаньні з Масквы БАГАРАЗ-БРУХМАН разгледзець дадаткова ў залежнасьці ад яе паводзінаў пасьля прымяненьня ўказаных санкцыяў у дачыненьні да ЯКІРА і ЛІТВІНАВА;

— падрыхтаваць і апублікаваць у газэце «Советская Россия» ў дзень ажыцьцяўленьня санкцыяў у дачыненьні да ГРЫГАРЭНКІ, ВОЛЬПІНА-ЯСЕНІНА, ЯКІРА, ЛІТВІНАВА і БАГАРАЗ-БРУХМАН, паведамленьня па гэтым пытаньні.

АНДРОПАЎ ГРЫШЫН РУДЭНКА ШЧОЛАКАЎ

3 красавіка 1968 году №731-а

Адпраўлена Камітэтам Дзяржбясьпекі пры СМ СССР

Падрыхтаваў Ігар Кузьняцоў

** Дысэнт — сукупнасьць праяваў дысыдэнцкай актыўнасьці.*

Kalandar

KALANDAR

2 śniežnia

U hety dzień... u 1805 h. Napaleon adznačyŭ hadavinu svajoj karanacyi źniščalnaju pieramohaj nad abjadnanymi rasiejska-aŭstryjackimi vojskami pad Austerlitz (siońnia Slaŭkaŭ pad Brnom u Čechii). Hetuju bataliju nazyvajuć jašče «bitvaj troch imperataraŭ».

U 1859 h. u Charlestown u Virginii byŭ paviešany John Brown, amerykanski zmahar suprać rabstva.

Naradzilisia: biełaruski mahnat Januš Radzivił (1612); dr Jozeph Bell (1837-1911), edynburski lekar, jaki staŭ pravobrazam Sherlocka Holmesa — heroja detektyŭnych apovieściaŭ Arthura Connan Doyle; dziajač biełaruskaha adradženskaha ruchu Feliks Stackievič (1879); biełaruski kampazytar Mikoła Ravienski (1886); saviecki maršał Gieorgij Žukov (1896-1974); Peter Carl Goldmark (1906-77), narodžany ŭ Vuhorščynie vynachodnik kalarovaha telebačańnia; hreckaja opernaja śpiavačka Maria Callas (1923-77).

3 śniežnia

U hety dzień... u 1967 h. u Cape Town dr Cristian Barnard zrabiŭ pieršuju ŭ historyi pierasadku serca.

U 1913 h. pamior biskup Stafan Danisievič, pačynalnik adradžeńnia biełaruskaj movy ŭ kaściole.

4 śniežnia

U hety dzień... u 1942 h. fašysty zakatavali Vieru Charužuju.

Naradzilisia: rasiejski mastak Vasilij Kandinsky (1866-1944); niamiecki paet Rainer Maria Rilke (1875-1926); heneral Francisco Franco (1892-1975), fašyscki dyktatar u Hišpanii.

5 śniežnia

U hety dzień... u 1791 h. u Vienie pamior Wolfgang Amadeus Mozart (jamu było tryccać piać hadoŭ) i byŭ pachavany ŭ bratniaj mahile dla žabrakoŭ.

U 1917 h. u Miensku pačaŭsia Pieršy Ŭsiebiełaruski Kanhres.

Naradzilisia: maršał Juzef Piłsudzki (1867-1935); Walter Elias Disney (1901-66), amerykanski multyplikatar; hišpanski tenar Jose Carreras (1946) i biełaruski paet Aleś Razanaŭ.

6 śniežnia

U hety dzień... u 1877 h. amerykanski vynachodnik Thomas Alva Edison zrabiŭ pieršy ŭ historyi hukavy zapis.

Naradziłasia kniazioŭna Barbara Radzivił (1520-1555), kachanka karala Žyhimonta Aŭhusta — ichni šlub vyklikaŭ usieahulnaje abureńnie.

7 śniežnia

U hety dzień... u 1941 h. ataka japoncaŭ na Pearl Harbor na Havajskich Vyspach spravakavała ŭstupleńnie USA ŭ druhuju suśvietnuju vajnu.

8 śniežnia

U hety dzień... naradziŭsia finski kampazytar Jean Sibelius (1865-1957).

Сяржук Сокалаў

ШТО ТАКОЕ ДОБРА І ШТО ТАКОЕ БЛАГА

Матыў Маякоўскага

Сын да бацькі акурат
Падыйшоў з увагай:
— Што такое добра, тата?
Што такое — блага?

— Тут няма чаго хаваць, —
Кажа бацька сьмела,
— Добра сьцяг свой шанаваць
Бел-чырвона-белы.

Калі ж нейкі чалавек
Не шануе сьцяга,
Гэта — ганьба, брат, на век,
Гэта — вельмі блага.

Добра молат мець і серп
Дзеля кузьні й гоняў,
Добра мець у сэрцы герб:
Вечную «Пагоню».

Блага ж — месцамі мяняць
Герб з прыладай працы,
Бо тады нам век канаць
І людзьмі ня звацца.

Зразумела без размоў,
Сынку, любы дружа,
Ведаць шмат замежных моў
— Гэта добра дужа.

А пусьціць сваю на згін
Ці прымаць варожа
— Гэта вельмі блага, сын,
Горш і быць ня можа.

Сын разважыў колькі хвіль
Ды ізноў да таты:
— Добры наш сусед Базыль
Зь цёткаю Агатай,

Вельмі добры дзед Вінцэнт,
Баба Беласлава,
Дрэнны толькі... прэзыдэнт
Нашае дзяржавы.

Чым належыць даражыць
— Зводзіць ён са сьвету.
Можа, тата, блага — жыць
У краіне гэтай?..

Бацька глянуў на дзіцё,
Прытуліў на грудзі:
— Не! Дабро — у забыцьцё...
Гэтак, сын, ня будзе!

Чмокнуў хлопца ў пульхны рот
І сьлязу заплюшчыў...
Адкапаў свой кулямёт,
Дый падаўся ў пушчу!

* * *

Ня плачу.
Не верашчу.
Каб нават на сьмерць закулі —
Расею ў сэрца пушчу
Толькі ў абліччы кулі.

* * *

Ні спрэчак, ні рыторык,
То — гвалт, то — валтузьня,
Калі сьвінар — гісторык,
Гісторыя — сьвіньня.

Калі сьвінар — гістэрык,
Гістэрыка — закон,
Дзе б'юць вяпроў бязь меры
На сала ці бэкон.

Калі ж сьвінар — палітык
(Бывае і такі),
То ў статку сьвецкіх сьвітак —
Кныры і парсюкі.

Прызнаны майстра плёткі
І гучнага «Аюсь!»
Ён з собскай загародкі
Сьвінячыць Беларусь.

Ды ў шале самаўладзьдзя,
Тэрору і маны,
Хляўчук з краіны ладзіць
У выглядзе труны.

Мігель Анхель Астурыас

ПАН ПРЭЗЫДЭНТ

Урывак з раману

...Зямля і неба поўныя славы Тваёй, Пане. Прэзыдэнт далёка ад людзей, далёка-далёка, сярод набліжаных да сябе асобаў. Але ён задаволены народам, які адказвае яму ўдзячнасьцю за штодзённы клопат.

Зямля і неба поўныя славы Тваёй, Пане! Дамы адчуваюць набліжэньне пестуна багоў. Тлустыя сьвятары кадзяць яму духмянасьці. Законьнікі ў марах перанесьліся на турнір Альфонса Мудрага. Выпрасталіся дыпляматы, кавалеры ўсіх магчымых ордэнаў, уявіўшы сябе ў Вэрсалі часоў караля-Сонца. Аблізваюцца свае і замежныя журналісты, бачачы ўваскрэслага Пэрыкла. Зямля і неба поўныя славы Тваёй, Пане! Паэты лічаць, што яны ў Атэнах, і абвяшчаюць пра гэта ўсяму сьвету. Скульптар, што спэцыялізуецца на выявах сьвятых, пачуваецца Фідыем; ён усьміхаецца, задзірае нос, паціраe рукі, слухаючы, як народ вітае свайго вялікага ўладара. Зямля і неба поўныя славы Тваёй, Пане! Кампазытар, аўтар шматлікіх жалобных маршаў, сябра Бахуса і сьвятога пахаваньня, уважліва, старанна ўзіраецца з гаўбца, апусьціўшы долу сваё таматнае хайло — і дзе там тая зямля?

Але калі служкі багоў мастанцтваў уяўляюць, што іх раптам занесла ў Атэны, дык жыдам-банкірам здаецца, што яны апынуліся ў Картагене, калі яны ўваходзяць у палац дзяржаўнага дзеяча, які спавіў іх ласкай свайго даверу і ўклаў у іхныя касы народныя грошы пад нуль працэнтаў, што дало ім магчымасьць узбагаціцца і ператварыць злота і срэбра ў шматкі абразаньня.

Зямля і неба поўныя славай Тваёй, Пане!

Кара дэ Анхель ледзьве праціснуўся праз натоўп запрошаных (ён быў харошы і падступны, як сатана).

— Народ патрабуе Вас, Пане Прэзыдэнце!

— ... народ?

Гаспадар паставіў пытальнік за гэтым словам. Усе маўчалі. Зь лютасьцю скінуўшы цяжар раптоўнае жалобы (што адразу ж бліснула ў ягоных вачах), гаспадар узьняўся і выйшаў на гаўбец.

Перад народам ён узьнік у суправаджэньні набліжаных. Дакладней, ён узьнік перад натоўпам жанчын, якія прыйшлі вітаць яго з нагоды ўгодкаў выратаваньня. Тая, што мелася казаць прамову, зараз жа пачала:



Мігель Анхель Астурыас — гватэмальскі пісьменьнік (1899-1974), Нобэлеўскі ляўрэат, аўтар раманаў «Маісавыя людзі», «Моцны вецер», «Вочы пахаваных». Раман «Пан Прэзыдэнт» напісаны ў 1922-32 г. Значную частку жыцьця Астурыас правёў у эміграцыі. У Аргентыне быў арыштаваны, сядзеў у турме.

— О, сыне народу!..

Гаспадар каўтнуў горкую сьліну. Мабыць, яму ўзгадаліся гады навучаньня, бедны мацярынскі дом, мястэчка, забрукаванае добрымі намерамі. Але фаварыт, які ўсюды пасьпее, шапнуў:

— Сын народу — як Ісус...

— О-о-о, сын народу! — паўтарыла аратарка. — Народу, я кажу! Сонца зьзяе на небе, бласлаўляючы тваё бясцэннае жыцьцё, і сьведчыць, што нябеснае сьвятло заўсёды перамагала змрочную цемрадзь, цемрадзь чорнае начы, што выкарміла злачынныя рукі, якія замест таго, каб сеяць збожжа, як ты, Пане, вучыш нас, пасеялі на тваім шляху гнюсную бомбу, якая, нягледзячы на ўсе хітрамудрыя эўрапейскія закавыкі, на нашае вялікае шчасьце, не зашкодзіла тваіму бясцэннаму здароўю.

Бурныя воплескі перапынілі лямант гандляркі, што выступала. Мянушка гэтай гандляркі была Цялячая Пыса.

— Няхай жыве Прэзыдэнт!

— Няхай жыве Пан Прэзыдэнт!

— Няхай жыве Пан Прэзыдэнт Рэспублікі!

— Няхай жыве Пан Канстытуцыйны Прэзыдэнт Рэспублікі!

— Няхай жыве цяпер і на вякі вякоў Пан Канстытуцыйны Прэзыдэнт Рэспублікі, Збаўца Бацькаўшчыны, Правадыр Вялікай Лібэральнай Партыі, Сапраўдны Лібэрал, Абаронца Моладзі.

— Чорнай ганьбаю ўкрыўся б гэты штандар, калі б злыя ворагі, выкармленыя гнюснымі апа-зы-цы-я-нэрамі Пана Прэзыдэнта, дасягнулі свае мэты. Аднак жа ня ведалі яны, што перст Божы заўсёдна ахоўвае ягонае бясцэннае жыцьцё з дапамогаю ўсіх тых, хто, памятаючы, што яго не дарма называюць Першым Грамадзянінам Нацыі, захінулі яго ў тыя жудасныя хвіліны і захінаюць, калі толькі ёсьць патрэба.

О так, шаноўныя! Сёньня мы ведаем лепш, чым калі-небудзь; што калі б іхнія пляны спраўдзіліся ў той сумны, сумны для ўсёй нашай краіны, што выступае на чале ўсіх цывылі... цыві-лі-заваных краёў, дзень, наша Бацькаўшчына асірацела б і апынулася б у гнюсных руках, што вострыць у цемры свае кінжалы, каб ударыць дэмакратыю ў самае сэрца, як сказаў вялікі трыбун, якога завуць Хуан Мантальва!

Дзеля ўсяго гэтага палахціць ва ўсёй славе сваёй наш сьцяг, і не пакінула наш герб слаўная птушка, што, быццам птушка фэ-лікс, адрадзілася з попелу гэтых правадыроў, што абвесцы... абвесьцілі на-цы-яналь-ную незалежнасьць Амэрыкі, не праліўшы, такім чынам, ніводнай кроплі крыві і задаволілі і-мкне-не да свабоды, якое аб-ве-сьці... абвесьцілі індзейскія правадыры, што змагаліся аж да самага скону за свабоду і за ўсялякія правы!

Вось жа, шаноўныя, мы сёньня прыйшлі вітаць нашага вялікага абаронцу не-за-бясь-печаных слаёў, што клапоціцца пра нас, як родны бацька, і вядзе нашу краіну, як я ўжо сказала, наперадзе прагрэсу, прагрэсу, якому Фултан паспрыяў сваім параплавам, які Хуан Санта Марыя збавіў ад гнюсных захопнікаў, падпаліўшы славуты порах у землях Лемпіры. Няхай жыве наша краіна! Няхай жыве Канстытуцыйны Прэзыдэнт Рэспублікі, Кіраўнік Лібэральнай партыі, Збаўца Бацькаўшчыны, Абаронца Дзяцей і Жанчын, і Алуканы!

Лямант Цялячае Пысы адгукнуўся пажарам вітальных крыкаў і згас у моры воплескаў.

Прэзыдэнт прамовіў некалькі фразаў, абапёршыся правай рукой на мармуровы парапэт гаўбца, напаўзвароту да натоўпу, прайшоўшыся позіркам па прадстаўніках народу на ўзроўні іхніх плячэй, хмурачы лоб і бліскаючы вачыма. Мужчыны і жанчыны выцiралі сьлёзы.

— Ці не вярнуцца нам у пакоі, Пане Прэзыдэнце? — наважыўся шапнуць Кара дэ Анхель, пачуўшы, што Прэзыдэнт зашморгаў носам. — Гэтыя людзі надта хвалююць Вас...

Прэзыдэнт у кампаніі найбліжэйшых сяброў увайшоў у залю. Вайсковы пракурор кінуўся да яго, каб паведаміць пра ўцёкі генэрала і першым павіншаваць з выдатнаю прамовай. Але ўсе астатнія таксама памкнуліся наперад. Пракурор спыніўся — невядомая сіла, дзіўная хвароба ўтрымала яго — і, каб не стаяць з працягнутай рукой, ён выраніў павітаньне з фаварытам.

Фаварыт адвярнуўся, пракурор усё яшчэ трымаў перад сабою руку, і раптам ён пачуў грукат, страшэнны грукат, падобны на кананаду. Крыкі людзей. Бягуць, скачуць, перакідваюць крэслы. Дамы ў гістэрыцы. Жаўнеры зараджаюць вінтоўкі, не бязь цяжкасьці расшпіліўшы падсумкі. Кулямёты, раструшчаныя люстры, афіцэры, гарматы...

Нейкі палкоўнік зьнік на верхняй пляцоўцы, размахваючы рэвальвэрам, другі спускаўся па вінтавых усходах, размахваючы рэвальвэрам. Няма ні халеры. Капітан узьлез у вакно, размахваючы рэвальвэрам. Іншы, размахваючы рэвальвэрам, распахнуў дзьверы. Не, ні халеры. Няма ні халеры? Але халодна было ў пакоях. Вестка ляцела праз вэрхал у залях. Няма ні халеры. Патроху супыніліся запрошаныя: хтосьці

Ральф Ламбрэглія


А ЦІ ГЭТА

Калі я бяру найлепшыя ўзоры сур'ёзных лічбавых мультымэдыя, паказваю іх каму-небудзь з творчых людзей, а пасьля пытаюся: «А ці гэта мастацтва?», — то я ўжо загадзя ведаю, што адказ будзе: «Не». Калі ж адказ бывае: «Не, не зусім», — то гэта ўжо дае надзею. Але я ўпэўнены, што калі-небудзь я ў адказ пачую: «Так». Асабіста я маю веру, што новыя сродкі выражэньня думак і пачуцьцяў народзяць абсалютна новы від мастацтва, але ж я таксама ўсьведамляю, што тэхналёгіі, якія даюць гэтыя новыя магчымасьці, самі знаходзяцца ў немаўлячым стане. Некаторыя з тых экспэрымэнтаў, якія я зьбіраюся разглядзець у будучыні, можа, і не дацягваюць да таго, каб называцца мастацтвам, але яны, тым ня менш, — істотныя інструмэнты мастака.

Многія людзі не падтрымліваюць маёй веры. Калі яшчэ ў 1980 г. я быў студэнтам і вывучаў творчыя прыёмы літаратурнай працы (задоўга да таго, як пэрсанальныя кампутары сталі агульнадаступнымі), адзін з маіх аднакурсьнікаў, паэт, любіў сьцьвярджаць, што сапраўдная мастацкая веліч у наш час немагчымая. Гэты паэт казаў, што незалежна ад моцы індывідуальнага таленту наш хуткаплынны час ня можа забясьпечыць мастаку тых творчых азарэньняў, якія наведвалі ягоных калегаў у больш зьместоўныя гістарычныя эпохі. Мой прыяцель лічыў, што мы, сучасныя людзі, — вельмі маленькія стварэньні, што жывуць у нейстотны час, надзеленыя ўладай і сілай, адно каб сказаць нешта малое і нязначнае. Прыяцелевым улюбёным выслоўем, якое ён вымаўляў з саманадзейнай урачыстасьцю і паказным трагізмам, было: «Не, цяпер не Залаты Век!»

Мяне, увогуле, мала турбуе, што я тады адчуваў ці што адказваў свайму сябру-пэсымісту. Мне здаецца, што тады я прымаў позу самаапраўданьня і самаабароны. Бо тады я лічыў сябе інтэлігентным, таленавітым чалавекам — чалавекам, які наважыў стаць вялікім мастаком. Як бачыце, ужо той факт, што цяпер я ўзяўся пісаць гэтыя радкі, толькі даказвае маё жаданьне адстаяць гэтую пазыцыю. Беручы пад увагу ўсе тыя ўражальныя інтэлектуальныя і тэхналягічныя дасягненьні ў галіне лічбавай інфармацыі, нанатэхналёгіяў, біятэхналёгіяў, дасьледаваньняў акіяну і космасу і г.д., сьведкамі якіх мы сёньня зьяўляемся, я без усялякага сумневу магу заявіць, што мы жывем у сапраўдны Залаты Век.

Але ў той жа самы час мы ўсе — сьведкі нябачаных дагэтуль праяваў дурасьці, страху, нянавісьці і жорсткасьці. Калі хтосьці лічыць, што вокамгненныя плянэтарныя мультымэдыйныя камунікацыі здольныя



Малюнак Сяргея Харэўскага

зь пераляку намачыў штаны, хтосьці згубіў пальчатку, твар адных зноў стаў звыклага колеру — але яны не маглі адкрыць рот, іншыя маглі гаварыць, але ўсё яшчэ стаялі зьбялеўшы. І ніхто ня ведаў, куды і калі падзеўся Прэзыдэнт.

А проста — на ніжняй прыступцы адной зь лесьвіц ляжаў вялікі барабан. Калі ён з грукатам пакаціўся ўніз — усе і кінуліся хавацца: ратуйся, хто можа.

Пераклаў з гішпанскай
Андрэй Дынько

Адам Глёбус

Ганіцелька

Апавяданьне

«У маёй душы няма злосьці», — мужчына паўтараў мэдытацыйны сказ у розных станах, разнастайнымі інтанацыямі, уголас і пра сябе столькі разоў, пакуль не адчуў, што злосьць нарэшце пакінула душу. Толькі новы стан не дадаў радасьці. Ідучы па праспэкце, мужчына знайшоў выраз для ачышчэньня: «У маёй душы няма смутку». Узрадаваны, ён наведаў букіністычную краму — цемнаватую, пыльную, поўную танных кніжак і пастарэлых прадаўшчыц, якіх ведаў зь дзяцінства. Ніводнае выданьне яго не зацікавіла. Адно незанавешанае вакно крышку разьвеяла сум. Нават не само чысьцюткае вакно, а краявід за ім: двор, засаджаны вербамі, арэлі-гушкалка і лімонная лаўка.

Паўтараючы запаветны сказ: «У маёй душы няма смутку», — мужчына даволі далёка алышоў ад букініста, але выгляд жоўтай лаўкі пад нахіленай вярбою ніяк не выходзіў з галавы. Ён вярнуўся. Двор стаў пусты, чыста вымецены, ціхі. Раптам з праспэкту праз выгбу ў двор заляцела двое сямі-васьмігадовых дзяцей. Хлопчык уцякаў, дзяўчынка даганяла. Дзеці шумна пераляцелі двор. Уцякач схаваўся за пад'езнымі дзьвярыма, а задыханая Ганіцелька села побач з мужчынам.

— Думаеце, я не змагла яго дагнаць? — Ганіцелька цікавала рэакцыю. Яна была падобная да акуратнай лясной жабкі: лупаценькая, смуглявая, шырокая.

— Ня ведаю.

— Магла і хацела ўдарыць і пабіць, але енку было б на ўвесь горад, з пад'езду выскачыў бы ягоны старэйшы брат. Удваіх яны мацнейшыя.

— Ты разумна зрабіла, біцца ня трэба. У чалавека не павінна ў душы кіпець злосьць.

На Ганіцельцы спраўна сядзелі: белая куртка, сінія нагавіцы й чорныя красоўкі. Яна па-мужчынску трымала рукі на каленях.

— Ці можаце Вы паверыць, што старэйшы брат гэтага хлопца, за якім я гналася, адразу пайшоў ня ў першую, а ў трэцюю клясу?

— Цяжка верыцца. Гэта тое самае, як пераканаць сябе, што ў душы няма смутку.

— І я сумняваюся. Гэта я пайшла адразу ў трэцюю клясу; а ён, як дазнаўся, прыдумаў гісторыю з разумным братам. Проста, праўда?

— Здагадацца нескладана.

— Я так і сказала: падманшчыкі.

— А яны пакрыўдзіліся?

— Азьліліся. Я залезла на вярбу і з дрэва крыкнула ашуканцам: «Вы хлусы». Яны пачалі трэсьці вярбу, я звалілася й зламала дзьве рукі. Я займалася акрабатыкай, таму пасьпела згрупавацца й прызямліцца на чатыры кропкі, як котка. Каб не асфальт, абыйшлося б.

— А чым скончылася?

— Над букіністычнай крамай жыве мая бабуля, яна хірург, займаецца пераломамі. Мне наклалі гіпс. Замест рук былі белыя заечыя лапкі.

— А што зрабілі з братамі?

— Нічога. Я не сказала, хто разгойдваў вярбу.

— У цябе няма злосьці?

— Няма. На неразумных, як на жывёлаў, нельга крыўдзіцца. Калі Вы нешта зламаеце, нагу ці руку, абавязкова прыходзьце да маёй бабулі.

— А калі б ты забілася?

— Сьмерць нічога не зьмяняе. Вось зараз браты выйдуць з пад'езду і пойдуць да гушкалкі. Малодшы залезе на седала, а старэйшы пачне яго разгойдваць да самага неба. Я падыйду да іх і скажу: «Пагайдайце мяне». «Калі ласка», адкажа старэйшы і падштурхне мяне да арэляў. Жалезная труба разаб'е маю галаву. Такое здараецца ў любым горадзе раз ці два на год. Можаце спытаць у моргу. Распаўсюджаны трагічны выпадак.

Ганіцелька не пасьпела дагаварыць, як у двары зьявіліся хлопчыкі, старэйшы і малодшы. Яны падбеглі да арэляў. Двор запоўніла жалезнае рыпеньне і воклічы ўцекача: «Вышэй. Вышэй! Вышэй!!!»

«У душы няма смутку», — падумаў мужчына, назіраючы, як у вакне букініста пакупнікі гартаюць кнігі.

— Пайду...

— Не смуткуйце...

Мужчына накіраваўся да аркі. Ганіцелька пабегла да арэляў.

На праспэкце мужчыну дагнаў двухгалосы хлапечы крык, і знайшоўся новы супакаяльны сказ: «Душа пустая».

10.11.1996



МАСТАЦТВА?*

аўтаматычна трансфармаваць чалавецтва ў... ну, скажам, у чалавецтва, тады дайце такому чалавеку пачытаць загалоўкі ранішніх газэтаў. Але ж, скажаце вы, калі нашая дзівосная эпоха — гэта не Залаты Век гуманных дачыненьняў братоў і сёстраў, то як жа ёй быць яшчэ і Залатым Векам мастацтва? Многія літаратары ўзяліся паразважаць (якраз іхныя разважаньні, уключаючы меркаваньні майго сябра Свэна Біркерца, вы знойдзеце на старонках нашай віртуальнай дыскусіі (будуць зьмешчаныя ў наступных нумарах «НН» — **У.Б.**)) пра тое, ці трансфармуе сучасная тэхналёгія чалавечую мэнтальнасьць. А калі трансфармуе, то ці не прывядзе гэта да непазьбежных зьменаў у характары літаратурнага і мастацкага досьведу і практыкі, што ў выніку зробіць «традыцыйныя» мэтады і формы безнадзейна састарэлымі?

На такое глябальнае пытаньне ў мяне няма гатовага адказу. Усё занадта сур'ёзна. Я чакаю і назіраю. Але пры гэтым я мяркую, што ўсяму віною незакілзаны матэрыялізм. А паколькі сапраўднае мастацтва заўсёды ёсьць пераходнікам ад фізычнага да мэтафізычнага, яно заўсёды выступае адлюстраваньнем нематэрыяльных вымярэньняў жыцьця — нашых «каштоўнасьцяў». Таго, што мы самагубча ігнаруем. Падобна, што ўвогуле ўся сучасная чалавечая культура пачувае сябе някепска, ігнаруючы тое. Тут, у лічбавым сьвеце інтэрнэтаўскай кібэрпрасторы, дзе, як лічаць некаторыя, у нас найменей шанцаў яго сустрэць, мы шукаем мастацтва ці, можа, магчымасьць праявы мастацтва, магчымасьць давесьці існаваньне лічбавага мастацтва насуперак усім «не» скептыкаў.

Мой сябар паэт шмат кпіў з Залатога Веку, я таксама часам іранізую наконт Залатога Веку. Я люблю казаць, што гэта быў сапраўды шчасьлівы дзень, калі Боб Дылан узяў у рукі электрагітару. Я маю на ўвазе тое, што ў Боба Дылана хапіла розуму пакарыстацца электронікай насуперак скавытаньню і шкадаваньню ягоных «традыцыйных» фанатаў і, без сумневу, ягоных імпрэсарыё. У выніку такога пераходу зьявілася музыка «кантры» надзвычайнай навацыі — электрычная музыка, якая нічым не саступае, а то й пераўзыходзіць традыцыйную акустычную. Тое ж самае я адчуваю і ў адносінах да Майлза Дэвіса. Ці аказаліся «электрычныя» кампазыцыі Дылана і Дэвіса такімі ж удалымі, як і іхныя найлепшыя акустычныя кампазыцыі? Ці аднолькава яны і састарэлі? Як я ўжо сказаў вышэй, гэта неістотна. Гаворка не пра гэта. Сапраўдны мастак не ляжыць у «традыцыі», нібыта ў труне. Калі б сёньня жылі Бах і Чарлі Паркер, Шэкспір і Джэймс Джойс, яны ствралі б ня так, як яны рабілі гэта ў свой час. Але яны б пісалі свае творы.

Мой сябар паэт, напэўна, сказаў бы, што сёньня не магло б быць ані Баха, ані Шэкспіра, ані Чарлі Паркера. А я кажу, што Джэймс Джойс, для прыкладу, знайшоў, як выканаць «электрычнае сола» без электрагітары Fender ці мультымэдыйнага кампутара.

Апошняя заўвага: калі мы разважаем пра «лічбавую культуру», то ня маем на ўвазе антрапалягічных дасьледаваньняў кампутарнай прамысловасьці ці паводзінаў спажыўцоў, ці любоўных раманаў праз электронную пошту. Хаця й немагчыма было б цалкам аддзяліць «культуру» (мастацтва і літары) у лічбавых сродках перадачы ад «культуры» тых, што працуюць з такімі лічбавымі сродкамі перадачы. Іх узаемаўплыў, іх узаемапранікненьне непазьбежна стануць часткай нечага аднаго, пра што мы і спрабуем тут разважаць. Усё, на шчасьце, на прыемнасьць і без усялякіх прабачэньняў, зводзіцца да аднаго — да мастацтва.

The Atlantic Monthly (Internet)
Падрыхтаваў Уладзімер Барановіч


*Гэты матэрыял працягвае віртуальную Інтэрнэтаўскую дыскусію аб праблемах прыгожага мастацтва ў кампутарную эпоху.

Сьмерць піянэра



Дзе я цябе бачыў? А. Клінаў са сваім творам

Дзякуючы Клінаву, сьмерць знаходзіць піянэра дастаткова рэгулярна, гэта ўжо трэці выпадак. Летась, 25 лістапада, акурат да выбараў у Вярхоўны Савет, «Сьмерць піянэра» горача вітала менская публіка. Хто ня памятае, нагадаю — акцыя ўяўляла сабою ня тое што пародыю, але перафраз акцыі выбараў. Тады гледачам прапанавалася заходзіць у кабіны, і праз дзірку ў валасатай задняй сьценцы пазіраць на карціны кшталту «Аннаў Карэніных», «Сьмерці Марата», «Сьмерці піянэра»... Уся канцэпцыя выставы мусіла б выглядаць як апафэоз прымітывізму. Неўміручыя кампазыцыі Русо, Пірасманішвілі ды Малевіча, скапіяваныя Клінавым, сталі традыцыйнымі фатаграфічнымі дэкарацыямі, ў якія можна было прасунуць галаву і таксама крыху «абесьсьмяроціцца»... А ўсё савецка-піянэрскае канала на вачах.



«Чырвоны каптурок»

Сёлета акцыя была прымеркаваная да рэфэрэндуму. Гэтым разам піянэр нарэшце памёр і яму на выбар былі прапанаваныя катафалкі — падзабытая частка пахавальнага рытуалу. Такім чынам, Артур Клінаў нагадаў пра старасьвецкія беларускія традыцыі. Нават апошні піянэр мусіць адыходзіць з гэтага сьвету годна...




«Queen»

Раскрыцьцё тэмы суправаджалася алюзіямі на закусваньне і выпіваньне, як лейтматывы айчыннага пахавальнага працэсу. У якасьці таго, што магло б быць ежаю, аўтар прапанаваў «Argentina С/М». Гэтым пазначаецца сьвежамарожаная рыба, якая сапраўды завешча аргентынаю і патрапіла на беларускія сталы разам зь «перестройкой». Яна сапраўды дрэйфавала ў акварыюмах, над якімі луналі днушкі, як запрашэньне, праўда, без нажоў.

Жыцьцесьцьвярджальная кампазыцыя — катафалк «Кубак гарбаты а палове на шостую» — выкананы з «каштоўных пародаў дрэва з выкарыстаньнем газэтных выданьняў «Вечерний Минск», «Трактор» ды інш.». Пасярэдзіне кампазыцыі — зручная палічка з гарбатным сэрвізам... з газэтных выданьняў. Усю канструкцыю завяршае цынкавае вядро, у якім буяе радаснае зяленіва, ад яго спадае балдахін... з газэтных выданьняў. Аўтар задумаў гэтую кампазыцыю, спадзеючыся на тое, што мы прымем яго ў падарунак да свайго юбілею. Аднак маштабы твора не дазваляюць. Мы выбралі больш кампактную рэч — катафалк «Эратычны», які складаецца з двух чамаданаў, утвараючы парную кампазыцыю. Яна багата аздобленая фалічнымі сымбалямі — лямпачкі, вазонікі, кранікі. Тэмаю эратызму прасякнуты і наступны катафалк «Вадаправодная мадонна». Як кажа сам Клінаў, задума інсталяцыі высьпела дзякуючы ашаламляльнаму посьпеху «Славянскіх мадонаў» Кузьміча. Праўда, на такі ж вялікі посьпех Клінаў не разьлічвае. Гэты катафалк дастаткова камфортны, абсталяваны апроч вадаправоду і тэлефонам. Можна зьняць слухаўку і... пачуць патэфонную музыку. Адтуль! Асаблівай папулярнасьцю, на думку аўтара, мусіць карыстацца катафалк «Крыжачок». Ягонымі адметнымі якасьцямі можна было б назваць найперш прастату ў выкананьні — з традыцыйных матэрыялаў (мясцовыя пароды дрэва, амэрыканская салома зь вёскі Амэрыка, што ў Круглянскім раёне, крыху сена), а па-другое — даступны кошт — 65 USD. Самы дарагі экспанат — катафалк «Імпэрыял», прызначаны, сама меней, для лепшых людзей рэспублікі. Ягоны кошт складае 3.000.000 USD. Для гэтай інсталяцыі выкарастаныя ўжо ня толькі каштоўныя пароды дрэва, дарагі крап, але і сапраўдныя расейскія самавары работы тульскіх майстроў мінулага стагодзьдзя, як сымбаль усяго лепшага, што мацуе сувязі паміж несумненна брацкімі народамі. Куды больш дэмакратычным падаецца катафалк «Фруктовый», які, нягледзячы на заўважнае збуцьвеньне, радуе вока асабліва шырока ўжытым радысам «Жучок». Гэта напамін пра ўсепрастальнасьць, жвавасьць, пэрспэктыўнасьць на бедных глебах. Кампазыцыя збольшага выкананая з тутэйшых матэрыялаў, за выключэньнем залацістае дыні з поўдня СНГ, якая завяршае вэртыкаль кампазыцыі, пры тым істотна павялічваючы кошт мадэлі. Надзвычай элегантцкі катафалк «Queen» вызначаецца ня толькі яснасьцю прапорцыяў, але і падкрэсьленай шляхотнасьцю, якую прадвызначае шахматны столік зь белай ядвабнай падушачкай. Асабліва трэба адзначыць, што гэтая мадэль забясьпечаная ня толькі шахматным наборам, але і аўдыёапаратураю, вэнтыляцыяй і сьвятлом.

Хоць па камфортнасьці нават яна саступае мадэлі «Амэрыканская мара», якая забясьпечаная максымумам «наваротаў»: ад панэлі кіраваньня з усімі сьпідомэтрамі да каналізацыі. У той жа час вобразна мадэль вяртае нас у «піянэрскія» часы 60-х, дзякуючы чысьціні плястыкі, якая міжволі нагадвае палотны Мандрыяна, галяндзкія грошы і першыя плястыкавыя плашчы.



«Imperial»

Аднак самым папулярным стаў «Чырвоны каптурок», больш адпаведны густам тых, каму ён па кішэні. Гэты катафалк апроч сантэхнікі абсталяваны і прыстойным ложкам і разнастайнай гастранаміяй. Ягоная прыцягальнасьць была настолькі канкрэтнай, што за часы выставы ён шматкроць быў скарыстаны і як ложак, і як буфэт.

Хоць у гэтым не было такой пільнай патрэбы, бо літаральна побач стаіць кінэтычна-музычны сапраўдны буфэт, у якім можна атаварыць піянэрскія білеты. У залежнасьці ад кошту білета можна было атрымаць на выбар адзін з набораў — «Вокісь хрому», «Дары нябёсаў» альбо «Незабудку». А з буфэтных дынамікаў льецца і льецца патэфонны Вярцінскі, Казлоўскі... У больш раньні час гучаць раньнія лірычныя Магамаеў, Лешчанка, і яшчэ шмат такога, што ўжо мала хто і ўспомніць... Піянэры памерлі. Да гэтых матываў ня вернецца ўжо больш і Клінаў. Акцыі збору сродкаў на дапамогу плітвязьням у Беларусі падаюцца аўтару больш пэрспэктыўнымі...

Сяргей Харэўскі

Новы конкурс

Краіна замкаў



Нашыя замкі невыпадкова паўсталі ланцугом пасярэдзіне краю. Яны ня толькі баранілі ад навалаў звонку, але й былі гарантам спакою ўнутры гаспадарства. Нават пад час княскіх міжусобіцаў замкі штурмавалі толькі чужынцы. Бо замкі былі ўласнасьцю гаспадарства. У замках падпісвалі дамовы, склікалі рады і складалі уніі, там прымалі пасloў і адтуль выпраўлялі ганцоў. Замкі вялікіх князёў давалі людзям упэўненасьць, што іхняя дзяржава, узьніклая не на касьцях рабоў, не за нарабаванае дабро і ня коштам крыві паняволеных народаў, — невынішчальная. Будуючы замкі, Вялікія князі выйгралі гістарычны двубой, засьведчылі жыцьцяздольнасьць свайго маладога гаспадарства, яшчэ паўпаганскага, паўхрысьціянскага, якому быў наканаваны вялікі і драматычны лёс. На здымку — адзін з самых легендарных замкаў нашае зямлі. Дзе ён знаходзіцца? Хто запачаткаваў яго будоўлю? Зь якімі падзеямі ён быў зьвязаны?

Сяргей Харэўскі

Пошта

Зьдзек над храмам

Вэрсію пра сатаністаў можна адкінуць адразу. У месцах, дзе рабілі сьвятатацтвы, яны пакідалі свае адзнакі. Тут нічога падобнага няма. Адзіны напаўзацёрты надпіс, прыведзены ў прэсе, зроблены некалькі гадоў таму сіняй фарбай (падобнай пафарбаваны цокаль і вокны будынка) і відавочна ня мае дачыненьня да сёньняшняга выпадку. Вэрсію пра «сатаністаў» надыктаваў няўважліваму журналісту, хутчэй за ўсё, мясцовы сьвятар, не зацікаўлены у адкрыцьці праўды.

Паводле папярэдняй вэрсіі міліцыі «пожар был вызван самовозгоранием... милиция обвинила настоятеля храма — отца Николая — в халатности и нарушении правил пожарной безопасности». («Столичные новости» №10 за 31.X.96 г.)

На другім ярусе вежы, зачыненым, дарэчы, для наведваньня экскурсантаў, апошнім часам быў абсталяваны маленькі сьвячны заводзік. Гэта пацьвярджаецца рэшткамі абсталяваньня, бабінамі з кнотавай ніткай, паўабпаленымі вялікімі скрынямі з гатовай прадукцыяй, абвугленымі кавалкамі драўлянай падлогі, залітай воскам, знойдзенымі на месцы праз некалькі дзён пасьля здарэньня.

На гэты ярус вежы для вытворчага працэсу былі падведзеныя трубы, якіх не было пад час існаваньня ў храме музэя. Пажар пачаўся менавіта адсюль, з другога ярусу вежы. Гэта пацьвярджае яшчэ й найбольшая абпаленасьць і закуранасьць гэтага і вышэйшага ярусаў. Менавіта адсюль і прайшоў шлях агню праз праём у шчыце асноўнага аб'ёму ў паддашак, а потым ніжэй, у праём, які вядзе ў храм.

Такім чынам, выгарэў увесь дах асноўнага аб'ёму і ўся вежа ўнутры, а ўсярэдзіне храма прагарэлі толькі месцы праходу зь вежы. Іканастас застаўся зусім непашкоджаным.

Якой бы ні была прычына — халатнасьць, тэхнічная няспраўнасьць абсталяваньня, зьбег акалічнасьцяў, — усё гэта ня можа апраўдаць і патлумачыць, як магла прыйсьці ў галовы нармальных людзей ідэя пачаць вытворчасьць, тым больш пажаранебясьпечную, ва ўнікальным помніку архітэктуры і культуры XVI ст., які мае нацыянальнае значэньне.

Заслаўскі Рэфармацкі кальвінскі збор пабудаваны ў двары Заслаўскага замка ў 1557 г. Гэта быў час Рэфармацыі. Рэфармацкая дзейнасьць Марціна Лютэра і Жана Кальвіна адразу атрымала шырокую падтрымку ў Вялікім Княстве Літоўскім сярод нашых продкаў. Таму апекуны рэфармацыі ў ВКЛ — браты Радзівілы, Астафей Валовіч і іншыя магнаты фундуюць шматлікія зборы і друкарні, дзе выдаецца разнастайная тэалягічная літаратура, у першую чаргу Біблія, яе пераклады і катэхізмы.

Такім шчырым мэцанатам і фундатарам быў уладальнік Заслаўя Ян Глябовіч. Ён заснаваў на месцы старажытнага заслаўскага гарадзішча магутны замак і кальвінскі збор.

Фартэцыя была пабудаваная ў стараітальянскай сыстэме і лічыцца адным зь першых бастыённых замкаў у Беларусі.



Заслаўскі збор 28 лістапада 1996 г.

Чатыры магутныя кутнія бастыёны былі абмураваныя каменем. Валы ўзвышаліся на 10 мэтраў. Вакол іх праходзіў глыбокі роў з вадою. Да магутнай замкавай брамы, рэшткі якой існуюць і сёньня, падходзіў разборны драўляны мост з пад'ёмнай часткай ля варотаў. У вале праходзіў падземны ход.

У канцы XVI ст. з прыроднага каменю і цэглы зробленыя запруды на рэчках Сьвіслачы, Князіньцы і Чарніцы. Такім чынам, вакол утварыліся сажалкі, а замак набыў цалкам астраўное становішча. Гэтыя ўмацаваньні не дазвалялі ворагу падыйсьці да замку на гарматны стрэл.

Вежа збора была ня толькі выдатнай назіральнай пляцоўкай, але і мела традыцыйную для беларускага замкавага дойлідства характэрную форму і структуру. Увогуле ж асноўны аб'ём храма — гэта простакутнае збудаваньне. Памяшканьне зальнага характару — менавіта збор для людзей. Тут няма алтарнай апсыды, бо ў рэфармацкім храме не патрэбна месца для алтара, іканастаса. Галоўнае тут — Слова Божае.



Струмяні воску на лесьвіцы ў вежы.



Агрэгат для вырабу сьвечаў на панадворку царквы.

Менавіта дзеля пашырэньня хрысьціянскае веры, асьветы Ян Глябовіч, заснавальнік замка, запрашае да сябе выдатнага дзеяча беларускай рэфармацыі, асьветніка і гуманіста, перакладчыка і прапаведніка Сымона Буднага, які прыяжджае сюды каля 1570 г. Тут асьветнік заканчвае пераклад Старога Тэстамэнту, піша вядомую «Прамову да чытача». У сярэдзіне 1572 г. уся Біблія была надрукавана. Відавочна, што С.Будны шматкроць рабіў казаньні ў гэтым зборы.

Ян Глябовіч разумеў значнасьць і патрэбу для нашчадкаў гэтай духоўнай цьвердзі. У сваім запавеце ён забараніў гэты рэфармацкі збор перадаваць якой-небудзь іншай канфэсіі: «Калі хто з нашчадкаў маіх, забыўшыся страху Божага, і гэтай веры праўдзівай, раз спазнанай, у якой з дапамогай Бога праз мяне выхаваныя былі, захацеў бы гэты збор Эвангелічны заслаўскі... да веры і вызнаньня папескага, новахрышчэнскага, або якога інакшага чацярнуць, адступіўшы да якой сэкты, або царквы аблуднай, інакшай ад нашай канфэсіі, Эвангелічнай Рэфармацыйнай, для якой я гэты збор фундаваў, тады гэты нашчадак траціць валоданьне і права пераемнасьці на гэты збор і фундацыю яго» (Вільня, 28 ліпеня 1590 г.).

Але ж воля заснавальніка не была выкананая. У 1628 г. збор прыстасаваны пад касьцёл Архангела Міхаіла, у 1676 г. пры ім заснаваны дамініканскі кляштар, а пад час панаваньня Расейскай імпэрыі аддадзены праваслаўнай царкве. І далі наймення не кальвінскаму збору — Спаса-Праабражэнская царква, якую бальшавікі, у сваю чаргу, наогул зачынілі. І толькі дзякуючы таму, што ў 1967 г. быў заснаваны Заслаўскі гісторыка-культурны запаведнік і будынак збора быў прыстасаваны пад музэй, а ў 1968-72 г. была праведзена навуковая рэстаўрацыя, збор захаваўся. У пачатку 90-х яго перадалі праваслаўнаму прыходу.

Аляксей Фралоў, Аляксандр Шыбко, Ніна Фалькоўская

P.S. Аўтары допісу прапанавалі нам уласную вэрсію здарэньня —дастаткова пераканаўчую і спраўджаную імі візуальна на месцы. Асабліва нечаканая тут інфармацыя пра захаванасьць інтэр'еру царквы і царкоўнага ўбраньня. Гэта азначае, што большасьць публікацыяў у айчынных выданьнях была вынікам вуснае няспраўджанае інфармацыі. Паколькі сьледзтва за два месяцы так і не натрапіла на сьлед сатаністаў, кропкі ў гэтай гісторыі ставіць сапраўды рана...

С.Х.

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19⁰⁰, 1/12/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7565 Кошт свабодны.